С. Я. Кечык, В. І. Рагаўцоў

# Моўны разбор у ВНУ і ў школе

Схемы, узоры, заданні

81.411.3я73
К37
ЧБел

С. Я. КЕЧЫК В. І. РАГАЎЦОЎ

# Моўны разбор у ВНУ і ў школе

## Схемы, узоры, заданні

Дапушчана Міністэрствам асветы БССР
у якасці вучэбнага дапаможніка
для студэнтаў спецыяльнасці
«Беларуская мова і літаратура»
педагагічных інстытутаў

000009 172487

БІБЛІЯТЭКА Мазырскага педінстытута ім. А. А.

МІНСК
«ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА»
1988

ББК 81.2Бел-923
К 37

Рэцэнзенты

Кафедра беларускай мовы Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна;
канд. пед. навук *М. І. Касцян.*

В сравнительном плане даются схемы и образцы основных видов языкового разбора в вузах и школе, а также упражнения для самостоятельного анализа материала, что позволит успешно пользоваться пособием и учителям средних школ.

**Кечык С. Я., Рагаўцоў В. І.**

К 37 Моўны разбор у ВНУ і ў школе: Схемы, узоры, заданні: Вучэб. дапаможнік для пед. ін-таў.— Мн.: Выш. шк., 1988.— 127 с.
ISBN 5-339-00057-5

У параўнальным плане падаюцца схемы і ўзоры асноўных відаў моўнага разбору ў ВНУ і школе, а таксама практыкаванні для самастойнага аналізу матэрыялу, што дазволіць паспяхова карыстацца дапаможнікам і настаўнікам сярэдніх школ.

$К\frac{4602010000-126}{М\ 304(03)-88}63-88$ ББК 81.2Бел-923

ISBN 5-339-00057-5

© Выдавецтва «Вышэйшая школа», 1988

## ПРАДМОВА

У рашэннях XXVII з'езда КПСС, пастановах ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР пра народную асвету перад вышэйшай школай ставіцца задача забяспечыць падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў. Студэнты філалагічных факультэтаў педінстытутаў, будучыя настаўнікі мовы і літаратуры, павінны набыць у ВНУ не толькі глыбокія тэарэтычныя веды па мове, але і трывалыя практычныя навыкі аналізу моўных фактаў. Дзейсным і эфектыўным сродкам замацавання тэарэтычных ведаў, практычных навыкаў і ўменняў з'яўляецца моўны разбор.

У дапаможніку разглядаюцца віды разбору, звязаныя з раздзеламі мовазнаўства, вывучэнне якіх прадугледжваецца праграмай па сучаснай беларускай літаратурнай мове для педінстытутаў (фанетычны разбор, ґрафічны, арфаграфічны, лексічны, разбор фразеалагізмаў, марфемны, словаўтваральны, марфалагічны, сінтаксічны, пунктуацыйны)[1]. Некаторыя з гэтых відаў разбору практыкуюцца ў школе (фанетычны, марфемны, сінтаксічны), асобныя з іх могуць быць выкарыстаны на ўроках мовы ў межах патрабаванняў школьнай праграмы (лексічны, фразеалагічны, арфаграфічны, словаўтваральны).

Разбор адной і той жа моўнай адзінкі ў дапаможніку даецца ў параўнальна-супастаўляльным плане, па схемах для ВНУ і для школы. Гэта дасць магчымасць студэнтам выявіць агульнае і рознае паміж разборам у ВНУ і школе, навучыць іх выкарыстоўваць у школьнай практыцы тэарэтычныя веды, атрыманыя ў інстытуце, і, апрача таго, дапаможа авалодаць уменнем параўноўваць і аналізаваць моўныя факты.

Паводле аб'ёму моўны разбор бывае поўны і частковы[2]. Пры поўным разборы адзначаюцца ўсе прадугле-

[1] Выдзеленыя віды разбору мэтазгодна аб'яднаць пад агульнай назвай «моўны разбор». Тэрмін «граматычны разбор», які трывала замацаваўся ў метадычнай літаратуры, з навуковага пункту погляду варта выкарыстоўваць у адносінах толькі марфалагічнага і сінтаксічнага разбору. У школьнай практыцы з метадычных (вучэбных) меркаванняў да граматычнага разбору традыцыйна адносяць таксама фанетычны разбор і разбор слова па складу.

[2] У дапаможніку даюцца схемы і ўзоры поўнага разбору.

джаныя вучэбнай праграмай прыметы моўнай адзінкі (гука, марфемы, слова, фразеалагізма, словазлучэння, сказа), пры частковым — толькі некаторыя з іх (напрыклад, склон назоўнікаў, часы дзеясловаў, тып словазлучэнняў па структуры і г. д.). Частковы разбор папярэднічае поўнаму і выкарыстоўваецца з мэтай замацаваць пройдзены па тэме матэрыял. Поўны разбор праводзіцца пасля вывучэння тэм усяго раздзела для замацавання ведаў і практычных навыкаў ці пры паўтарэнні матэрыялу і праверцы ведаў.

Усе віды моўнага разбору выдзелены ў асобныя раздзелы, кожны з якіх уключае: кароткія метадычныя рэкамендацыі, пытанні, схему і ўзор разбору, практычнае заданне.

У метадычных рэкамендацыях раскрываецца сутнасць і змест разбору, даюцца парады па методыцы яго правядзення.

Прапанаваныя пытанні не прадугледжваюць кантролю ўсяго тэарэтычнага матэрыялу; іх прызначэнне — звярнуць увагу студэнтаў на тыя моўныя з'явы, без уліку якіх пры разборы могуць быць дапушчаны памылкі.

Мэта практычных заданняў — замацаваць тэарэтычныя веды студэнтаў і ўдасканаліць навыкі розных відаў разбору.

У канцы дапаможніка даецца спіс літаратуры, якая можа быць выкарыстана пры вывучэнні той або іншай тэмы ці раздзела.

Раздзелы «Фанетычны разбор», «Графічны разбор», «Арфаграфічны разбор», «Лексічны разбор», «Разбор фразеалагізмаў», «Марфемны разбор», «Словаўтваральны разбор», «Марфалагічны разбор» нанісаны В. І. Рагаўцовым, «Сінтаксічны разбор» і «Пунктуацыйны разбор» — С. Я. Кечык.

Выказваем шчырую падзяку афіцыйным рэцэнзентам — членам кафедры беларускай мовы Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна і яе загадчыку кандыдату філалагічных навук дацэнту Г. М. Малажай, кандыдату педагагічных навук дацэнту Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага М. І. Касцяну за каштоўныя парады і заўвагі, накіраваныя на паляпшэнне гэтага дапаможніка.

*Аўтары*

## ФАНЕТЫЧНЫ РАЗБОР

Мэта фанетычнага разбору — устанавіць колькасць складоў, гукаў і літар у слове, вызначыць націскны склад, назваць гукі і літары, ахарактарызаваць кожны гук.

Фанетычны разбор у ВНУ патрабуе ад студэнтаў як практычнай, так і належнай тэарэтычнай падрыхтаванасці (напрыклад, ведання тэорый склада і заканамернасцей складападзелу, навуковай класіфікацыі гукаў мовы). Фанетычны разбор у школе грунтуецца на пэўных тэарэтычных ведах і (у большай ступені) практычных навыках вучняў. Так, вучні павінны ўмець вызначаць колькасць складоў у слове, выдзяляць гукі і адрозніваць іх ад літар, растлумачыць асаблівасці ўтварэння галосных і зычных гукаў, валодаць найважнейшымі нормамі літаратурнага вымаўлення.

Пры фанетычным разборы неабходна кіравацца метадычным патрабаваннем: праводзіць аналіз «ад гука да літары», г. зн. спачатку выдзеліць гукі ў слове, ахарактарызаваць іх, а потым назваць літары, з дапамогай якіх яны абазначаны.

Фанетычны разбор бывае поўны, які прадугледжвае ўсебаковы аналіз гукавога і літарнага складу слова, і частковы, які прадугледжвае выбарачную характарыстыку гукаў (напрыклад, пачатковых або канцавых, галосных або зычных), падзел слова на склады і інш.

### Пытанні

1. Як адбываецца падзел слоў на склады са спалучэннем зычных паміж галоснымі?
2. Якія разыходжанні выяўляюцца паміж гучаннем слова (гукамі) і яго напісаннем (літарамі) у беларускай мове?
3. Якія фанетычныя змены гукаў неабходна ўлічваць пры вызначэнні гукавога складу слова?

## Парадак разбору

| *У ВНУ* | *У школе* |
| --- | --- |
| 1. Запіс слова з дапамогай фанетычнай транскрыпцыі. | 1. Арфаграфічнае напісанне слова. |
| 2. Падзел на склады, колькасць і тыпы складоў (прыкрыты ці непрыкрыты, адкрыты ці закрыты), націскны склад. | 2. Колькасць складоў, месца націску (націскны склад). |
| 3. Тып націску (рухомы ці нерухомы). | 3. — |
| 4. Характарыстыка гукаў: 1) галосных: а) паводле ўдзелу губ, месца пад'ёму языка, ступені пад'ёму языка; б) з улікам спосабу графічнага абазначэння; 2) зычных; а) паводле ўдзелу голасу і шуму, спосабу ўтварэння, месца ўтварэння, цвёрдасці-мяккасці, працягласці (калі падоўжаны гук, адзначыць гэта); б) з улікам спосабу графічнага абазначэння. | 4. Характарыстыка гукаў: галосны (якой літарай абазначаны) або зычны (звонкі ці глухі, цвёрды, зацвярдзелы ці мяккі, свісцячы ці шыпячы; якой літарай абазначаны). |
| 5. Колькасць гукаў і літар. | 5. Колькасць гукаў і літар. |

## Узоры

*I. Векавыя дубы стаяць паважныя, спакойныя ў сваёй велічы. (Шам.)*

| | |
| --- | --- |
| 1. [стаjáц']. | 1. *Стаяць.* |
| 2. У слове два склады: [ста] — прыкрыты, адкрыты, [jац'] — прыкрыты, закрыты, націскны. | 2. У слове два склады; націск падае на другі склад *(стая́ць)*. |
| 3. Мае рухомы націск (параўн: *стаíце* і *сто́йце*). | 3. — |

4. [с] — зычны, шумны, глухі, шчылінны, свісцячы, пярэднеязычны, зубны, цвёрды; абазначаны літарай *с* (эс).

[т] — зычны, шумны, глухі, змычны, пярэднеязычны, зубны, цвёрды; абазначаны літарай *т* (тэ).

[а] — галосны, нелабіялізаваны, сярэдняга рада, ніжняга пад'ёму, абазначаны літарай *а* (а).

[j] — зычны, санорны, шчылінны, сярэднеязычны, мяккі (не мае адпаведнага цвёрдага); абазначаны разам з наступным [а] літарай *я* (я).

[а] — галосны, нелабіялізаваны, сярэдняга рада, ніжняга пад'ёму; абазначаны разам з папярэднім [j] літарай *я* (я).

[ц'] — зычны, шумны, глухі змычна-шчылінны, свісцячы, пярэднеязычны, зубны, мяккі; абазначаны спалучэннем літар *ц* (цэ) і *ь* (мяккі знак).

5. У слове 6 гукаў і 6 літар.

4. **с** — зычны, глухі, цвёрды, свісцячы; абазначаны літарай *с* (эс).

**т** — зычны, глухі, цвёрды; абазначаны літарай *т* (тэ).

**а** — галосны; абазначаны літарай *а* (а).

**й** — зычны, звонкі, мяккі; абазначаны разам з наступным гукам *а* літарай *я* (я).

**а** — галосны; абазначаны разам з папярэднім гукам **й** літарай *я* (я).

**ц'** — зычны, глухі, мяккі; абазначаны спалучэннем літар *ц* (цэ) і *ь* (мяккі знак).

5. У слове 6 гукаў і 6 літар.

II. *А на дварэ ўжо вечарэе, і ночка блізка, змрок гусцее. (К-с)*

1. [бл'іска].

2. У слове два склады: [бл'і] — прыкрыты, адкрыты, націскны, [ска] — прыкрыты, адкрыты.

3. Мае рухомы націск (параўн.: *блізка* і *бліжэй*).

1. *Блізка.*

2. У слове два склады; націск падае на першы склад *(блізка)*.

3. —

4. [б] — зычны, шумны, звонкі, змычны, губна-губны, цвёрды; абазначаны літарай *б* (бэ).

[л'] — зычны, санорны, змычна-праходны, пярэднеязычны, зубны, мяккі; абазначаны літарай *л* (эл).

[і] — галосны, нелабіялізаваны, пярэдняга рада, верхняга пад'ёму; абазначаны літарай *і* (і).

[с] — зычны, шумны, глухі, шчылінны, свісцячы, пярэднеязычны, зубны, цвёрды; абазначаны літарай *з* (зэ).

[к] — зычны, шумны, глухі, змычны, заднеязычны, цвёрды; абазначаны літарай *к* (ка).

[а] — галосны, нелабіялізаваны, сярэдняга рада, ніжняга пад'ёму; абазначаны літарай *а* (а).

5. У слове 5 гукаў і 5 літар.

4. **б** — зычны, звонкі, цвёрды; абазначаны літарай *б* (бэ).

**л'** — зычны, звонкі, мяккі; абазначаны літарай *л* (эл).

**і** — галосны; абазначаны літарай *і* (і).

**с** — зычны, глухі, цвёрды, свісцячы; абазначаны літарай *з* (зэ).

**к** — зычны, глухі, цвёрды; абазначаны літарай *к* (ка).

**а** — галосны; абазначаны літарай *а* (а).

5. У слове 5 гукаў і 5 літар.

### Практыкаванне 1

Зрабіце фанетычны разбор выдзеленых слоў.

1. Сонца асвятліла верхавіны стромкіх ёлак, і на іх тысячамі вясёлак загарэліся *дажджынкі*. *(Грах.)* 2. Адтуль, з захаду, дзьмуў свежы адліжны вецер з *ледзь* улоўным пахам вільгаці. *(Асіп.)* 3. *Цяжкавата* было падаваць на развітанне руку і сказаць нейкае пажаданне. *(Янк.)* 4. Неўзабаве ўбачыў *бацькоўскую сядзібу*, і сэрца маё моцна забілася. *(А. М.)* 5. Дрэвы — да сонца, людзі — да волі цягнуцца праз *стагоддзі*. *(Р. Б.)* 6. Я палюбіў і ціхую раку, і лазнякі над *ёю*, і *пясчаныя* пагоркі, на якіх аж да самай восені хвалюецца пад ветрам жыта. *(Чыгр.)* 7. *Зімою* трашчыць уночы на рэках *лёд*... *(Стр.)* 8. За агародамі на *нізкай* паплавіне звінела дажджавая

ручаіна. *(К. Ч.)* 9. Метраў за трыста ад берага хлопцы *адчулі* пад нагамі зямлю. *(Я. М.)* 10. *Бярозкі* на ўзвале былі *нізенькія*, але шырокія — галіны з гэтым *лісцем* пачыналіся ад самае зямлі. *(А. С.)*

## ГРАФІЧНЫ РАЗБОР

Пры графічным разборы слова ўстанаўліваюцца суадносіны паміж літарамі і гукамі, вызначаецца від літар і прынцып ужывання іх на пісьме. У ВНУ графічны разбор выдзяляецца як самастойны від разбору. У школе вучні знаёмяцца толькі з элементамі графічнага разбору, якія ўключаюцца ў фанетычны разбор: вызначаюць колькасць літар у слове, а таксама называюць літары, з дапамогай якіх абазначаны гукі на пісьме.

У працэсе графічнага разбору неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на неадпаведнасць паміж літарамі і гукамі ў слове і растлумачыць прычыны гэтай неадпаведнасці. Несупадзенне ў словах літар і гукаў сустракаецца даволі часта. Так, адна літара можа абазначаць розныя гукі, спалучэнне дзвюх літар — адзін гук, розныя літары могуць служыць для абазначэння аднаго гука і г. д. Напрыклад, літара *з* у залежнасці ад графічнай пазіцыі ў слове можа абазначаць наступныя гукі: [з] *(зоры)*, [з'] *(зіма)*, [с] *(газ)*, [с'] *(скрозь)*, [ж] *(зжаць)*, [ш] *(без шуму)*.

Графічны разбор — адзін з эфектыўных відаў практыкаванняў, які дазваляе выявіць асаблівасці беларускай графікі і, апрача таго, паказаць яе цесную сувязь з фанетыкай (фаналогіяй) і арфаграфіяй.

### Пытанні

1. Якія асаблівасці суадносін паміж літарамі і гукамі ў беларускай мове?
2. З якім гукавым значэннем ужываюцца літары паводле прынцыпаў графікі?
3. У якіх графічных пазіцыях літары *е, ё, і, ю, я* выступаюць як ётавыя, а ў якіх — як палаталізаваныя?

### Парадак разбору ў ВНУ

1. Назвы літар і абазначаныя імі гукі.
2. Колькасць літар і гукаў, асаблівасці іх суадносін

(акрэсліць — калі ёсць — разыходжанні паміж графічным абазначэннем гука і яго вымаўленнем).

3. Від галосных літар паводле функцыі: ётавыя, палаталізаваныя ці велярызаваныя [1].

4. Літары з асноўным і дадатковым гукавым значэннем.

5. Адназначныя і двухзначныя літары.

6. Прынцып ужывання літар (гукавы ці складовы).

### Узоры

*I. На долю нам выпала шчасце па ленінскіх **сцежках** ісці. (Хвед.)*

1. Літары: *с*(эс), *ц*(цэ), *е*(е), *ж*(жэ), *к*(ка), *а*(а), *х*(ха). Гукі: [с'], [ц'], [э], [ш], [к], [а], [х].

2. Літар 7, гукаў 7. Літара *ж* перад літарай для глухога [к] абазначае гук [ш].

3. Літара *е* палаталізаваная; *а* — велярызаваная.

4. Літары *с, ц, е, к, а, х* з асноўным гукавым значэннем; літара *ж* — з дадатковым.

5. Літара *а* адназначная; літары *с, ц, е, к, х* — двухзначныя.

6. Літара *а* ўжываецца паводле гукавога прынцыпу; *с, ц, е, к, х* — паводле складовага.

*II. **Марозная** ціхая ноч плыве над зямлёю. (Сам.)*

1. Літары: *м*(эм), *а*(а), *р*(эр), *о*(о), *з*(зэ), *н*(эн), *а*(а), *я*(я). Гукі: [м], [а], [р], [о], [з], [н], [а], [j], [а].

2. Літар 8, гукаў 9. Літара *я* пасля галоснай *а* абазначае два гукі: [j] і [а].

3. Літары *а, о* велярызаваныя; *я* — ётавая.

4. Усе літары ўжыты з асноўным гукавым значэннем.

5. Літары *а, р, о* адназначныя; *м, з, н, я* — двухзначныя.

6. Літары *а, р, о* ўжываюцца паводле гукавога прынцыпу; *м, з, н, я* — паводле складовага.

*III. Мы — першыя ў свеце **разведчыкі** будучыні... (М. Т.)*

1. Літары: *р*(эр), *а*(а), *з*(зэ), *в*(вэ), *е*(е), *д*(дэ), *ч*(чэ), *ы*(ы), *к*(ка), *і*(і). Гукі: [р], [а], [з'], [в'], [э], [ч], [ы], [к'], [і].

---

[1] Палаталізаваныя і велярызаваныя галосныя абазначаюць адзін гук і паказваюць на: мяккасць папярэдніх зычных гукаў (палаталізаваныя) ці цвёрдасць (велярызаваныя).

2. Літар 10, гукаў 9. Спалучэнне дзвюх літар *д* і *ч* абазначае гук [ч].

3. Літары *а, ы* велярызаваныя; *е, і* — палаталізаваныя.

4. Усе літары, акрамя *д*, ужыты з асноўным гукавым значэннем; *д* — з дадатковым.

5. Літары *р, а, ы, ч* адназначныя; *з, в, е, к, і* — двухзначныя.

6. Літары *р, а, ч, ы* ўжываюцца паводле гукавога прынцыпу; *з, в, е, к, і* — паводле складовага.

**Практыкаванне 2**

Зрабіце графічны разбор выдзеленых слоў.

1. *Краіна* родная, *Савецкая* краіна, табе я ў песнях сэрца *аддаю.* *(Ал.)* 2. Лета было добрае, пагода спрыяла *ўраджаю* і рабоце. *(К-с)* 3. Раніцай прайшоў спорны *дождж*, дрэвы абапал дарогі яшчэ не *абсохлі.* *(Вад.)* 4. У ціхім *жнівеньскім* лесе збіраем мы апошні падарунак лета — *брусніцы.* *(Янч.)* 5. Гаслі *апошнія* барвы зары, і пад яе ціхае згасанне дзесьці далёка ўзнікала песня. *(Бач.)* 6. *Захад* сонца накладвае пурпуровыя фарбы на край лесу, што *цямнее* на небасхіле. *(Хадк.)* 7. *Ланцужкі* жураўлёў віднеліся ў небе, і адтуль чулася *сумнае* курлыканне. *(Чарн.)* 8. *Дзяўчаты* з усмешкай дарылі букеты. І вось *загарэлася* полымя кветак. *(М. Т.)* 9. Быў позні ранак, але ў лесе яшчэ стаяла *свежасць* — туманы сплылі нядаўна. *(Нях.)* 10. *Поезд* хаваўся то пад кронай *свежай* яркай зелені, то імчаўся паміж вясёлых пералескаў. *(А. В.)*

## АРФАГРАФІЧНЫ РАЗБОР

Пры арфаграфічным разборы даецца тлумачэнне наяўных у слове арфаграм — напісанняў, якія адпавядаюць пэўнаму правілу. Неабходна помніць, што арфаграмы могуць быць толькі ў тых словах, у якіх для перадачы гука ёсць магчымыя графічныя варыянты. Напрыклад, у словах *парта, дом, сын* няма арфаграм. Тут кожнаму гуку адпавядае толькі адна літара, замест яе нельга ўжыць іншыя без змен гучання слова і яго сэнсу. У такіх словах, як *горад, кніжка, Колас*, ёсць арфаграмы *(д, ж, К)*, таму што магчыма featuring розначае графічнае абазначэнне гукаў [т] *(горад, горат)*, [ш] *(кніжка, кнішка)*, [к] *(Колас,*

*колас*). Выбар аднаго з графічных варыянтаў і кваліфікацыя яго як арфаграмы рэгулюецца пэўным правілам. У прыведзеных вышэй словах — правілам напісання звонкіх на канцы слова і перад глухімі, а таксама правілам ужывання вялікай літары.

Школьныя падручнікі па беларускай мове не даюць звестак пра арфаграму і, акрамя таго, не прадугледжваюць схем арфаграфічнага разбору. Аднак выдзяленне ў слове арфаграм і іх вытлумачэнне — патрэбны від работы на ўроках мовы: ён садзейнічае свядомаму засваенню вучнямі правапісных норм, фарміраванню ў іх трывалых арфаграфічных навыкаў.

Арфаграфічны разбор можа быць поўны, пры якім выяўляюцца і характарызуюцца ўсе наяўныя ў слове арфаграмы, і частковы, калі разглядаюцца толькі арфаграмы аднаго тыпу, інакш — на пэўнае правіла. У ВНУ часцей за ўсё выкарыстоўваецца поўны разбор як эфектыўны від практыкаванняў, разлічаных на замацаванне арфаграфічных навыкаў студэнтаў. У школе мэтазгодна практыкаваць частковы разбор, які дазваляе сканцэнтраваць увагу вучняў на характарыстыцы найбольш складаных і цяжкіх для засваення тыпаў арфаграм.

### Пытанні

1. Па якіх прыметах можна выявіць у слове арфаграмы?
2. Ад якіх умоў залежыць выбар арфаграм?

### Парадак разбору

| *У ВНУ* | *У школе* |
|---|---|
| 1. Слова з выдзеленымі арфаграмамі. | 1. Слова з выдзеленымі арфаграмамі. |
| 2. Тып арфаграмы (на якое правіла). | 2. На якое правіла. |
| 3. Правіла напісання арфаграмы. | 3. Правіла напісання арфаграмы. |
| 4. Прынцып напісання арфаграмы (фанетычны, марфалагічны; дыферэнцыяльныя, традыцыйныя напісанні). | 4. — |

## Узоры

*I. У спіс барацьбітоў за мір і я сваё імя паставіць права маю. (А. З.)*

| | |
|---|---|
| 1. *Барацьбітоў.* | 1. *Барацьбітоў.* |
| 2. Арфаграма на правапіс глухіх перад звонкімі. | 2. Арфаграма на правапіс глухіх перад звонкімі. |
| 3. Азванчэнне глухіх перад звонкімі на пісьме не перадаецца. | 3. Глухія перад звонкімі пішуцца нязменна. |
| 4. Арфаграма адпавядае марфалагічнаму прынцыпу напісання. | 4. — |

*II. Здароў, марозны, звонкі вечар! Здароў, скрыпучы, мяккі снег! (Багд.)*

| | |
|---|---|
| 1. *Снег.* | 1. *Снег.* |
| 2. Арфаграма на правапіс звонкіх на канцы слоў. | 2. Арфаграма на правапіс звонкіх на канцы слоў. |
| 3. Аглушэнне звонкіх на канцы слоў на пісьме не перадаецца. | 3. Звонкія на канцы слоў пішуцца нязменна. |
| 4. Арфаграма адпавядае марфалагічнаму прынцыпу напісання. | 4. — |

### Практыкаванне 3

Выдзеліце са сказаў словы з арфаграмамі, зрабіце арфаграфічны разбор гэтых слоў.

1. Набліжалася свята Кастрычніка. Кожны ўспамінаў, як ён летась святкаваў гэты дзень у сябе дома... *(Грах.)* 2. Ішоў дзед Талаш не спяшаючыся, выбіраючы глухія лясныя сцежкі. *(К-с)* 3. Тут пачынаецца раён, які нездарма назвалі Заводскім. *(В. В.)* 4. На паплавах гатова была да касьбы атава. *(К. Ч.)* 5. Няма ягад прыгажэйшых за ажыны! Чырвона-чорныя, з таемным бурштынавым бляскам. *(Янч.)* 6. Цісну ў сухі, скрыпучы марозік, усюды ляжаў глыбокі роўны снег. *(Сач.)* 7. За цёмным акном шастаў вецер, біў у шыбіну галінай грушы. *(І. Н.)* 8. Там і сям на ўскраінах лясоў распускаліся маладыя

лісточкі бярэзінак. *(К-с)* 9. Намалочанае і правеянае збожжа калгаспікі звозілі ў свіран. *(Шам.)* 10. Мы падклалі голля, ярка ўспыхнуў агонь. *(Гур.)*

## ЛЕКСІЧНЫ РАЗБОР СЛОВА

Прызначэнне лексічнага разбору — даць сэнсавую характарыстыку слова, устанавіць яго лексіка-семантычныя сувязі з іншымі словамі, вызначыць паходжанне, асаблівасці ўжывання і стылістычную прыналежнасць.

Сэнсавая характарыстыка слова прадугледжвае выяўленне ўласцівых яму значэнняў, а таксама ўстанаўленне лексічнага значэння і яго тыпаў у кантэксце. Для вытлумачэння сэнсу слова існуюць розныя спосабы, выбар якіх залежыць ад структуры слова (вытворнае ці невытворнае) і ад тыпу яго лексічнага значэння (канкрэтнае ці абстрактнае). Напрыклад, пры тлумачэнні невытворнага слова, як правіла, выкарыстоўваецца апісальны спосаб — лагічнае вызначэнне сэнсу слова з указаннем істотных прымет прадмета, з'явы, дзеяння і г. д. (*восень* — пара года паміж летам і зімою, *май* — пяты месяц каляндарнага года). Значэнне вытворнага слова, як правіла, раскрываецца словаўтваральным спосабам — шляхам устанаўлення словаўтваральных адносін яго з тым словам, ад якога яно ўтворана (*бялець* — станавіцца белым, *школьнік* — вучань школы).

Пры выяўленні лексіка-семантычных сувязей слова неабходна падабраць да яго (калі можна) сінонімы і антонімы.

Лексічны разбор, як і іншыя віды разбору, бывае поўны і частковы. Поўны разбор праводзіцца звычайна пасля вывучэння ўсяго матэрыялу па тэме «Лексікалогія», частковы мэтазгодна праводзіць для замацавання асобных пытанняў тэмы пасля іх вывучэння (напрыклад, спосабы тлумачэння лексічнага значэння слоў).

У школьнай практыцы лексічны разбор слова не выдзяляецца як самастойны від моўнага разбору. Тым не менш ён карысны і магчымы як частковы ў IV і поўны ў V класе: пры вывучэнні тэмы «Лексіка» праграма па мове прадугледжвае азнаямленне вучняў з такімі паняццямі, як лексічнае значэнне слова, амонімы, сінонімы, антонімы, агульнаўжывальныя словы, дыялектныя, устарэлыя і інш.

## Пытанні

1. Як адрозніць мнагазначныя словы ад слоў-амонімаў?
2. Якія фанетычныя і марфалагічныя прыметы запазычаных слоў?
3. Чым прафесіяналізмы адрозніваюцца ад тэрмінаў? Архаізмы ад гістарызмаў?

## Парадак разбору

| *У ВНУ* | *У школе*[1] |
|---|---|
| 1. Лексічнае значэнне слова ў сказе. Адназначнае ці мнагазначнае слова. Назваць некалькі значэнняў мнагазначнага слова. | 1. Лексічнае значэнне слова ў сказе. Адназначнае ці мнагазначнае слова. |
| 2. Тып значэння: прамое ці пераноснае (від пераносу: метафара, метанімія, сінекдаха), свабоднае ці звязанае (фразеалагічна звязанае або сінтаксічна абумоўленае). | 2. Прамое ці пераноснае значэнне. |
| 3. Лексіка-семантычныя сувязі (падабраць да слова, калі можна, сінонімы і антонімы). | 3. Сінонімы і антонімы да слова (калі можна падабраць). |
| 4. Паходжанне слова: спрадвечна беларускае ці запазычанае. Прыметы запазычанага слова. | 4. — |
| 5. Сфера выкарыстання: агульнаўжывальнае ці абмежаванага ўжывання (дыялектнае, спецыяльнае — слова-тэрмін ці прафесійнае; жаргоннае). | 5. Агульнаўжывальнае ці дыялектнае слова, спецыяльнае або прафесійнае. |
| 6. Прыналежнасць да актыўнай ці пасіўнай лексікі (гістарызм, архаізм або неалагізм). | 6. Штодзённа ўжывальнае слова ці ўстарэлае або новае. |

[1] Падаецца прыкладны план поўнага лексічнага разбору слова ў V класе.

| | |
|---|---|
| 7. Стылістычны разрад: нейтральнае, гутарковае ці кніжнае (тэрміналагічнае, публіцыстычнае, афіцыйна-дзелавое, паэтычнае). | 7. — |

### Узоры

*I. Што ні кажы, а жыццё, ужо само па сабе, ёсць радасць, вялікае шчасце, бясцэнны дар. (К-с)*

| | |
|---|---|
| 1. *Радасць* — пачуццё вялікай асалоды, задаволенасці. Слова мнагазначнае. Іншыя значэнні: 'падзеі, абставіны, якія прыносяць асалоду, шчасце', 'ласкавы, пяшчотны зварот'. | 1. *Радасць* — пачуццё вялікай асалоды, задаволенасці. Слова мнагазначнае. |
| 2. Значэнне прамое, свабоднае. | 2. Значэнне прамое. |
| 3. Сінонім: *весялосць*; антонім: *смутак.* | 3. Сінонім: *весялосць*; антонім: *смутак.* |
| 4. Спрадвечна беларускае. | 4. — |
| 5. Агульнаўжывальнае. | 5. Агульнаўжывальнае. |
| 6. Належыць да актыўнай лексікі. | 6. Штодзённа ўжывальнае. |
| 7. Стылістычна нейтральнае. | 7. — |

*II. Чалавек працы — творца ўсіх багаццяў свету. (У. К.)*

| | |
|---|---|
| 1. *Творца* — той, хто стварае матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці. Слова адназначнае. | 1. *Творца* — той, хто стварае матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці. Слова адназначнае. |
| 2. Значэнне прамое, свабоднае. | 2. Значэнне прамое. |
| 3. Сінонімы: *тварэц, стваральнік*; антонім: *разбуральнік.* | 3. Сінонімы: *тварэц, стваральнік*; антонім: *разбуральнік.* |

| | |
|---|---|
| 4. Запазычанае з польскай мовы (пол. twórca). Прымета запазычанасці — суфікс *-ц-* *(а)*. | 4. — |
| 5. Агульнаўжывальнае. | 5. Агульнаўжывальнае. |
| 6. Належыць да актыўнай лексікі. | 6. Штодзённа ўжывальнае. |
| 7. Гутарковае. | 7. — |

*III. Высока ў сінім бязвоблачным небе плыве яркае сонца, шчодра лье на зямлю сваю цеплыню і святло. (І. Н.)*

| | |
|---|---|
| 1. *Плыве* — плаўна перамяшчаецца ў паветры. Слова мнагазначнае. Іншыя значэнні: 'перамяшчаецца на паверхні вады або ў вадзе', 'едзе на караблі, лодцы' і падобн., 'праходзіць, мінуе' і інш. | 1. *Плыве* — плаўна перамяшчаецца ў паветры. Слова мнагазначнае. |
| 2. Значэнне пераноснае (метафара), свабоднае. | 2. Значэнне пераноснае. |
| 3. Антонім: *стаіць*. | 3. Антонім: *стаіць*. |
| 4. Спрадвечна беларускае. | 4. — |
| 5. Агульнаўжывальнае. | 5. Агульнаўжывальнае. |
| 6. Належыць да актыўнай лексікі. | 6. Штодзённа ўжывальнае. |
| 7. Стылістычна нейтральнае. | 7. — |

**Практыкаванне 4**

Зрабіце лексічны разбор выдзеленых слоў.

1. Родным словам мы *грознай* парою гуртавалі рады змагароў. *(Гіл.)* 2. Сасоннік *дыхае* парнай жывіцай, а белая грэчка — нагрэтым мёдам... *(Б.)* 3. Невысокі белы *абеліск* з зоркай наверсе ўвесь зіхаціць на сонцы. *(Асіп.)* 4. Каля прыпека стаялі два чыгункі-*стаўбуны*, адзін з вадою, а другі са скрэбенай бульбай. *(Б.)* 5. За акном *плыў* у шызую далечыню асенні лес. *(Кул.)* 6. Да *перона*, нібы віхор, падляцела *электрычка*. *(Я. В.)* 7. Хмары *хутка* плылі па небе, а з імі *ўцякаў* і дождж з

далёкімі раскатамі грому. *(Пестр.)* 8. Па дарожцы да *аэрадрома* ішла жанчына — *высокая*, светлавалосая, у прыгожай стракатай сукенцы. *(Ар.)* 9. Маці натрапіла на *журавіны* і пачала збіраць іх у прыпол. *(І. Н.)* 10. Гойдаліся дрэвы, што акружалі князеў *маёнтак*. *(Лупс.)* 11. Імкнуць палкі, ідуць байцы чырвонай слаўнай *раці*... *(К-с)*

## РАЗБОР ФРАЗЕАЛАГІЗМАЎ

Пры разборы фразеалагізмаў патрабуецца растлумачыць іх сэнс, вызначыць тып паводле структуры, паходжання і інш. і сінтаксічную функцыю. У ВНУ разбор фразеалагізмаў выкарыстоўваецца як самастойны від разбору, што прызначаны сістэматызаваць веды студэнтаў па фразеалогіі, а таксама выпрацаваць у іх уменне свабодна знаходзіць фразеалагізмы ў кантэксце і правільна характарызаваць іх. На занятках неабходна найперш засяродзіць увагу на пытаннях, у трактоўцы якіх існуюць разыходжанні сярод даследчыкаў (аб'ём фразеалогіі, яе прадмет, сутнасць фразеалагічнай адзінкі) або якія не атрымалі належнага асвятлення (напрыклад, стылістычная характарыстыка фразеалагізмаў).

У школе разбор фразеалагізмаў не прадугледжваецца праграмай па мове, аднак звесткі пра фразеалагізмы прыводзяцца ў падручніку для V—VI класаў у раздзеле «Лексіка»: даецца азначэнне фразеалагізмаў, акрэсліваюцца асаблівасці ўжывання іх у мове. Таму ёсць падставы ўвесці разбор фразеалагізмаў і ў школьную практыку. Сістэматычнае выкарыстанне яго будзе садзейнічаць фарміраванню ў вучняў уменняў знаходзіць фразеалагізмы ў тэксце, выяўляць іх значэнне і правільна выкарыстоўваць у мове.

### Пытанні

1. Чым адрозніваюцца фразеалагізмы ад свабодных і сінтаксічна непадзельных словазлучэнняў?

2. Што агульнае і рознае паміж фразеалагізмамі і іншымі ўстойлівымі зваротамі мовы: прыказкамі, прымаўкамі, крылатымі выслоўямі?

3. Як адрозніць фразеалагізмы ад перыфраз?

## Парадак разбору

| *У ВНУ* | *У школе* [1] |
| --- | --- |
| 1. Значэнне фразеалагізма. | 1. Значэнне фразеалагізма. |
| 2. Пачатковая форма (калі граматычна галоўнае слова зменнае). | 2. — |
| 3. Тып фразеалагізма: а) паводле семантычнай злітнасці кампанентаў (зрашчэнне, адзінства, спалучэнне); б) паводле структуры (словазлучэнне, спалучэнне, сказ); в) паводле суадноснасці з часцінамі мовы (назоўнікавы, прыметнікавы, дзеяслоўны, прыслоўны); г) паводле паходжання (спрадвечна беларускі, запазычаны); д) паводле стылістычнай прыналежнасці (міжстылявы, гутарковы, кніжны). | 3. — |
| 4. Сінтаксічная функцыя. | 4. Сінтаксічная роля. |

## Узоры

*I. Цяжка заўважыць змены, калі яны адбываюцца на вачах. (У. К.)*

| | |
| --- | --- |
| 1. *На вачах* — увачавідкі, хутка. | 1. *На вачах* — увачавідкі, хутка. |
| 2. Пачатковая форма — *на вачах.* | 2. — |
| 3. Фразеалагічнае адзінства, паводле структуры — спалучэнне, фразеалагізм прыслоўны, спрадвечна беларускі, міжстылявы. | 3. — |

[1] Прапанаваная схема разбору фразеалагізмаў можа быць выкарыстана вучнямі V класа.

| | |
|---|---|
| 4. Выконвае функцыю акалічнасці спосабу дзеяння. | 4. З'яўляецца акалічнасцю. |

*II. Вясна ўсё больш бралася ў сілу. (Хадк.)*

| | |
|---|---|
| 1. *Бралася ў сілу* — усталёўвалася. | 1. *Бралася ў сілу* — усталёўвалася. |
| 2. Пачатковая форма — *брацца ў сілу.* | 2. — |
| 3. Фразеалагічнае спалучэнне, паводле структуры — словазлучэнне, фразеалагізм дзеяслоўны, спрадвечна беларускі, міжстылявы. | 3. — |
| 4. Выконвае функцыю выказніка. | 4. З'яўляецца выказнікам. |

**Практыкаванне 5**

Выпішыце са сказаў фразеалагізмы, зрабіце іх разбор.

1. «Бабіна лета» — так называюць у народзе гэтыя цудоўныя дні залатой восені. *(В. В.)* 2. Пасажыры не зводзілі вачэй з дзяўчыны... *(Янк.)* 3. Ніколі ж не быў, а то прыляцеў на ноч гледзячы. *(Гр.)* 4. Раптам увагу ўсіх прыцягнуў чалавек, які ішоў па дарозе... *(Саб.)* 5. Як і некалі, сядзеў ля былой Сомавай завадзі і не спускаў вачэй з паплаўка. *(Вад.)* 6. Нішто сабе хлопец і з выгляду і па натуры. Замалады, праўда, з вецярком яшчэ ў галаве. *(Хадк.)* 7. І называлі ўсе яго і за вочы і ў вочы — Міхаіл Іванавіч. *(Крап.)* 8. Ворка Дзікун ужо быў у гадах, але ніколі не галіўся. *(А. А.)* 9. Затое доўгія языкі панеслі па вёсцы навіну. *(І. Д.)* 10. Досыць скакаць пад яго [Шупіка] дудку. *(Хомч.)* 11. Яму [Башлыкову] было добра ад таго, што ён вёў у спрэчцы не толькі адзіна правільную лінію, але і трымаўся прынцыпова, цвёрда. *(Мел.)*

## МАРФЕМНЫ РАЗБОР

Марфемны разбор прадугледжвае вызначэнне марфемнай будовы слова, г. зн. выдзяленне ў ім жывых для сучаснай мовы марфем і ўстанаўленне іх функцый. Марфемы ў слове выдзяляюцца шляхам падбору і параўнан-

ня аднакарэнных і аднаструктурных слоў. Напрыклад, параўнанне слова *прыдарожны*, з аднаго боку, з аднакарэннымі словамі *бездараж, здарожыцца, дарожны, дарога* і, з другога боку, з аднаструктурнымі *прыазёрны, прывакзальны, прысядзібны* дае падставу выдзеліць у ім наступныя марфемы: корань *-дарож-*, суфікс *-н-*, прыстаўку *пры-*, канчатак *-ы*.

Пры марфемным разборы неабходна ўлічваць, да якой часціны мовы адносіцца слова, зменнае яно ці нязменнае. Словы службовых часцін мовы, за выключэннем вытворных, суадносных з паўназначнымі, і выклічнікі на марфемы не падзяляюцца. У нязменных словах (інфінітыў, дзеепрыслоўе, прыслоўе) няма канчатка. Напрыклад, марфема *-ам* у назоўніку *вечарам (Дзеці любуюцца летнім вечарам)* з'яўляецца канчаткам, а ў прыслоўі *вечарам (Брат прыехаў вечарам)* — суфіксам.

Марфемны разбор цесна звязаны са словаўтваральным. У некаторых выпадках марфемны склад слова можна дакладна вызначыць, выкарыстоўваючы элементы словаўтваральнага разбору. Напрыклад, у падобных па структуры назоўніках *дэсантнік* і *разраднік* выдзяляюцца розныя марфемы: суфікс *-ік* у першым назоўніку, таму што ён утвораны ад прыметніка *дэсантны (дэсантнік* — той, хто служыць у дэсантных войсках), і суфікс *-нік* у другім назоўніку, паколькі ён утвораны ад назоўніка *разрад* (*разраднік* — той, хто мае спартыўны разрад).

Марфемны разбор можа быць поўны, калі ў слове выяўляюцца і характарызуюцца ўсе марфемы, і частковы, калі выдзяляецца і аналізуецца толькі пэўны тып марфем (прыстаўкі, суфіксы і інш.).

### Пытанні

1. Чым тлумачыцца неабходнасць выдзялення нулявых марфем?
2. Якія афіксы адносяцца да формаўтваральных?
3. Чаму пры марфемным разборы слоў трэба ўлічваць з'яву апрошчання?

### Парадак разбору[1]

| *У ВНУ* | *У школе* |
|---|---|
| 1. Часціна мовы. | 1. Часціна мовы. |

[1] У школьнай практыцы марфемны разбор называюць разборам слова па складу.

2. Зменнае слова ці нязменнае; як змяняецца.

3. Канчатак (у тым ліку нулявы). Граматычныя значэнні канчатка.

4. Аснова. Тып асновы (вытворная ці невытворная).

5. Корань (падабраць некалькі роднасных слоў). Магчымыя варыянты кораня.

6. Афіксы (падабраць некалькі аднаструктурных слоў, г. зн. з тымі ж афіксамі):

а) суфікс;

б) прыстаўка;

в) постфікс;

г) інтэрфікс. Функцыя афіксаў у слове (словаўтваральны ці формаўтваральны — з указаннем канкрэтных граматычных форм).

7. Графічнае абазначэнне марфемнай будовы слова.

2. Зменнае слова ці нязменнае.

3. Канчатак (у тым ліку нулявы). Значэнні канчатка.

4. Аснова. Тып асновы (вытворная ці невытворная).

5. Корань (падабраць два-тры роднасныя словы).

6. Значымыя часткі (падабраць адно-два словы з тымі ж значымымі часткамі):

а) суфікс;

б) прыстаўка;

в) —

г) —

7. Графічнае абазначэнне марфемнага складу слова.

## Узоры

*I. На тым баку бялеў малады бярэзнік, напалову затоплены веснавой паводкаю. (Грах.)*

1. *Бярэзнік* — назоўнік.

2. Змяняецца па склонах і ліках (*бярэзнік-у, бярэзнік-амі* і г. д.).

3. Канчатак нулявы, паказвае на мужчынскі род, назоўны склон, адзіночны лік.

4. Аснова *бярэзнік-*, вытворная.

1. *Бярэзнік* — назоўнік.

2. Зменнае слова.

3. Канчатак нулявы, паказвае на мужчынскі род, назоўны склон, адзіночны лік.

4. Аснова *бярэзнік-*, вытворная.

5. Корань *бярэз'-*; роднасныя словы: *бяроза, бярозавы, бярэзіна.* Варыянты кораня: *бяроз-* (бярозы), *бяроз'-* (бярозе), *бярос-* (бярозка).

6. Суфікс *-нік*; словаўтваральны, служыць для ўтварэння назоўніка. Словы з гэтым суфіксам: *хвойнік, ракітнік, асіннік.*

7. Графічны разбор: *бярэзнік* □.

5. Корань *бярэз'-*; роднасныя словы: *бяроза, бярозавы, бярэзіна.*

6. Суфікс *-нік*; служыць для ўтварэння назоўніка. Словы з гэтым суфіксам: *хвойнік, ракітнік, асіннік.*

7. Графічнае абазначэнне марфемнага складу: *бярэзнік* □.

*II. Над духмянымі кветкамі клапатліва гудуць працавітыя пчолы. (В. В.)*

1. *Клапатліва* — прыслоўе.

2. Нязменнае слова.

3. —

4. Аснова *клапатліва*, вытворная.

5. Корань *клапат-*; роднасныя словы: *клапатлівы, клопат.* Варыянты кораня: *клопат-* (клопату, клопатам), *клопац'-* (у клопаце), *клапац'-* (клапаціцца).

6. Суфікс *-а*; словаўтваральны, служыць для ўтварэння прыслоўя. Суфікс *-лів-*; словаўтваральны, служыць для ўтварэння прыметніка. Словы з гэтымі суфіксамі: *сарамліва, сіратліва, зайздрасліва.*

7. Графічны разбор: *клапатліва.*

1. *Клапатліва* — прыслоўе.

2. Нязменнае слова.

3. —

4. Аснова *клапатліва*, вытворная.

5. Корань *клапат-*; роднасныя словы: *клапатлівы, клопат.*

6. Суфікс *-а*; служыць для ўтварэння прыслоўя. Суфікс *-лів-*; служыць для ўтварэння прыметніка. Словы з гэтымі суфіксамі: *сарамліва, сіратліва, зайздрасліва.*

7. Графічнае абазначэнне марфемнага складу: *клапатліва.*

**Практыкаванне 6**

Зрабіце марфемны разбор выдзеленых слоў.

1. Справа і *злева зазелянелі* садзікі, у якіх туліліся невялікія дамы *прыгарада. (Корб.)* 2. Паўз бальшак ішла *травяністая сцежка. (Хадк.)* 3. Толькі *расплюшчвае* бланітныя вочы лён, а на *сенажацях* кветак, што не пералічыць. *(Бр.)* 4. Колькі раздолля ты дорыш жыццю, край мой *узгоркавы*, край мой лясны. *(Гіл.)* 5. А следам за чарніцамі ў сярэдзіне ліпеня *заружавелі* маліны. *(Янч.)* 6. Веюць ветры, веюць буйныя, долу *гнуцца* клёны. *(Нар. тв.)* 7. Лесу не відаць, тольні сям-там *пералескі, маленькія*, вельмі ўтульныя цяністыя гаёчкі. *(Сач.)* 8. *Наперадзе пачулася* песня, ціхая, нясмелая, як ласкавы подых ветру ў спякотны *летні* дзень. *(Кудр.)* 9. Лось пастаяў на *зацененай* дрэвамі дарозе, панюхаў густое паветра і рушыў далей, пагарджаючы небяспекай. *(Чыгр.)*

## СЛОВАЎТВАРАЛЬНЫ РАЗБОР

Словаўтваральны разбор мае на мэце вызначыць, як утворана вытворнае слова, г. зн. ад якога слова (асновы ці словазлучэння) і пры дапамозе якіх сродкаў (прыставак, суфіксаў і інш.). Пры словаўтваральным разборы трэба размяжоўваць паняцці «вытворная-невытворная аснова» і «вытворнае-невытворнае слова». Напрыклад, словы *блакіт, скрып* маюць невытворную аснову, але самі словы вытворныя: першае ўтварылася бязафіксным спосабам ад прыметніка *блакітны*, другое — ад дзеяслова *скрыпець*. Такія словы, як, напрыклад, *клікаць, вучыць*, невытворныя, але маюць вытворную аснову, якая, апрача каранёў *клік-, вуч-*, уключае суфіксы асновы інфінітыва *-а-, -ы-* і спецыяльны інфінітыўны суфікс *-ць*.

У школьным падручніку па беларускай мове схема словаўтваральнага разбору не даецца. Аднак у школе мэтазгодна практыкаваць такі від разбору: у V—VI класах характарызуюцца асноўныя спосабы словаўтварэння і, акрамя таго, разглядаецца ўтварэнне самастойных часцін мовы (назоўніка, прыметніка, дзеяслова і прыслоўя).

Словаўтваральны разбор можа быць выкарыстаны ў ВНУ і школе пасля вывучэння тэмы «Словаўтварэнне» для замацавання ведаў аб словаўтваральных паняццях;

аднак больш за ўсё яго мэтазгодна практыкаваць пры разглядзе спосабаў утварэння самастойных часцін мовы.

Эфектыўнасць словаўтваральнага разбору залежыць ад умення студэнтаў і вучняў устанаўліваць словаўтваральныя (фармальныя і семантычныя) сувязі паміж утвораным словам і асновай утваральнага, а таксама размяжоўваць гістарычную і сучасную словаўтваральную структуру слова.

## Пытанні

1. Чым адрозніваюцца новыя словы ад розных граматычных форм аднаго і таго ж слова?

2. Чым адрозніваецца паводле значэння вытворнае слова ад слова з утваральнай асновай?

3. Як практычна адрозніваюць прыставачна-суфіксальны спосаб утварэння слоў ад прыставачнага і суфіксальнага?

## Парадак разбору

*У ВНУ*

1. Часціна мовы.
2. Вытворнае слова ці невытворнае.
3. Значэнне вытворнага слова.
4. Словаўтваральная база (аснова, поўнасцю слова ці спалучэнне слоў).
5. Словаўтваральны сродак (прыстаўка, суфікс і інш.).
6. Спосаб словаўтварэння (прыставачны, суфіксальны, прыставачна-суфіксальны, бязафіксны, марфолага - сінтаксічны, лексіка-сінтаксічны, лексіка-семантычны).

*У школе*[1]

1. Часціна мовы.
2. —
3. Лексічнае значэнне слова.
4. Утваральная аснова.
5. Сродак (прыстаўка, суфікс), пры дапамозе якога ўтворана.
6. Спосаб словаўтварэння (прыставачны, суфіксальны, прыставачна-суфіксальны, бяссуфіксны, асноваскладанне, словаскладанне, пераход слоў з адной часціны мовы ў другую).

[1] Перавагу неабходна аддаваць разбору слоў, утвораных марфалагічным спосабам як найбольш тыповым для беларускай мовы.

7. Графічная схема ўтварэння слова (абазначэнне словаўтваральнай сувязі вытворнага слова і слова з утваральнай асновай).

7. Графічная схема ўтварэння слова.

## Узоры

*I. Негарачае восеньскае сонца залівала пакой святлом. (Сам.)*

1. *Негарачае* — прыметнік.
2. Вытворны.
3. Лексічнае значэнне *'цёплае'*.
4. Утваральная база — прыметнік *гарачы*.
5. Словаўтваральны сродак прыстаўка *не-*.
6. Спосаб утварэння прыставачны.
7. Графічная схема ўтварэння слова: *гарачы → негарачы*.

1. *Негарачае* — прыметнік.
2. —
3. Лексічнае значэнне *'цёплае'*.
4. Утвораны ад прыметніка *гарачы*.
5. Словаўтваральны сродак прыстаўка *не-*.
6. Спосаб утварэння прыставачны.
7. Графічная схема ўтварэння слова: *гарачы → негарачы*.

*II. Чарнела неба ад хмар, шумеў голым веццем узлесак, стыла шэрая далячынь. (В. Б.)*

1. *Узлесак* — назоўнік.
2. Вытворны.
3. Лексічнае значэнне 'край лесу'.
4. Утваральная аснова *лес-* (ад назоўніка *лес*).
5. Словаўтваральны сродак прыстаўка *уз-* і суфікс *-ак*.
6. Спосаб утварэння прыставачна - суфіксальны.
7. Графічная схема ўтварэння слова: *лес → узлесак*.

1. *Узлесак* — назоўнік.
2. —
3. Лексічнае значэнне 'край лесу'.
4. Утваральная аснова *лес*.
5. Утвораны пры дапамозе прыстаўкі *уз-* і суфікса *-ак*.
6. Спосаб утварэння прыставачна - суфіксальны.
7. Графічная схема ўтварэння слова: *лес → узлесак*.

**Практыкаванне 7**

Зрабіце словаўтваральны разбор выдзеленых слоў.

1. *Уперадзе* каля самай дарогі стаяў лясок, пераважна бярозавы. *(К-с)* 2. Праца ў Паўлышскай школе — *творчасць*, пошук, эксперымент, *выпрабаванне* волі, характару, здольнасцей. *(Віт.)* 3. Маці ўзяла дзяўчынку на рукі, прытуліла да сябе і *пяшчотна* засмяялася. *(Кул.)* 4. Сонечны дзень плыве ў цёплай *бясхмарнай празрыстасці*. *(І. Н.)* 5. Вецер прыціх, і ў цішыні, здавалася, чуваць быў мяккі шолах *снегападу*. *(Хадк.)* 6. *Падаконнікі* былі густа заstаўлены вазонамі. *(Бяд.)* 7. З гэтага боку, пры бярозе, *цямнела* купка хмызняку. *(Мел.)* 8. *Снежаньскім вечарам* уся наша дружная сямейка за сталом збіраецца. *(Янч.)* 9. Андрэйка, пачуўшы голас чалавека, *асмялеў*. *(П. К.)* 10. Перад *адлётам* на чужыну танцуюць белыя буслы. *(Янч.)*

## МАРФАЛАГІЧНЫ РАЗБОР

Марфалагічны разбор — гэта разбор слова як часціны мовы з уласцівымі яму марфалагічнымі прыметамі. У школе вывучаюцца часціны мовы, якія з'яўляюцца «традыцыйнымі» (агульнапрызнанымі): назоўнік, прыметнік, лічэбнік, займеннік, дзеяслоў, прыслоўе, прыназоўнік, злучнік, часціца, выклічнік; у ВНУ, апрача таго, выдзяляюць безасабова-прэдыкатыўныя і мадальныя словы. Прыналежнасць слова да пэўнай часціны мэтазгодна вызначаць не па адной прымеце, а па іх сукупнасці (улічваецца агульнае граматычнае значэнне, марфалагічныя прыметы і сінтаксічная функцыя). Пры марфалагічным разборы самастойных (знамянальных) часцін мовы неабходна пільнавацца строгага парадку: спачатку вызначаюць пастаянныя (сталыя) марфалагічныя прыметы, якія не залежаць ад змен форм слова, а потым непастаянныя (нясталыя), якія абумоўліваюцца сінтаксічнай функцыяй формы слова ў сказе. Пастаяннымі прыметамі з'яўляюцца, напрыклад, род, скланенне назоўнікаў, трыванне, спражэнне дзеясловаў, непастаяннымі — род, склон прыметнікаў, лад, час, асоба, лік, род дзеясловаў і г. д. Пры выдзяленні марфалагічных прымет варта карыстацца прыёмам проціпастаўлення форм аднаго і таго ж слова. Пры гэтым мэтазгодна проціпастаўляць

формы слова не па адной, а па некалькіх прыметах [1]. Напрыклад, каб вызначыць марфалагічныя прыметы дзеяслова *пішу*, можна супаставіць яго з наступнымі формамі:

| супастаўленне форм | па прымеце | формы |
|---|---|---|
| *пішу — пісаў* | час | цяперашні час — прошлы час |
| *пішу — пішам* | лік | адзіночны лік — множны лік |
| *пішу — пішам* | асоба | 1-я асоба — 2-я асоба |

Пры разборы слова важна правільна ўстанавіць яго пачатковую форму, ад чаго часта залежыць дакладнае вызначэнне марфалагічных прымет слова: напрыклад, спражэнне дзеясловаў, скланенне назоўнікаў і інш. Пачатковай формай для скланяльных часцін мовы выступае: для назоўнікаў — форма назоўнаґа склону адзіночнага ліку, для прыметнікаў (парадкавых лічэбнікаў, дзеепрыметнікаў, займеннікаў-прыметнікаў) — форма назоўнага склону мужчынскага роду; для спрагальнай часціны мовы (дзеяслова) і яго формы (дзеепрыслоўя) — інфінітыў.

Марфалагічны разбор службовых слоў, як і самастойных, у ВНУ больш поўны і глыбокі, чым у школе: ён прадугледжвае выяўленне іх разраду паводле паходжання (суадносін з іншымі часцінамі мовы), структуры і функцыянальнага значэння. Пры вывучэнні службовых часцін мовы асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на фарміраванне ў вучняў і студэнтаў умення адрозніваць прыназоўнікі і злучнікі ад падобных да іх па форме слоў іншых часцін мовы — прыслоўяў, займеннікаў, часціц і інш.

Марфалагічны разбор можа быць поўны і частковы. Пры поўным разборы адзначаюцца ўсе марфалагічныя прыметы слова, пры частковым — толькі некаторыя з іх (напрыклад, род назоўнікаў, асоба дзеясловаў і г. д.).

---

[1] Основы методики русского языка в 4—8 классах: Пособие для учителя/Под ред. А. В. Текучева, М. М. Разумовской, Т. А. Ладыженской.— 2-е изд.— М., 1983.— С. 92—93.

## НАЗОЎНІК

### Пытанні

1. Чым адрозніваюцца граматычна адушаўлёныя назоўнікі ад неадушаўлёных?
2. Як вызначаецца род, лік, склон нескланяльных назоўнікаў?
3. Для якіх назоўнікаў тып скланення не вызначаецца?
4. Што ўлічваецца пры вызначэнні склону назоўнікаў з аманімічнымі канчаткамі?

### Парадак разбору

| *У ВНУ* | *У школе* |
|---|---|
| 1. Часціна мовы. | 1. Часціна мовы. |
| 2. Пачатковая форма (назоўны склон адзіночнага ліку). | 2. Пачатковая форма (назоўны склон адзіночнага ліку). |
| 3. Лексіка-граматычны разрад: | 3. Разрад паводле значэння і граматычных асаблівасцей: |
| а) агульны ці ўласны; | а) агульны ці ўласны; |
| б) адушаўлёны ці неадушаўлёны; | б) адушаўлёны ці неадушаўлёны; |
| в) канкрэтны ці абстрактны; | в) — |
| г) зборны, рэчыўны ці адзінкавы. | г) — |
| 4. Марфалагічныя прыметы: род, скланенне, лік, склон. | 4. Марфалагічныя прыметы: род, скланенне, лік, склон. |
| 5. Сінтаксічная функцыя. | 5. Сінтаксічная роля. |

### Узоры

*I. Матчына сэрца гатова ўсім ахвяраваць дзеля любага дзіцяці свайго. (Бяд.)*

| | |
|---|---|
| 1. *(Дзеля) дзіцяці* — назоўнік. | 1. *(Дзеля) дзіцяці* — назоўнік. |
| 2. Пачатковая форма — *дзіця.* | 2. Пачатковая форма — *дзіця.* |

3. Агульны, адушаўлёны, канкрэтны.

4. Ніякага роду, рознаскланяльны; ужыты ў адзіночным ліку, родным склоне.

5. Выконвае функцыю дапаўнення.

3. Агульны, адушаўлёны.

4. Ніякага роду, рознаскланяльны; ўжыты ў адзіночным ліку, родным склоне.

5. З'яўляецца дапаўненнем.

*II. Юнак быў старшым піянерважатым школы. (Мал.)*

1. *(Быў) піянерважатым* — назоўнік.

2. Пачатковая форма — *піянерважаты.*

3. Агульны, адушаўлёны, канкрэтны.

4. Мужчынскага роду, ад'ектыўнага скланення; ужыты ў адзіночным ліку, творным склоне.

5. Выступае ў ролі іменнай часткі выказніка.

1. *(Быў) піянерважатым* — назоўнік.

2. Пачатковая форма — *піянерважаты.*

3. Агульны, адушаўлёны.

4. Мужчынскага роду, скланяецца як прыметнік; ужыты ў адзіночным ліку, творным склоне.

5. Уваходзіць у склад выказніка *быў піянерважатым.*

*III. Валодзя быў апрануты ў добрае шэрае паліто. (Н.)*

1. *Паліто* — назоўнік.

2. Пачатковая форма — *паліто.*

3. Агульны, неадушаўлёны, канкрэтны.

4. Ніякага роду, нескланяльны, тут мае форму адзіночнага ліку; ужыты ў вінавальным склоне.

5. Выконвае функцыю дапаўнення.

1. *Паліто* — назоўнік.

2. Пачатковая форма — *паліто.*

3. Агульны, неадушаўлёны.

4. Ніякага роду, нескланяльны, тут мае форму адзіночнага ліку; ужыты ў вінавальным склоне.

5. З'яўляецца дапаўненнем.

**Практыкаванне 8**

Зрабіце марфалагічны разбор назоўнікаў.

1. Назаўтра алені зноў прыйшлі да стога. *(Пташн.)* 2. На гэтых палетках ліламее канюшына, варушыцца

вусаты ячмень... *(Каратк.)* 3. Ярмолаў астаўся ля акна насупраць свайго купэ. *(Кул.)* 4. На вечары збіралася студэнцтва з другіх навучальных устаноў. *(Луж.)* 5. Пачынаецца вуліца ад чыгуначнага пераезда і цягнецца ў поле. *(І. Н.)* 6. Усіх прысутных віншуюць з вялікім святам — Днём Перамогі, выступаюць з прамовамі. *(Дам.)* 7. Пры шашы, там, дзе яна хаваецца ў сасонніку, стаяла каліськці вёсачка... *(І. Н.)* 8. Нас чакаюць вялікія справы ў жыцці, трэба ўперад ісці, толькі ўперад ісці. *(А. К.)* 9. Пры парывах дождж большаў, рабіўся буйнейшы... *(У. К.)* 10. Якая светлая, якая чуйная ў полі цішыня! *(Стр.)*

## ПРЫМЕТНІК

### Пытанні

1. Як вызначаюцца марфалагічныя прыметы прыметнікаў?

2. Пры якой умове адносныя прыметнікі пераходзяць у якасныя, і наадварот — якасные ў адносныя?

3. У якіх значэннях могуць ужывацца агульнапрыналежныя прыметнікі?

### Парадак разбору

| *У ВНУ* | *У школе* |
|---|---|
| 1. Часціна мовы. | 1. Часціна мовы. |
| 2. Пачатковая форма (назоўны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду). | 2. Пачатковая форма (назоўны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду). |
| 3. Лексіка-граматычны разрад: якасны, адносны ці прыналежны. | 3. Разрад паводле значэння: якасны, адносны ці прыналежны. |
| 4. Поўны ці кароткі. | 4. Поўны ці кароткі. |
| 5. Ступень параўнання якасных (калі ёсць: вышэйшая ці найвышэйшая — простая або складаная). | 5. Ступень параўнання якасных (калі ёсць: вышэйшая ці найвышэйшая). |
| 6. Форма ацэнкі і меры якасці (калі ёсць). | 6. — |

7. Марфалагічныя прыметы: лік, род (у адзіночным ліку), склон.

8. Да якога назоўніка дапасуецца.

9. Сінтаксічная функцыя.

7. Марфалагічныя прыметы: лік, род (у адзіночным ліку), склон.

8. Да якога назоўніка дапасуецца.

9. Сінтаксічная роля.

## Узоры

*I. Баброва галава паказалася двойчы і знікла. (Б.)*

1. *Баброва (галава)* — прыметнік.
2. Пачатковая форма — *бабровы.*
3. Прыналежны.
4. Поўны.
5. —
6. —
7. Ужыты ў адзіночным ліку, жаночым родзе, назоўным склоне.
8. Дапасуецца да назоўніка *галава.*
9. Выконвае функцыю азначэння.

1. *Баброва (галава)* — прыметнік.
2. Пачатковая форма — *бабровы.*
3. Прыналежны.
4. Поўны.
5. —
6. —
7. Ужыты ў адзіночным ліку, жаночым родзе, назоўным склоне.
8. Дапасуецца да назоўніка *галава.*
9. З'яўляецца азначэннем.

*II. У цяплейшых мясцінах, на сонцы, пасвіствалі шпакі. (В. К.)*

1. *(У) цяплейшых (мясцінах)* — прыметнік.
2. Пачатковая форма — *цяплейшы.*
3. Якасны.
4. Поўны.
5. Мае простую форму вышэйшай ступені параўнання.
6. —
7. Ужыты ў множным ліку, месным склоне.
8. Дапасуецца да назоўніка *мясцінах.*

1. *(У) цяплейшых (мясцінах)* — прыметнік.
2. Пачатковая форма — *цяплейшы.*
3. Якасны.
4. Поўны.
5. Мае форму вышэйшай ступені параўнання.
6. —
7. Ужыты ў множным ліку, месным склоне.
8. Дапасуецца да назоўніка *мясцінах.*

| | |
|---|---|
| 9. Выконвае функцыю азначэння. | 9. З'яўляецца азначэннем. |

*III. З мора насустрач нам адна за другой коцяцца ўзнятыя ветрам зеленаватыя хвалі. (Гал.)*

| | |
|---|---|
| 1. *Зеленаватыя (хвалі)* — прыметнік. | 1. *Зеленаватыя (хвалі)* — прыметнік. |
| 2. Пачатковая форма — *зеленаваты.* | 2. Пачатковая форма — *зеленаваты.* |
| 3. Якасны. | 3. Якасны. |
| 4. Поўны. | 4. Поўны. |
| 5. — | 5. — |
| 6. Мае форму са значэннем непаўнаты якасці. | 6. — |
| 7. Ужыты ў множным ліку, назоўным склоне. | 7. Ужыты ў множным ліку, назоўным склоне. |
| 8. Дапасуецца да назоўніка *хвалі.* | 8. Дапасуецца да назоўніка *хвалі.* |
| 9. Выконвае функцыю дзейніка. | 9. З'яўляецца дзейнікам. |

**Практыкаванне 9**

Зрабіце марфалагічны разбор прыметнікаў.

1. Я ведаў, што чмяліны мёд смачнейшы за пчаліны. *(А. М.)* 2. Змятала з прыдарожных бяроз апошняе лісце... *(Шам.)* 3. У вялікаватым пакоі, дзе стаяла поўна сталоў, было амаль пуста. *(Мел.)* 4. Рыпнулі дзверы. Пачуліся з сенцаў мяккія і часцейшыя, чым бывала, крокі. *(Янк.)* 5. Дарога ішла паўз лясное возера. *(Чыгр.)* 6. Незнаёмы паглядзеў на мяне цёплымі, бацькоўскімі вачамі. *(Бяд.)* 7. Ранак стаяў марозны, празрысты. *(Чарн.)* 8. Паветра стала мякчэйшае, ільдзяныя крышталікі гаслі, раставалі. *(Хадк.)* 9. Колькі ў прыродзе таямніц і загадак, але самая складаная — чалавек. *(Віт.)* 10. Далёка ў прырэчных лугах пераклікаліся салаўі. *(Хадк.)* 11. Марылін пасаг, праўда, прадалі з яе згоды і купілі столькі ж зямлі бліжэй. *(Б.)* 12. У блакітнай высі плывуць белыя аблачынкі... *(І. Н.)* 13. У першыя гады жыцця ўражлівая душа дзіцяці спасцігае найтанчэйшыя фарбы і адценні роднага слова. *(Віт.)*

2 Зак. 301

## ЛІЧЭБНІК

### Пытанні

1. Чым адрозніваюцца лічэбнікі ад няпэўна-колькасных слоў?
2. Якія марфалагічныя асаблівасці лічэбнікаў розных разрадаў?

### Парадак разбору

*У ВНУ*

1. Часціна мовы.
2. Пачатковая форма (назоўны склон).
3. Лексіка-граматычны разрад: колькасны (уласнаколькасны, зборны, дробавы) або парадкавы.
4. Разрад па структуры: просты, складаны або састаўны.
5. Марфалагічныя прыметы:

а) для колькасных — род (калі ёсць), лік (калі ёсць), склон;

б) для парадкавых — род, лік, склон.

6. Да якога назоўніка дапасуецца (калі лічэбнік парадкавы) [1].
7. Сінтаксічная функцыя.

*У школе*

1. Часціна мовы.
2. Пачатковая форма (назоўны склон).
3. Разрад паводле значэння: колькасны (абазначае цэлы лік, дробавы, зборны) або парадкавы.
4. Разрад паводле складу: просты, складаны або састаўны.
5. Марфалагічныя прыметы: род (калі ёсць), лік (калі ёсць), склон.
6. Да якога назоўніка дапасуецца (калі лічэбнік парадкавы).
7. Сінтаксічная роля.

### Узоры

*I. Чатырнаццатага жніўня, чапляючыся крыллем за нізкія хмары, над самым Жыцькавам ляцелі ў вырай журавы. (Сіп.)*

---

[1] У пэўных склонах дапасуюцца да назоўнікаў і колькасныя лічэбнікі (гл.: Сучасная беларуская мова: Марфалогія/Пад рэд. Ф. М. Янкоўскага.— 2-е выд., дапр.— Мн., 1980.— С. 109—110).

1. *Чатырнаццатага (жніўня)* — лічэбнік.

2. Пачатковая форма — *чатырнаццаты*.

3. Парадкавы.

4. Просты.

5. Ужыты ў мужчынскім родзе, адзіночным ліку, родным склоне.

6. Дапасуецца да назоўніка *жніўня*.

7. Уваходзіць у склад акалічнасці часу *чатырнаццатага жніўня*.

*II. З таго часу прайшло семнаццаць год. (Лыньк.)*

1. *Семнаццаць (год)* — лічэбнік.

2. Пачатковая форма — *семнаццаць*.

3. Колькасны (абазначае цэлы лік).

4. Просты.

5. Ужыты ў назоўным склоне.

6. —

7. Уваходзіць у склад дзейніка *семнаццаць год*.

**Практыкаванне 10**

Зрабіце марфалагічны разбор лічэбнікаў.

1. Лясной дарогай Міця прайшоў вёрст шэсць. *(І. Н.)* 2. У семнаццатым стагоддзі ля Полацка быў злоўлены сом вагою ў пятнаццаць пудоў. *(Каратк.)* 3. Бярэзавец — кіламетра паўтара ад вёскі, ля ракі Бярэзаўкі... *(Пташн.)* 4. Дождж быў абложны, ліў ужо трэція суткі запар і часам пераходзіў у снег. *(У. К.)* 5. Дзяўчына падбегла да шафёрскай кабіны, працягнула шафёру абедзве рукі з двума рамонкавымі букетамі. *(Янк.)* 6. Метраў на пяць ад зямлі хвоя раздвойвалася. *(Вад.)* 7. Алёша чуў, што тут застаўся самы першы дэсант з васемнаццаці чалавек. *(Хомч.)* 8. Лепш адзін раз пабачыць, чым сто разоў пачуць. *(Прык.)* 9. Апошнія двац-

цаць кіламетраў прыйшлося ісці пехатой. *(Б.)* 10. Больш як праз пяцьдзесят гадоў адчуваю цёплыя шырокія настаўнікавы рукі. *(Янк.)* 11. Так, калі верыць легендзе, і ўтварылася Князь-возера, плошчаю каля сарака чатырох квадратных кіламетраў. *(Каратк.)*

## ЗАЙМЕННІК

### Пытанні

1. Якія марфалагічныя асаблівасці займеннікаў розных разрадаў?
2. Чым адносныя займеннікі адрозніваюцца ад пытальных?
3. У ролі якіх часцін мовы могуць ужывацца займеннікі?

### Парадак разбору

*У ВНУ*

1. Часціна мовы.
2. Пачатковая форма (назоўны склон адзіночнага ліку) [1].
3. Лексіка-граматычны разрад (па суадносінах з іншымі часцінамі мовы):

а) займеннік-назоўнік (абагульнена - прадметны);

б) займеннік-прыметнік (абагульнена-якасны);

в) займеннік-лічэбнік (абагульнена - колькасны).

4. Лексіка-семантычны разрад: асабовы (уласна-асабовы ці ўказальна-асабовы), зваротны, прыналежны, указальны, азначальны, пытальны, адносны, адмоўны, няпэўны.

*У школе*

1. Часціна мовы.
2. Пачатковая форма (назоўны склон адзіночнага ліку).
3. —
4. Разрад паводле значэння: асабовы, зваротны, прыналежны, указальны, азначальны, пытальны, адносны, адмоўны, неазначальны.

---

[1] Для займенніка *сябе*, які не мае назоўнага склону, у якасці пачатковай формы прынята падаваць форму роднага склону.

| | |
|---|---|
| 5. Марфалагічныя прыметы: а) для займеннікаў-назоўнікаў — склон (для асабовых — асоба, склон); б) для займеннікаў-прыметнікаў — род, лік, склон. | 5. Марфалагічныя прыметы: асоба (для асабовых), род (калі ёсць), лік (калі ёсць), склон. |
| 6. Да якога назоўніка дапасуецца (калі займеннік-прыметнік). | 6. Да якога назоўніка дапасуецца (калі змяняецца як прыметнік). |
| 7. Сінтаксічная функцыя. | 7. Сінтаксічная роля. |

## Узоры

*I. Жыццё прыгожае не толькі гармоніяй колераў, гукаў і форм, яно прыгожае і гармоніяй рухаў, гармоніяй клопатаў. (М. Л.)*

| | |
|---|---|
| 1. *Яно* — займеннік. | 1. *Яно* — займеннік. |
| 2. Пачатковая форма — *яно.* | 2. Пачатковая форма — *яно.* |
| 3. Займеннік-назоўнік. | 3. — |
| 4. Асабовы (асабова-ўказальны). | 4. Асабовы. |
| 5. 3-й асобы; ужыты ў ніякім родзе, адзіночным ліку, назоўным склоне. | 5. 3-й асобы; ужыты ў ніякім родзе, адзіночным ліку, назоўным склоне. |
| 6. — | 6. — |
| 7. Выконвае функцыю дзейніка. | 7. З'яўляецца дзейнікам. |

*II. Белыя бярозкі беларускія міла так аздобілі наш край. (Шым.)*

| | |
|---|---|
| 1. *Наш (край)* — займеннік. | 1. *Наш (край)* — займеннік. |
| 2. Пачатковая форма — *наш.* | 2. Пачатковая форма — *наш.* |
| 3. Займеннік-прыметнік. | 3. — |
| 4. Прыналежны. | 4. Прыналежны. |

5. Ужыты ў мужчынскім родзе, адзіночным ліку, вінавальным склоне.

6. Дапасуецца да назоўніка *край.*

7. Выконвае функцыю азначэння.

5. Ужыты ў мужчынскім родзе, адзіночным ліку, вінавальным склоне.

6. Дапасуецца да назоўніка *край.*

7. З'яўляецца азначэннем.

*III. Прытаіўся дзед у хмызняку і асцярожна ўзіраецца перад сабою. (К-с)*

1. *Сабою* — займеннік.

2. Пачатковая форма — *сябе.*

3. Займеннік-назоўнік.

4. Зваротны.

5. Ужыты ў творным склоне.

6. —

7. Выконвае функцыю дапаўнення.

1. *Сабою* — займеннік.

2. Пачатковая форма — *сябе.*

3. —

4. Зваротны.

5. Ужыты ў творным склоне.

6. —

7. З'яўляецца дапаўненнем.'

**Практыкаванне 11**

Зрабіце марфалагічны разбор займеннікаў.

1. Будуць пералескі, трывожная радасць, што недзе зусім блізка свая вёска. *(В. А.)* 2. Дарога, дарога! Чым заваражыла мяне ты? *(М. Т.)* 3. Той, хто праўды шукае,— у нас знойдзе яе. *(М. Т.)* 4. Паўз самы школьны двор — зімняя дарога да шляху. *(Мел.)* 5. Ніхто не адказаў, і дзед яшчэ раз запытаўся. *(Лыньк.)* 6. За мір і шчасце змагайцеся, працоўныя ўсіх краін! *(А. К.)* 7. Міколка расказваў дзеду пра сябе. *(Як.)* 8. Што пасееш, тое і пажнеш. *(Прык.)* 9. Братэрства, якое выратавала нас ў вайне, дапамагло нам у вялікім пасляваенным аднаўленні, у нашай стваральнай працы. *(Мел.)* 10. Я ніколі не бачыў такой вясёлай і шчаслівай сваю маці, як у гэты дзень. *(І. Н.)* 11. Па рагах можна даведацца, колькі аленю год. *(В. В.)*

## ДЗЕЯСЛОЎ

### Пытанні

1. Якімі граматычнымі прыметамі адрозніваюцца пераходныя дзеясловы ад непераходных?

2. Якія граматычныя формы маюць дзеясловы абвеснага, загаднага і ўмоўнага ладу?

3. Як устанаўліваецца значэнне закончанасці або незакончанасці дзеяння двухтрывальных дзеясловаў?

4. Якія асаблівасці ўтварэння і ўжывання складаных форм прошлага часу дзеясловаў у беларускай мове?

## Парадак разбору

| *У ВНУ* | *У школе* |
| --- | --- |
| 1. Часціна мовы. | 1. Часціна мовы. |
| 2. Пачатковая форма (інфінітыў). | 2. Пачатковая форма (неазначальная форма). |
| 3. Асновы дзеяслова: цяперашняга (простага будучага) часу, інфінітыва (калі асновы інфінітыва і прошлага часу не супадаюць, назваць аснову прошлага часу). | 3. Аснова дзеяслова: цяперашняга часу, інфінітыва. |
| 4. Марфалагічныя прыметы: пераходны ці непераходны, зваротны ці незваротны, стан (залежны ці незалежны), трыванне (закончанае ці незакончанае), спражэнне (I, II, рознаспрагальны), асабовы ці безасабовы; лад (абвесны, загадны ці ўмоўны), час (цяперашні, прошлы — просты ці складаны, будучы — просты ці складаны), лік, род (для форм прошлага часу адзіночнага ліку). | 4. Марфалагічныя прыметы: пераходны або непераходны, зваротны (адзначыць, калі з'яўляецца ім), трыванне (закончанае ці незакончанае), спражэнне (I, II, рознаспрагальны), безасабовы (адзначыць, калі з'яўляецца ім); лад (абвесны, загадны ці ўмоўны), час (калі ёсць), асоба (калі ёсць), лік, род (для форм прошлага часу адзіночнага ліку). |
| 5. Сінтаксічная функцыя. | 5. Сінтаксічная роля. |

## Узоры

*I. Мы жывём пад мірным небам, заняты мірнай, стваральнай працай. (В. Б.)*

1. *Жывём* — дзеяслоў.

2. Пачатковая форма — *жыць*.

3. Аснова цяперашняга часу — *жыв'-*, аснова інфінітыва — *жы-*.

4. Непераходны, незваротны, незалежнага стану, незакончанага трывання, I спражэння, асабовы; ужыты ў абвесным ладзе, цяперашнім часе, 3-й асобе, множным ліку.

5. Выконвае функцыю выказніка.

1. *Жывём* — дзеяслоў.

2. Пачатковая форма — *жыць*.

3. Аснова цяперашняга часу — *жыв'-*, аснова інфінітыва — *жы-*.

4. Непераходны, незакончанага трывання, I спражэння; ужыты ў абвесным ладзе, цяперашнім часе, 3-й асобе, множным ліку.

5. З'яўляецца выказнікам.

*II. Белыя хмурынкі, нібы намаляваныя на блакітным палатне неба, нерухома віселі над зямлёй. (Вад.)*

1. *Віселі* — дзеяслоў.

2. Пачатковая форма — *вісець*.

3. Аснова цяперашняга часу — *віс'-*, аснова інфінітыва — *вісе-*.

4. Непераходны, незваротны, незалежнага стану, незакончанага трывання, II спражэння, асабовы; ужыты ў абвесным ладзе, прошлым часе, множным ліку.

5. Выконвае функцыю выказніка.

1. *Віселі* — дзеяслоў.

2. Пачатковая форма — *вісець*.

3. Аснова цяперашняга часу — *віс'-*, аснова інфінітыва — *вісе-*.

4. Непераходны, незакончанага трывання, II спражэння; ужыты ў абвесным ладзе, прошлым часе, множным ліку.

5. З'яўляецца выказнікам.

*III. Няхай ракеты спапяляць саміх тых, што збіраюцца цэліцца на маю зямлю. (Янк.)*

1. *Няхай спапяляць* — дзеяслоў.

2. Пачатковая форма — *спапяліць*.

3. Аснова будучага простага часу — *спапял'-*, аснова інфінітыва — *спапялі-*.

1. *Няхай спапяляць* — дзеяслоў.

2. Пачатковая форма — *спапяліць*.

3. Аснова будучага простага часу — *спапял'-*, аснова інфінітыва — *спапялі-*.

4. Пераходны, незваротны, незалежнага стану, закончанага трывання, II спражэння, асабовы; ужыты ў загадным ладзе, 3-й асобе, множным ліку.

5. Выконвае функцыю выказніка.

4. Пераходны, закончанага трывання, II спражэння; ужыты ў загадным ладзе, 3-й асобе, множным ліку.

5. З'яўляецца выказнікам.

*IV. Я нізка прад табой хілюся, мой родны край, мой любы край! (Бр.)*

1. *Хілюся* — дзеяслоў.
2. Пачатковая форма — *хіліцца.*
3. Аснова цяперашняга часу — *хіл'-(цца)*, аснова інфінітыва — *хілі-(цца).*
4. Непераходны, зваротны, незалежнага стану, незакончанага трывання, II спражэння, асабовы; ужыты ў абвесным ладзе, цяперашнім часе, 1-й асобе, адзіночным ліку.
5. Выконвае функцыю выказніка.

1. *Хілюся* — дзеяслоў.
2. Пачатковая форма — *хіліцца.*
3. —
4. Непераходны, зваротны, незакончанага трывання, II спражэння; ужыты ў абвесным ладзе, цяперашнім часе, 1-й асобе, адзіночным ліку.
5. З'яўляецца выказнікам.

**Практыкаванне 12**

Зрабіце марфалагічны разбор дзеясловаў.

1. У палескай вёсцы кіпіць, віруе жывою крыніцаю жыццё. *(В. П.)* 2. На чыстае неба выплыла воблачка. *(Лупс.)* 3. Заставайцеся ж тут шчаслівыя, мае мілыя вербачкі, і ты, неўгамонная рэчка! *(К-с)* 4. Маладыя шпакі чародкамі пералятаюць з месца на месца. *(В. В.)* 5. Буду помніць яго, камунара, буду помніць паўстанца лясоў. *(Тр.)* 6. За далёкія лясы хавалася расчырванелае сонца. *(Лупс.)* 7. Няхай жа няспынна звоняць званы ў беларускай Хатыні, і няхай заўсёды цвітуць чырвоныя ружы ў Мёртвай даліне пад Плевенам. *(Кір.)* 8. Няспынна, магутна ідзе наперад жыццё, і няспынна, чароўна мяняецца воблік роднага краю. *(Кір.)* 9. Прыйдзе вечар, стане мякка шарэць за вокнамі. *(В. А.)* 10. Зоркі тым часам тухлі на небе. *(Чыгр.)*

## ІНФІНІТЫЎ

### Пытанні

1. Што неабходна ўлічваць пры вызначэнні пачатковай формы дзеяслова?

2. Чым адрозніваецца суб'ектны інфінітыў ад аб'ектнага?

### Парадак разбору[1]

*У ВНУ*

1. Часціна мовы (нязменная форма дзеяслова).
2. Аснова інфінітыва.
3. Марфалагічныя прыметы: пераходны ці непераходны, зваротны ці незваротны, стан (залежны ці незалежны), трыванне (закончанае ці незакончанае).
4. Сінтаксічная функцыя.

*У школе*

1. Часціна мовы (нязменная форма дзеяслова).
2. Аснова інфінітыва.
3. Марфалагічныя прыметы: пераходны ці непераходны, зваротны (адзначыць, калі з'яўляецца ім), трыванне (закончанае ці незакончанае).
4. —

### Узоры

*I. Чалавекам быць — самая высокая з усіх пасад на зямлі. (П. К.)*

1. *Быць* — інфінітыў.
2. Аснова інфінітыва — *бы-*.
3. Непераходны, незваротны, незалежнага стану, незакончанага трывання.
4. Уваходзіць у склад дзейніка *чалавекам быць.*

1. *Быць* — інфінітыў.
2. Аснова інфінітыва — *бы-*.
3. Непераходны, незакончанага трывання.
4. —

---

[1] Па традыцыі ў ВНУ і школе марфалагічны разбор інфінітыва асобна не выдзяляецца. Звычайна інфінітыў характарызуецца пры марфалагічным разборы дзеяслова. Аднак у вучэбных мэтах разбор інфінітыва (як і іншых дзеяслоўных форм — дзеепрыметніка і дзеепрыслоўя) мэтазгодна выдзеліць у якасці асобнага віду граматычнага разбору.

*II. З-пад хвой-красунь, як на далоні, відаць і хаты і двары. (К-с)*

1. *Відаць* — інфінітыў.
2. Аснова інфінітыва — *віда-*.
3. Непераходны, незваротны, незалежнага стану, незакончанага трывання.
4. Выконвае функцыю выказніка.

1. *Відаць* — інфінітыў.
2. Аснова інфінітыва — *віда-*.
3. Непераходны, незакончанага трывання.
4. —

*III. І ўсё ж да Чубара даволі хутка вярнулася здольнасць разважаць. (Чыгр.)*

1. *Разважаць* — інфінітыў.
2. Аснова інфінітыва — *разважа-*.
3. Непераходны, незваротны, незакончанага трывання.
4. Выконвае функцыю недапасаванага азначэння.

1. *Разважаць* — інфінітыў.
2. Аснова інфінітыва — *разважа-*.
3. Непераходны, незакончанага трывання.
4. —

*IV. Пачаў падаць снег, густы, спорны. (Тк.)*

1. *Падаць* — інфінітыў.
2. Аснова інфінітыва — *пада-*.
3. Непераходны, незваротны, незалежнага стану, незакончанага трывання.
4. Уваходзіць у склад выказніка *пачаў падаць*.

1. *Падаць* — інфінітыў.
2. Аснова інфінітыва — *пада-*.
3. Непераходны, незакончанага трывання.
4. —

### Практыкаванне 13

Зрабіце марфалагічны разбор інфінітываў.

1. Жыць — Радзіме служыць. *(Прык.)* 2. Зноў з'явілася жаданне нешта рабіць, неадкладна, зараз жа. *(Гал.)* 3. Пачынала цямнець, неба стала густое, чорнае. *(Пташн.)* 4. Шанаваць і абараняць птушак...— абавязак

усіх юных натуралістаў і краязнаўцаў, піянераў і школьнікаў, хлапчукоў і дзяўчатак. *(В. В.)* 5. Добра чуваць быў натужны шум матора. *(Мел.)* 6. Кандрату заставалася некалькі дзесяткаў сажняў, каб дабегчы да лесу. *(К-с)* 7. Вучыцца — заўсёды згадзіцца. *(Прык.)* 8. Ля ўваходу ў станцыю стаялі, як заўсёды, людзі, што прыходзілі сустракаць брэсцкія цягнікі. *(Лыньк.)*

## ДЗЕЕПРЫМЕТНІК

### Пытанні

1. Якія дзеепрыметнікі залежнага стану прошлага часу ўтвараюцца з дапамогай суфікса *-н-*, а якія — *-ан-*?
2. У якім выпадку дзеепрыметнікі пераходзяць у прыметнікі?

### Парадак разбору

| *У ВНУ* | *У школе* |
| --- | --- |
| 1. Часціна мовы (неспрагальная форма дзеяслова). | 1. Часціна мовы (асобая форма дзеяслова). |
| 2. Пачатковая форма (назоўны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду). | 2. Пачатковая форма (назоўны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду). |
| 3. Марфалагічныя прыметы: стан, трыванне, час; лік, род (у адзіночным ліку), склон (для поўных дзеепрыметнікаў). | 3. Марфалагічныя прыметы: стан, трыванне, час; лік, род (у адзіночным ліку), склон (для поўных дзеепрыметнікаў). |
| 4. Поўны або кароткі (калі дзеепрыметнік залежнага стану). | 4. Поўны або кароткі (калі дзеепрыметнік залежнага стану). |
| 5. Спосаб утварэння (ад якой дзеяслоўнай асновы і пры дапамозе якога суфікса ўтвораны). | 5. — |
| 6. Да якога назоўніка дапасуецца. | 6. Да якога назоўніка дапасуецца. |
| 7. Сінтаксічная функцыя. | 7. Сінтаксічная роля. |

### Узоры

*I. Скончыўся лес, дарога выбегла да маладога, прысыпанага снегам жыта. (В. А.)*

1. *(Да) прысыпанага (жыта)* — дзеепрыметнік.
2. Пачатковая форма — *прысыпаны.*
3. Залежнага стану, закончанага трывання, прошлага часу; ужыты ў адзіночным ліку, ніякім родзе, родным склоне.
4. Поўны.
5. Утвораны ад асновы інфінітыва пераходнага дзеяслова закончанага трывання *прысыпаць (прысыпа-)* пры дапамозе суфікса *-н-*.
6. Дапасуецца да назоўніка *жыта.*
7. Выконвае функцыю азначэння.

1. *(Да) прысыпанага (жыта)* — дзеепрыметнік.
2. Пачатковая форма — *прысыпаны.*
3. Залежнага стану, закончанага трывання, прошлага часу; ужыты ў адзіночным ліку, ніякім родзе, родным склоне.
4. Поўны.
5. —
6. Дапасуецца да назоўніка *жыта.*
7. З'яўляецца азначэннем.

*II. Пасінелы ад ветру і марозу ліпень зусім быў не падобны на летні месяц. (Сіп.)*

1. *Пасінелы (ліпень)*— дзеепрыметнік.
2. Пачатковая форма — *пасінелы.*
3. Незалежнага стану, закончанага трывання, прошлага часу; ужыты ў адзіночным ліку, мужчынскім родзе, назоўным склоне.
4. Поўны.
5. Утвораны ад асновы інфінітыва непераходнага дзеяслова закончанага трывання *пасінець (пасіне-)* пры дапамозе суфікса *-л-*.

1. *Пасінелы (ліпень)*— дзеепрыметнік.
2. Пачатковая форма — *пасінелы.*
3. Незалежнага стану, закончанага трывання, прошлага часу; ужыты ў адзіночным ліку, мужчынскім родзе, назоўным склоне.
4. Поўны.
5. —

6. Дапасуецца да назоўніка *ліпень*.

7. Выконвае функцыю азначэння.

6. Дапасуецца да назоўніка *ліпень*.

7. З'яўляецца азначэннем.

**Практыкаванне 14**

Зрабіце марфалагічны разбор дзеепрыметнікаў.

1. Стомленыя за дзень людзі хутка паснулі. *(Лыньк.)* 2. Дарога была там і тут замецена гурбамі снегу, і конь груз, ішоў паволі. *(Мел.)* 3. Маці мітусіцца, у яе расчырванелы твар і шчаслівыя вочы. *(І. Н.)* 4. Бушуе над абшарамі сцюдзёны асенні вецер, змятае пад прызбы пажоўклае лісце. *(В. Б.)* ...Яны ўпіраліся ў сцяну велічнага, маўклівага, быццам заснуўшага лесу. *(П. К.)* 6. Млява пагойдваецца пацягнутае рэдкім туманам возера. *(Луж.)* 7. Не чула [Аксеня] шуму птушак, якім абгалошваўся абмыты дажджом сасоннік. *(Пестр.)* 8. Абапал гасцінца стаялі, як у казцы, заінелыя бярозы. *(Віт.)* 9. Крокі людзей па тупкім, утаптаным беразе аддаваліся далёка. *(Дам.)* 10. За гасцінцам млелі разморaныя спякотаю сосны... *(А. С.)* 11. Наташа ішла памалу, слухала гукі засынаючай вёскі. *(Асіп.)*

## ДЗЕЕПРЫСЛОЎЕ

### Пытанні

1. Якія асаблівасці ўтварэння дзеепрыслоўяў у беларускай мове?
2. У якіх выпадках дзеепрыслоўі пераходзяць у прыслоўі? прыназоўнікі?

### Парадак разбору

*У ВНУ*

1. Часціна мовы (нязменная форма дзеяслова).

2. Пачатковая форма (інфінітыў).

3. Марфалагічныя прыметы:

*У школе*

1. Часціна мовы (асобая нязменная форма дзеяслова).

2. Пачатковая форма (неазначальная форма).

3. Марфалагічныя прыметы:

| | |
|---|---|
| а) трыванне (незакончанае, закончанае); | а) трыванне (незакончанае, закончанае); |
| б) зваротнае ці незваротнае; | б) — |
| в) пераходнае ці непераходнае. | в) — |
| 4. Спосаб утварэння (ад якой дзеяслоўнай асновы і пры дапамозе якога суфікса ўтворана). | 4. — |
| 5. Сінтаксічная функцыя. | 5. Сінтаксічная роля. |

## Узоры

*I. Летнімі ціхімі вечарамі буслы, закідваючы ўгору галаву, клекаталі і клекаталі. (В. Г.)*

| | |
|---|---|
| 1. *Закідваючы (галаву)* — дзеепрыслоўе. | 1. *Закідваючы (галаву)* — дзеепрыслоўе. |
| 2. Пачатковая форма — *закідваць.* | 2. Пачатковая форма — *закідваць.* |
| 3. Незакончанага трывання, незваротнае, пераходнае. | 3. Незакончанага трывання. |
| 4. Утворана ад асновы цяперашняга часу дзеяслова I спражэння *закідваюць (закідвай-)* пры дапамозе суфікса *-учы* (арфаграфічна *-ючы*). | 4. — |
| 5. Разам з паясняльнымі словамі ўтварае дзеепрыслоўнае словазлучэнне, якое выступае ў функцыі акалічнасці спосабу дзеяння. | 5. — |

*II. Стаяў маладзічок у купцы тоненькіх воблачкаў, стаіўшыся, як рыбіна ў траве. (Стр.)*

| | |
|---|---|
| 1. *Стаіўшыся* — дзеепрыслоўе. | 1. *Стаіўшыся* — дзеепрыслоўе. |
| 2. Пачатковая форма — *стаіцца.* | 2. Пачатковая форма — *стаіцца.* |

| | |
|---|---|
| 3. Закончанага трывання, зваротнае, непераходнае. | 3. Закончанага трывання. |
| 4. Утворана ад асновы прошлага часу дзеяслова закончанага трывання *стаіўся (стаі-...ся)* пры дапамозе суфікса *-ўшы-*. | 4. — |
| 5. Разам з паясняльнымі словамі ўтварае дзеепрыслоўнае словазлучэнне, якое выступае ў функцыі акалічнасці спосабу дзеяння. | 5. — |

### Практыкаванне 15

Зрабіце марфалагічны разбор дзеепрыслоўяў.

1. Пасярэдзіне ракі прамчаў, уздымаючы пеністую баразну, катэр, пачуўся далёкі гудок парахода. *(І. Н.)* 2. Звечарэла. Сонца зайшло, пакінуўшы ярка-халоднае зарава. *(Хадк.)* 3. Саўка памкнуўся быў, каб устаць, але перадумаў і рашыў адказаць госцю лежачы. *(К-с)* 4. Травяністая сцежка паўз жыта, пераваліўшыся цераз сіўцовы ўзгорачак, заходзіла ў сасновы бор. *(Кір.)* 5. Хораша красуе жыта, сонца засланяючы сабой. *(Вял.)* 6. З-за гары, бліснуўшы шклом на сонца, якое ўжо заходзіла, з ровам выпаўз аўтобус. *(Б.)* 7. І днямі і начамі, не сціхаючы, гайсаў над зямлёй сухі, сіверны вецер, сунуліся нізкія шэрыя хмары. *(Мел.)* 8. Стары чалавек, нахіліўшыся на парэнчу, узіраўся ў ваду. *(Янк.)* 9. Схапіўшы сала, сініцы пырхнулі на бярозу. *(Шам.)*

## ПРЫСЛОЎЕ

### Пытанні

1. Як адрозніць прыслоўі з прыстаўкамі ад аманімічных назоўнікаў, лічэбнікаў і займеннікаў з прыназоўнікамі? ад форм творнага склону назоўнікаў без прыназоўнікаў?
2. У якія часціны мовы могуць пераходзіць прыслоўі?

## Парадак разбору

| *У ВНУ* | *У школе* |
| --- | --- |
| 1. Часціна мовы. | 1. Часціна мовы. |
| 2. Разрад паводле значэння: азначальнае (якаснае, колькаснае) ці акалічнаснае (месца, часу, прычыны, мэты). | 2. Разрад паводле значэння: меры і ступені, спосабу дзеяння, месца, часу, прычыны, мэты. |
| 3. Ступень параўнання (калі ёсць: вышэйшая, найвышэйшая — простая ці складаная). | 3. Ступень параўнання (калі ёсць: вышэйшая ці найвышэйшая). |
| 4. Форма ацэнкі і меры якасці (калі ёсць). | 4. — |
| 5. Спосаб утварэння (ад якой часціны мовы і з дапамогай якога сродку). | 5. — |
| 6. Сінтаксічная функцыя. | 6. Сінтаксічная роля. |

## Узоры

*I. Убіраючы неба ў чырвань, зарыва палыхала ўсё шырэй і шырэй. (Лыньк.)*

| | |
| --- | --- |
| 1. *(Палыхала) шырэй* — прыслоўе. | 1. *(Палыхала) шырэй* — прыслоўе. |
| 2. Азначальнае (якаснае). | 2. Спосабу дзеяння. |
| 3. Мае простую форму вышэйшай ступені параўнання. | 3. Мае форму вышэйшай ступені параўнання. |
| 4. — | 4. — |
| 5. Форма ўтворана ад прыслоўя *шырока* з дапамогай суфікса *-эй* (суфікс *-ок-* пры гэтым выпадае). | 5. — |
| 6. Выконвае функцыю акалічнасці спосабу дзеяння. | 6. З'яўляецца акалічнасцю. |

*II. Назаўтра была цудоўная сонечная раніца. (Ракіт.)*

1. *Назаўтра (была цудоўная)* — прыслоўе.
2. Акалічнаснае (часу).
3. —
4. —
5. Утворана ад прыслоўя *заўтра* пры дапамозе прыстаўкі *на-*.
6. Выконвае функцыю акалічнасці спосабу дзеяння.

1. *Назаўтра (была цудоўная)* — прыслоўе.
2. Са значэннем часу.
3. —
4. —
5. —
6. З'яўляецца акалічнасцю.

**Практыкаванне 16**

Зрабіце марфалагічны разбор прыслоўяў.

1. Ноч спакваля ахінала зямлю. *(Асіп.)* 2. Тым часам зусім развіднела, узышло сонца. *(Сач.)* 3. Коні на ўзгорку прыцішылі бег, пайшлі спакайней. *(Мел.)* 4. Андрэй знарок ішоў павольна. *(Пестр.)* 5. Цішыня стаяла ўсюды: і ля хаты, і на пасецы, і на балоце... *(Пташн.)* 6. Як толькі прамоўца сеў на сваё месца, сусед справа павярнуў да яго галаву і шапнуў... *(Янк.)* 7. Над ракою па-ранейшаму дыміўся цёплы туман. *(Чыгр.)* 8. Дзялілі лужок найчасцей у нядзелю пад вечар. *(Б.)* 9. Люблю пазіраць я на поле вясной... *(К-с)* 10. Усё смялей наступала вясна. *(Сач.)* 11. А каля печы будзе ўпраўляцца маці — ціхенька, мусіць, каб не разбудзіць цябе. *(В. А.)* 12. Няхай не сціхаюць, заўсёды гучаць у вашых сэрцах гаротныя і трывожныя званы Хатыні. *(Мел.)*

## БЕЗАСАБОВА-ПРЭДЫКАТЫЎНЫЯ СЛОВЫ

### Пытанні

1. Якія граматычныя прыметы безасабова-прэдыкатыўных слоў?
2. Як адрозніць безасабова-прэдыкатыўныя словы ад аманімічных прыслоўяў, назоўнікаў і кароткіх прыметнікаў?

## Парадак разбору ў ВНУ[1]

1. Часціна мовы.

2. Разрад паводле паходжання (суадносін з іншымі часцінамі мовы): невытворнае — толькі безасабова-прэдыкатыўнае або вытворнае — суадноснае з прыслоўем, прыметнікам, назоўнікам, дзеясловам.

3. Лексіка-семантычны разрад (абазначае псіхічны або фізічны стан чалавека, стан прыроды, ацэнку стану, меру чаго-небудзь і інш.).

4. Форма ступені параўнання (калі ёсць): вышэйшая, найвышэйшая — простая ці складаная.

5. Форма ацэнкі і меры (калі ёсць).

6. Сінтаксічная функцыя.

### Узоры

*I. На дварэ было вельмі холадна. (Мел.)*

1. *Холадна* — безасабова-прэдыкатыўнае слова.
2. Вытворнае (суадноснае з прыметнікам *халодны*).
3. Абазначае стан прыроды.
4. —
5. —
6. Уваходзіць у склад выказніка *было холадна.*

*II. Трэба было дачакацца раніцы, каб пераправіцца праз раку. (Лыньк.)*

1. *Трэба* — безасабова-прэдыкатыўнае слова.
2. Невытворнае.
3. Абазначае неабходнасць дзеяння.
4. —
5. —
6. Уваходзіць у склад выказніка *трэба было дачакацца.*

#### Практыкаванне 17

Зрабіце марфалагічны разбор безасабова-прэдыкатыўных слоў.

1. У дрымотнай душы было то неспакойна, то клопатна, то радасна. *(Мел.)* 2. Трэба дома бываць часцей, трэба дома бываць не госцем... *(Р. Б.)* 3. У полі было куды халадней, чым у лесе. *(В. Б.)* 4. Пасля спякотнага дня на верхняй палубе холадна. *(Б.)* 5. Здавалася, яшчэ ні-

[1] У школе гэтыя словы разглядаюцца ў складзе прыслоўяў як іх асобая група.

колі не было так добра і радасна, як сёння. *(Асіп.)* 6. Слядоў дарогі было многа. *(Скр.)* 7. Кіламетры праз тры пачаўся лес, і тут адразу стала спакойна і ціха. *(Скр.)* 8. Было цёпла, але не горача. *(Карп.)* 9. На душы было радасна. *(Як.)* 10. Весела было на школьным двары. *(М. Г.)* 11. Да майго слыху даляталі толькі адны галасы, слоў жа разабраць было нельга. *(М. Н.)*

## ПРЫНАЗОЎНІК

### Пытанні

1. Як адрозніць вытворныя прыназоўнікі ад аманімічных прыслоўяў? дзеепрыслоўяў? назоўнікаў з невытворнымі прыназоўнікамі і без іх?

2. Ад якіх фактараў залежыць значэнне прыназоўнікаў (прыназоўнікавых спалучэнняў)?

### Парадак разбору

| *У ВНУ* | *У школе* |
|---|---|
| 1. Часціна мовы. | 1. Часціна мовы. |
| 2. Разрад паводле паходжання (суадносін з іншымі часцінамі мовы): невытворны або вытворны — ад якой часціны мовы паходзіць. | 2. Разрад паводле ўтварэння: невытворны або вытворны. |
| 3. Разрад па структуры: просты, складаны, састаўны. | 3. Разрад паводле складу: просты, складаны, састаўны. |
| 4. Тып выражаных адносін: прасторавыя, часавыя, аб'ектныя, азначальныя, прычынныя, мэты, спосабу дзеяння, меры і ступені, сумеснасці. | 4. — |
| 5. З якім склонам залежнага назоўніка ўжыты ў сказе. | 5. З якім склонам ужыты. |

### Узоры

*I. Над вёскаю стаяла празрыстае глыбокае неба. (Лупс.)*

| | |
|---|---|
| 1. *Над (вёскаю)* — прыназоўнік. | 1. *Над (вёскаю)* — прыназоўнік. |
| 2. Невытворны. | 2. Невытворны. |
| 3. Просты. | 3. Просты. |
| 4. Выражае прасторавыя адносіны. | 4. — |
| 5. Ужыты з творным склонам залежнага назоўніка. | 5. Ужыты з творным склонам назоўніка. |

*II. Сонца, ахутанае шэраю смугою, нясмела і ленавата ўставала з-за лесу... (Бр.)*

| | |
|---|---|
| 1. *З-за (лесу)* — прыназоўнік. | 1. *З-за (лесу)* — прыназоўнік. |
| 2. Невытворны. | 2. Невытворны. |
| 3. Складаны. | 3. Складаны. |
| 4. Выражае прасторавыя адносіны. | 4. Выражае прасторавыя адносіны. |
| 5. Ужыты з родным склонам залежнага назоўніка. | 5. Ужыты з родным склонам назоўніка. |

### Практыкаванне 18

Зрабіце марфалагічны разбор прыназоўнікаў.

1. Скрозь галіны дрэў скупа прабіваўся тужлівы бляск месяца. *(К-с)* 2. Расплываўся з-за краявіду сiнаваты змрок... *(В. Б.)* 3. Праз завейную непагадзь цяжка было ўгадаць, на якой адлегласці ад іх быў гэты хутар. *(В. Б.)* 4. Абапал шляху цесна стаялі елкі, шумелі, гулі ў ветранай высі іх верхавіны. *(В. Б.)* 5. Выехалі з-пад маскоўскага аэрадрома мы вечарам... *(І. Н.)* 6. Сонца зайшло, і пачалося змярканне — ціхае, свежае, з расой і камарамі. *(Б.)* 7. Дзякуючы камсамольцам удалося дастаць супрацьтанкавую гарматку. *(Б.)* 8. Пад поўдзень выбівалася з туману сонца, трава і дрэвы яснелі... *(К. Ч.)* 9. Твар яе [Гэлі] быў мокры, з-пад сіняй хусцінкі выбілася, апусціўшыся на лоб, пасмачка русявых валасоў. *(І. Н.)* 10. Мне вядома, чаму ты не спіш па начах, а за думкамі следам вандруеш далёка... *(Бр.)* 11. Насустрач з ровам несліся цяжкія самазвалы. *(Янк.)*

## ЗЛУЧНІК

### Пытанні

1. Як адрозніць злучнікі ад аманімічных адносных займеннікаў, прыслоўяў, часціц?
2. Якое адрозненне паміж простымі невытворнымі і вытворнымі злучнікамі?

### Парадак разбору

| *У ВНУ* | *У школе* |
|---|---|
| 1. Часціна мовы. | 1. Часціна мовы. |
| 2. Разрад паводле паходжання (суадносін з іншымі часцінамі мовы): невытворны ці вытворны — ад якой часціны мовы паходзіць. | 2. — |
| 3. Разрад з улікам структуры: просты ці састаўны. | 3. Разрад паводле складу: просты ці састаўны. |
| 4. Разрад паводле спосабу ўжывання: адзіночны, паўторны ці парны. | 4. Разрад паводле спосабу ўжывання: адзіночны, паўторны ці парны. |
| 5. Разрад паводле функцыянальнага значэння: злучальны ці падпарадкавальны (тып з улікам выражаных адносін). | 5. Разрад паводле значэння: злучальны ці падпарадкавальны. |
| 6. Якія сінтаксічныя адзінкі звязвае (члены сказа, часткі складанага сказа, самастойныя сказы). | 6. — |

### Узоры

*I. Свяціла сонца, звінелі недзе нябачныя птушкі — дзень быў цёплы і ясны. (В. Г.)*

| | |
|---|---|
| 1. *I* — злучнік. | 1. *I* — злучнік. |
| 2. Невытворны. | 2. — |

3. Прості.
4. Адзіночны.
5. Злучальны (спалучальны).
6. Звязвае аднародныя члены сказа.

3. Прості.
4. Адзіночны.
5. Злучальны (спалучальны).
6. —

*II. ...Адразу ўсюды ўсе пазнаюць, што ты савецкі чалавек. (Бр.)*

1. *Што* — злучнік.
2. Вытворны (паходзіць ад займенніка *што*).
3. Просты.
4. Адзіночны.
5. Падпарадкавальны (тлумачальны).
6. Звязвае часткі складаназалежнага сказа.

1. *Што* — злучнік.
2. —
3. Просты.
4. Адзіночны.
5. Падпарадкавальны (тлумачальны).
6. —

*III. Для таго каб праца давала плённыя вынікі, трэба прывучаць да сталых і сур'ёзных адносін да яе з маладых гадоў. (К-с)*

1. *Для таго каб* — злучнік.
2. Вытворны (паходзіць ад спалучэння прыназоўніка *для*, займенніка *таго* і простага злучніка *каб*).
3. Састаўны.
4. Адзіночны.
5. Падпарадкавальны (мэтавы).
6. Звязвае часткі складанага сказа.

1. *Для таго каб* — злучнік.
2. —
3. Састаўны.
4. Адзіночны.
5. Падпарадкавальны (мэтавы).
6. —

**Практыкаванне 19**

Зрабіце марфалагічны разбор злучнікаў.

1. Спакваля змрок зусім затуліў пакой, толькі ўсё яшчэ бялела ля парога печ ды шарэлі вокны. *(В. Б.)* 2. Птушкі ўжо не спявалі, бо наступіла восень. *(І. Н.)* 3. І здаля, з цеплахода, трава здаецца не зялёная, а сівая, шызая. *(Сач.)* 4. Толькі там, дзе працякала туман-

ная рака Млечнага Шляху, зоркі былі цьмяныя і мільгалі не так ярка. *(Шам.)* 5. Той год зіма была голая, снег лажыўся некалькі разоў, ды ненадоўга — раставаў, балота ўсё заліло вадою. *(Дам.)* 6. Праз чвэрць гадзіны наперадзе, мусіць, у лагчынцы, зашарэла нейкае кустоўе — лаза ці які хмызняк па-над рачулкай. *(В. Б.)* 7. Хвоі шумелі так, быццам, ім адным было вядома, што будзе заўтра на возеры Доўгім. *(Бр.)* 8. Насустрач дзьмуў пругкі, не моцны, але марозлівы вецер... *(В. Б.)* 9. Свяціла сонца, снег гарэў і пераліваўся залатымі бляскамі. *(І. Н.)* 10. Радасць напаўняе сэрца, і яшчэ больш хочацца зрабіць, каб аддзячыць за ўсё шчасце сваёй дарагой Радзіме. *(Кір.)*

## ЧАСЦІЦЫ

### Пытанні

1. Чым адрозніваюцца ўласна часціцы ад утвораных на іх аснове часціц-афіксаў — прыставак або постфіксаў?
2. Як адрозніць часціцы ад аманімічных займеннікаў, прыслоўяў, асобных форм дзеясловаў?

### Парадак разбору

| *У ВНУ* | *У школе* |
| --- | --- |
| 1. Часціна мовы. | 1. Часціна мовы. |
| 2. Разрад паводле паходжання (суадносін з іншымі часцінамі мовы): невытворныя ці вытворныя — ад якой часціны мовы паходзяць. | 2. — |
| 3. Разрад з улікам структуры: простыя ці састаўныя. | 3. — |
| 4. Лексіка - функцыянальны разрад: сэнсавыя (узмацняльныя, азначальна-ўдакладняльныя, выдзяляльна - абмежавальныя), мадальныя (сцвярджальныя, адмоўныя, пытальныя, параўнальныя, | 4. Разрад паводле значэння: сэнсавыя (указальныя, выдзяляльна-абмежавальныя), мадальныя (сцвярджальныя, адмоўныя, пытальныя, пабуджальныя), эмацыянальныя (клічныя, узмацняль- |

пабуджальныя), эмацыянальна - экспрэсіўныя (клічныя, узмацняльныя) ці словаўтваральныя і формаўтваральныя.

5. Роля часціц (надаюць сэнсавае, мадальнае ці экспрэсіўнае адценне слову, словазлучэнню, сказу або служаць для ўтварэння форм слова).

ныя) ці формаўтваральныя.

5. Роля часціц (выражаюць абмежаванне, пажаданне, сцвярджэнне, пытанне, пачуцці ці служаць для ўтварэння форм слова).

## Узоры

*I. Маленства! Як бясконца дарага яно кожнаму! (Гр.)*

1. *Як* — часціца.
2. Вытворная (паходзіць ад прыслоўя *як*).
3. Простая.
4. Эмацыянальна-экспрэсіўная (клічная).
5. Надае сказу экспрэсіўную афарбоўку (выражае пачуццё захаплення).

1. *Як* — часціца.
2. —
3. Простая.
4. Эмацыянальная (клічная).
5. Выражае захапленне.

*II. Няхай жывуць непарушнае інтэрнацыянальнае адзінства і брацкая дружба народаў СССР! (з Заклікаў ЦК КПСС)*

1. *Няхай* — часціца.
2. Невытворная.
3. Простая.
4. Мадальная (пабуджальная).
5. Служыць для ўтварэння формы дзеяслова загаднага ладу 3-й асобы.

1. *Няхай* — часціца.
2. —
3. Простая.
4. Мадальная (пабуджальная).
5. Служыць для ўтварэння формы дзеяслова 3-й асобы загаднага ладу.

### Практыкаванне 20

Зрабіце марфалагічны разбор часціц.

1. Ад завеі не было відаць агнёў нават недалёкіх вёсак... *(Мел.)* 2. Слаў жа ты, песня, дзень радасны свята. *(М. Т.)* 3. І адразу гучней заспявалі перапёлкі ў полі... *(Лупс.)* 4. Гэта Ленін навучыў, каб народ шчасліва

жыў. *(Прык.)* 5. Сонца стаяла якраз на ўсходнім небакраі — там, дзе яно і павінна быць уранні. *(Хомч.)* 6. ...Зямля пачала прасыхаць, была мяккаватая і як быццам цёплая. *(Кудр.)* 7. Касіць яны [мужчыны] будуць аж дацямна, пакуль не ляжа на луг густы туман. *(Пташн.)* 8. Цягнік спыняецца на гэтай станцыі ўсяго на адну хвіліну. *(Корб.)* 9. У зямлянцы сапраўды было цёпла, пахла свежавыпечаным хлебам. *(У. К.)* 10. Няхай дзіця ўбачыць, адкрые для сябе родныя вобразы прыроды, сваёй зямлі — тады ў яго сэрца і памяць назаўсёды ўвойдзе і вобраз Радзімы. *(Віт.)*

## МАДАЛЬНЫЯ СЛОВЫ

### Пытанні

1. Як адрозніць мадальныя словы ад аманімічных назоўнікаў, прыметнікаў, прыслоўяў, дзеясловаў?

2. Якія пабочныя словы нельга адносіць да мадальных?

### Парадак разбору ў ВНУ[1]

1. Часціна мовы.

2. Разрад паводле значэння: выражаюць упэўненасць, перакананне, сцвярджэнне; перадаюць няўпэўненасць, меркаванне, сумненне.

3. Разрад паводле паходжання (суадносін з іншымі часцінамі мовы): невытворныя ці вытворныя — ад якой часціны мовы паходзяць.

4. Сінтаксічная функцыя.

### Узоры

*I. Мусіць, няма на свеце лепшай асалоды, чым тая, якую дорыць душы чалавека песенны перадвячэрні лес. (Кір.)*

1. *Мусіць* — мадальнае слова.
2. Выражае няўпэўненасць, меркаванне.
3. Вытворнае, суадноснае з дзеясловам *мусіць*.
4. Выступае як пабочнае слова.

---

[1] У школе мадальныя словы як часціна мовы не выдзяляюцца.

*II. Канечне, вельмі добра ведаць мову суседзяў, але найперш трэба ведаць сваю. (Ар.)*

1. *Канечне* — мадальнае слова.
2. Выражае ўпэўненасць, перакананне.
3. Вытворнае, суадноснае з прыслоўем.
4. Выступае як пабочнае слова.

**Практыкаванне 21**

Зрабіце марфалагічны разбор мадальных слоў.

1. Хацелася мне, вядома, пачуць ад Коласа нешта незвычайнае, важнае. *(Б.)* 2. Дзядзька, мусіць, прыслухоўваўся да размовы. *(Мел.)* 3. Неба цёмнае апусцілася, і хмары, здаецца, па зямлі сцелюцца. *(Янк.)* 4. Лес зімнюю песню спявае, ён тужыць, відаць, па вясне. *(Астр.)* 5. Цяга да выключнага, дзіўнага, мабыць, у самой прыродзе чалавечай. *(І. Н.)* 6. Па гэтай лагчыне некалі даўным-даўно, можа, калі і бору яшчэ не было, цякла вялікая рэчка... *(Ж.)* 7. Цяжкае, халоднае, свінцовае неба, здавалася, назаўсёды ўпала на зямлю. *(Сіп.)* 8. Мы, сапраўды, ляцелі між хмар. *(Гр.)* 9. Бадай, нідзе так праўдзіва не гучыць народная прымаўка «Якое жыццё — такія песні», як у сяле Азёршчына. *(Мяж.)*

## ВЫКЛІЧНІКІ

### Пытанні

1. Што агульнае і што рознае паміж выклічнікамі і гукапераймальнымі словамі?
2. Як адрозніць выклічнікі ад аманімічных слоў іншых часцін мовы (назоўнікаў, дзеясловаў)?

### Парадак разбору

| *У ВНУ* | *У школе* |
|---|---|
| 1. Часціна мовы. | 1. Часціна мовы. |
| 2. Разрад з улікам паходжання (суадносін з іншымі часцінамі мовы): невытворны ці вытворны — ад якой часціны мовы паходзіць. | 2. — |

3. Разрад паводле значэння: эмацыянальны, валевыяўленчы ці моўнага этыкету (што выражае).

3. Якія пачуцці і пабуджэнні выражае: радасць, захапленне, здзіўленне, гора, страх і інш.; заклік, зварот, загад, прывітанне, развітанне, падзяку і інш.

## Узоры

*I. О, каб я меў такія рукі, зямля, абняў бы я цябе. (К-с)*

1. *О* — выклічнік.
2. Невытворны.
3. Эмацыянальны (выражае жаданне з адценнем жалю).

1. *О* — выклічнік.
2. —
3. Выражае жаданне з адценнем жалю.

*II. ...Добры дзень, аснежныя прасторы, добры дзень, сталіца хараства! (Тр.)*

1. *Добры дзень* — выклічнік.
2. Вытворны (паходзіць ад спалучэння прыметніка *добры* і назоўніка *дзень*).
3. Са значэннем моўнага этыкету (выражае прывітанне).

1. *Добры дзень* — выклічнік.
2. —
3. Выражае прывітанне.

### Практыкаванне 22

Зрабіце марфалагічны разбор выклічнікаў.

1. Эх, як прывольны прасторы наднёманскіх лугоў! *(К-с)* 2. «Можна было б пабыць тут і болей, каб не экзамены,— сказаў Лабановіч.— Гайда, хлопцы, у дарогу!» *(К-с)* 3. «Эге ж!» — азываецца дзед Талаш, а вочы яго пазіраюць кудысь углыб. *(К-с)* 4. О, як бы нам хацелася зрабіць навекі мір для роднае краіны. *(Панч.)* 5. Дзякуй вам, мой настаўнік. І я навучыўся не забываць сваіх былых вучняў, студэнтаў. *(Янк.)* 6. «О, дзед! — казала Талашова суседка.— Ён кацяняці чужога за свой век не спалохаў». *(Янк.)* 7. Ой, як хацелася тады прыпасці да

яе [матчыных] рук. *(У. К.)* 8. Стоп. На момант спынімся. *(У. М.)* 9. Даруй мне, маці, што пароюо табе прыносіў шмат турбот. *(Пр.)* 10. О, ляціце, журавы, ляціце сваёй млечнай дарогай, вясёлай і шумнай, бы карагод. *(Стр.)* 11. «Стой!» — кінуўся напярэймы Васілец. *(Хомч.)*

## СІНТАКСІЧНЫ РАЗБОР

Асноўным аб'ектам сінтаксічнага разбору з'яўляецца словазлучэнне і сказ. Сінтаксічны разбор прадугледжвае структурна-семантычную характарыстыку розных тыпаў словазлучэнняў і сказаў (простых, складаных, сказаў з простай мовай), вызначэнне відаў сінтаксічнай сувязі паміж словамі ў словазлучэннях і часткамі складаных сказаў.

Разбор сказаў, як і іншых моўных адзінак, неабходна праводзіць у пэўнай паслядоўнасці — спачатку разглядаюцца найбольш агульныя прыметы, затым прыватныя (канкрэтныя). Так, пры разборы простых сказаў трэба ўстанавіць тып сказаў па мэце выказвання, эмацыянальнай афарбоўцы, колькасці прэдыкатыўных адзінак, ступені развітасці, паўнаты, затым праводзіць разбор па членах сказа, дзе неабходна ўказаць, якой часцінай мовы выражаны той або іншы член сказа, а таксама вызначыць від сінтаксічнай сувязі паміж словамі. Характарыстыка складанага сказа даецца адпаведна агульнай структуры, затым яго састаўных частак.

На аснове сінтаксічнага разбору можна праводзіць разбор пунктуацыйны.

### СЛОВАЗЛУЧЭННЕ

Пры разборы словазлучэння вызначаецца яго структура, тып паводле марфалагічнага выражэння галоўнага і залежнага слоў, сінтаксічныя адносіны паміж кампанентамі, сродкі сувязі слоў.

Асобна вылучаецца спалучэнне дзейніка і выказніка, адасобленыя члены з азначаемым словам, аднародныя члены сказа [1].

---

[1] У навуковай літаратуры спалучэнне дзейніка і выказніка часта называюць прэдыкатыўным словазлучэннем; адасоблены член сказа з азначаемым словам — паўпрэдыкатыўным словазлучэннем; аднародныя члены сказа — спалучальным словазлучэннем. У школьнай практыцы такія спалучэнні не разглядаюцца як словазлучэнні.

Разбор словазлучэння ў сказе мэтазгодна пачынаць з выдзялення і аналізу прэдыкатыўнага ядра, граматычнай асновы.

Пры выяўленні сінтаксічных адносін (граматычнага значэння) паміж кампанентамі словазлучэння неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на субстантыўныя словазлучэнні (з галоўным словам назоўнікам), у якіх сінтаксічная функцыя залежных слоў не супадае з іх катэгарыяльнымі значэннямі. Сінтаксічныя адносіны ў такіх словазлучэннях можна выявіць шляхам замены залежнага слова аднакарэнным прыметнікам або тоеснай канструкцыяй (дзеепрыметнікавым словазлучэннем, даданай часткай): *кніга з бібліятэкі — бібліятэчная кніга, цішыня ўначы — начная цішыня, альтанка пад гарой — альтанка, размешчаная пад гарой.*

Пры размежаванні прымыкання і слабага кіравання (улічваючы пэўныя цяжкасці) неабходна карыстацца наступным: калі да залежнага слова нельга паставіць склонавага пытання, то яно (залежнае слова) звязана з галоўным спосабам прымыкання *(паўзці змяёй, пайсці ў госці, стаяць насмерць)* [1].

## Пытанні

1. Што агульнае паміж словам і словазлучэннем і што адрознівае іх?
2. Як адрозніць моцнае кіраванне ад слабага?
3. Як праяўляецца ў словазлучэнні спецыфіка беларускай мовы?

## Парадак разбору

| *У ВНУ* | *У школе* |
|---|---|
| 1. Выдзеліць словазлучэнне са сказа. | 1. Выдзеліць словазлучэнне са сказа. |
| 2. Простае ці складанае словазлучэнне. | 2. — |
| 3. Назваць галоўнае і залежнае словы. | 3. Назваць галоўнае і залежнае словы. |
| 4. Пачатковая форма словазлучэння. | 4. — |
| 5. Тып словазлучэння паводле выражэння галоўнага і залежнага слоў: | 5. Якімі часцінамі мовы выражаны галоўнае і залежнае словы. |

[1] Такая сувязь можа разглядацца як іменнае прымыканне.

| | |
|---|---|
| іменнае — субстантыўнае з залежным словам назоўнікам, займеннікам, лічэбнікам, прыслоўем, дзеясловам; прыметнікавае з залежным словам назоўнікам, займеннікам, лічэбнікам; лічэбнікавае з залежным словам назоўнікам; займеннікавае з залежным словам назоўнікам; дзеяслоўнае з залежным словам назоўнікам, займеннікам, прыслоўем; прыслоўнае з залежным словам назоўнікам, прыслоўем, займеннікам. | |
| 6. Сінтаксічныя адносіны паміж кампанентамі словазлучэння: атрыбутыўныя, аб'ектныя, акалічнасныя (ці адвербіяльныя): прасторавыя (месца), часавыя, прычынныя, азначальна-акалічнасныя, колькасныя (меры і ступені) і інш. | 6. Граматычнае значэнне словазлучэння. |
| 7. Віды сінтаксічнай сувязі: дапасаванне (поўнае, няпоўнае), кіраванне (прыназоўнікавае, беспрыназоўнікавае, моцнае, слабае), прымыканне (якая часціна мовы прымыкае). | 7. Спосаб сінтаксічнай сувязі: дапасаванне, кіраванне, прымыканне. |
| 8. Сродкі выражэння граматычнай сувязі слоў: форма слова (канчатак), службовае слова (прыназоўнік, злучнік), парадак слоў, сэнсавая залежнасць. | 8. — |

## Узоры

*I. Мірна і ціха шасцелі лісцем старыя яблыні. (І. Н.)*

| | |
|---|---|
| *Яблыні шасцелі* — граматычная аснова, прэдыкатыўнае словазлучэнне[1]. Сувязь паміж дзейнікам і выказнікам — поўнае дапасаванне, выказнік дапасуецца да дзейніка ў ліку[2]; сродак граматычнай сувязі — форма слова (канчатак -*і*). | *Яблыні шасцелі* — граматычная аснова (дзейнік і выказнік). |
| 1. *Старыя яблыні* — словазлучэнне. | 1. *Старыя яблыні* — словазлучэнне. |
| 2. Простае. | 2. — |
| 3. Галоўнае слова — назоўнік *яблыні*, залежнае — прыметнік *старыя.* | 3. Галоўнае слова — *яблыні*, залежнае — *старыя.* |
| 4. Пачатковая форма — *старая яблыня.* | 4. — |
| 5. Словазлучэнне іменнае, субстантыўнае з залежным словам прыметнікам. | 5. Галоўнае слова выражана назоўнікам, залежнае — прыметнікам. (Словазлучэнне мае будову: прыметнік+назоўнік.) |
| 6. Адносіны паміж словамі атрыбутыўныя: называюць прадмет і яго прымету. | 6. Граматычнае значэнне словазлучэння: абазначае прадмет і яго прымету. |
| 7. Сувязь слоў — дапасаванне, поўнае (залежнае слова дапасуецца да галоўнага ў ліку і склоне). | 7. Спосаб сінтаксічнай сувязі — дапасаванне. |
| 8. Сродак выражэння граматычнай сувязі — форма слова (канчатак -*ыя*). | 8. — |

---

[1] У такіх словазлучэннях адносіны паміж кампанентамі прэдыкатыўныя і разглядаюцца ў сінтаксісе сказа.

[2] Дапасаванне дзейніка-імя і выказніка-дзеяслова ў навуковай літаратуры называюць каардынацыяй.

| | |
|---|---|
| 1. *Шасцелі лісцем* — словазлучэнне. | 1. *Шасцелі лісцем* — словазлучэнне. |
| 2. Простае. | 2. — |
| 3. Галоўнае слова — дзеяслоў *шасцелі*, залежнае — назоўнік *лісцем.* | 3. Галоўнае слова — *шасцелі*, залежнае — *лісцем.* |
| 4. Пачатковая форма — *шасцець лісцем.* | 4. — |
| 5. Словазлучэнне дзеяслоўнае з залежным словам назоўнікам. | 5. Галоўнае слова выражана дзеясловам, залежнае назоўнікам. (Словазлучэнне мае будову: $\overset{\times}{\text{дзеяслоў}}$+назоўнік.) |
| 6. Адносіны паміж словамі аб'ектныя: называюць дзеянне і прадмет, якім утвараецца дзеянне. | 6. Граматычнае значэнне словазлучэння: абазначае дзеянне і прадмет, якім утвараецца дзеянне. |
| 7. Сувязь слоў — кіраванне, беспрыназоўнікавае, моцнае. | 7. Спосаб сінтаксічнай сувязі — кіраванне. |
| 8. Сродак выражэння граматычнай сувязі — форма слова (канчатак *-ем*). | 8. — |
| 1. *Шасцелі* [*мірна і ціха*] [1] — словазлучэнне. | 1. *Шасцелі* [*мірна і ціха*] — словазлучэнне. |
| 2. Простае. | 2. — |
| 3. Галоўнае слова — дзеяслоў *шасцелі*, залежнае — прыслоўі [*мірна і ціха*]. | 3. Галоўнае слова — *шасцелі*, залежнае — прыслоўі [*мірна і ціха*]. |
| 4. Пачатковая форма — *шасцець* [*мірна і ціха*]. | 4. — |
| 5. Словазлучэнне дзеяслоўнае, у якасці залежнага члена — спалучальны рад прыслоўяў. | 5. Галоўнае слова выражана дзеясловам, залежнае — прыслоўямі. (Словазлучэнне мае будову: $\overset{\times}{\text{дзеяслоў}}$+[прыслоўе і прыслоўе].) |

[1] Аднародныя члены сказа з'яўляюцца адным кампанентам словазлучэння; звязаны паміж сабой злучальнай сувяззю.

6. Адносіны паміж словамі азначальна-акалічнасныя: называюць дзеянне і яго прымету.

7. Сувязь слоў — прымыканне (да дзеяслова прымыкаюць прыслоўі [*мірна, ціха*]).

8. Сродак выражэння сувязі — сэнсавая залежнасць.




6. Граматычнае значэнне словазлучэння: абазначае дзеянне і яго прымету.

7. Спосаб сінтаксічнай сувязі — прымыканне (залежнае слова звязваецца з галоўным толькі сэнсам).

8. —




*II. Сонца падымалася вышэй, рупліва аглядаючы зямлю. (Хадк.)*

*Сонца падымалася* — граматычная аснова (прэдыкатыўнае словазлучэнне). Сувязь паміж дзейнікам і выказнікам — поўнае дапасаванне, выказнік дапасуецца да дзейніка ў родзе і ліку.

1. *Падымалася вышэй* — словазлучэнне.

2. Простае.

3. Галоўнае слова — дзеяслоў *падымалася*, залежнае — прыслоўе *вышэй.*

4. Пачатковая форма — *падымацца вышэй.*

5. Словазлучэнне дзея-

*Сонца падымалася* — граматычная аснова (дзейнік і выказнік).

1. *Падымалася вышэй* — словазлучэнне.

2. —

3. Галоўнае слова — *падымалася*, залежнае — *вышэй.*

4. —

5. Галоўнае слова вы-

| | |
|---|---|
| слоўнае з залежным словам прыслоўем. | ражана дзеясловам, залежнае — прыслоўем. (Будова словазлучэння: × дзеяслоў + прыслоўе.) |
| 6. Адносіны наміж словамі акалічнасныя: называюць дзеянне і ступень прыметы (якасць). | 6. Граматычнае значэнне словазлучэння: абазначае дзеянне і яго прымету. |
| 7. Сувязь паміж словамі — прымыканне, да галоўнага слова прымыкае прыслоўе. | 7. Спосаб сінтаксічнай сувязі — прымыканне. |
| 8. Сродак граматычнай сувязі — сэнсавая залежнасць. | 8. — |
| 1. *Аглядаючы зямлю* — словазлучэнне [1]. | 1. *Аглядаючы зямлю* — словазлучэнне [1]. |
| 2. Простае. | 2. — |
| 3. Галоўнае слова — дзеепрыслоўе *аглядаючы*, залежнае — назоўнік *зямлю*. | 3. Галоўнае слова — *аглядаючы*, залежнае — *зямлю*. |
| 4. Пачатковая форма *аглядаць зямлю*. | 4. — |
| 5. Словазлучэнне дзеяслоўнае з залежным словам назоўнікам. | 5. Галоўнае слова выражана дзеепрыслоўем, залежнае — назоўнікам. (Будова словазлучэння: × дзеепрыслоўе + назоўнік.) |
| 6. Адносіны паміж словамі словазлучэння аб'ектныя: называюць дадатковае дзеянне і прадмет, на які непасрэдна накіравана дзеянне. | 6. Граматычнае значэнне словазлучэння: называе дадатковае дзеянне і прадмет, на які яно накіравана. |
| 7. Сувязь слоў у словазлучэнні — кіраванне, | 7. Сувязь слоў у словазлучэнні — кіраванне. |

[1] Спалучэнне *падымалася, аглядаючы зямлю* нельга назваць словазлучэннем, паколькі дзеепрыслоўе абазначае дзеянне (хоць і дадатковае), выступае ў сказе ў ролі другараднага выказніка, суадносіцца з той жа асобай, што і дзеяслоў-выказнік (*сонца падымалася і аглядала зямлю*).

| | |
|---|---|
| беспрыназоўнікавае, моцнае. | |
| 8. Сродак выражэння граматычнай сувязі — форма слова (канчатак *-ю*). | 8. — |
| 1. *Рупліва аглядаючы* — словазлучэнне. | 1. *Рупліва аглядаючы* — словазлучэнне. |
| 2. Простае. | 2. — |
| 3. Галоўнае слова — дзеепрыслоўе *аглядаючы*, залежнае — прыслоўе *рупліва.* | 3. Галоўнае слова — *аглядаючы*, залежнае — *рупліва.* |
| 4. Пачатковая форма *рупліва аглядаць.* | 4. — |
| 5. Словазлучэнне дзеяслоўнае з залежным словам прыслоўем. | 5. Галоўнае слова выражана дзеепрыслоўем, залежнае — прыслоўем. (Словазлучэнне мае будову: прыслоўе+дзеепрыслоўе.) |
| 6. Адносіны паміж словамі азначальна-акалічнасныя: называюць дадатковае дзеянне і яго прымету (якасць). | 6. Граматычнае значэнне словазлучэння: абазначае дадатковае дзеянне і яго прымету. |
| 7. Сувязь слоў у словазлучэнні — прымыканне, да дзеепрыслоўя прымыкае прыслоўе. | 7. Спосаб сінтаксічнай сувязі слоў — прымыканне. |
| 8. Сродак выражэння граматычнай сувязі — сэнсавая залежнасць. | 8. — |






### Практыкаванне 23

Зрабіць разбор словазлучэнняў.

Быў канец верасня. Раніца выдалася ясная, халаднаватая. Узыходзіла сонца, і палі пад яго праменнямі ляжалі залітыя залаціста-ружовымі і бледна-зялёнымі фарбамі. Маўкліва стаялі старыя прыдарожныя бярозы, ранячы долу першае пажоўклае лісце. Далягляд быў празрысты, і палоска лесу на небасхіле акрэслівалася выразна на чыстым небе. У палях у гэты ранні час было пуста, воддаль, на грэбні ўзгорка, паказаўся трактар — маленькі ў палявым бязмежжы, нібы казюлька... Сцірты саломы, падобныя на высокія пясчаныя курганы, адзначалі месцы палявых такоў, на якіх нядаўна яшчэ гулі малатарні. Бялеў на лугавінах разасланы лён, чарнелі побач квадраты ўзаранага ржышча.

Выгляд палёў радаваў Заранiка... Палі дыхалі пахамі свежаабмалочанай саломы, атавы на лугах і звялага бульбоўніку, кучы якога сям-там ляжалі на бульбяных масівах...

Каля дарогі прамільгнуў сасновы пералесак, і машына, збочыўшы з бальшака, загойдалася па выбоінах пакручастай вясковай вуліцы. Машына зрабіла яшчэ адзін паварот і выехала на роўную забрукаваную вуліцу.

*(Паводле Т. Хадкевіча)*

## ПРОСТЫ СКАЗ

Мэта разбору — вызначыць структуру простага сказа паводле характару граматычнай асновы, наяўнасці даданых членаў, колькасці граматычных саставаў, разабраць па членах сказа.

Класіфікацыя простых сказаў у ВНУ і школе грунтуецца на адных і тых жа тэарэтычных асновах; аднак у ВНУ больш дэталёвая класіфікацыя структурных тыпаў простых сказаў і больш глыбокі аналіз іх катэгорый.

Пры характарыстыцы простых сказаў трэба мець на ўвазе магчымыя выпадкі ўскладнення іх тымі ці іншымі сінтаксічнымі адзінкамі (тады неабходна адзначыць, чым ускладнены сказ, назваць граматычныя і функцыянальныя асаблівасці ўскладняльных канструкцый).

Сінтаксічны разбор сказа можа быць поўны і частковы. Пры поўным робіцца ўсебаковы аналіз сказа (вызначаюцца граматычныя прыметы сказа, разбіраецца

сказ па членах). Частковы разбор прадугледжвае выбарачную характарыстыку сказа (напрыклад, сувязь слоў у сказе, галоўныя і даданыя члены сказа і г. д.).

### Пытанні

1. Чым адрозніваецца словазлучэнне ад сказа?
2. Як адрозніць няпоўныя сказы ад падобных да іх іншых сказаў?
3. Чым характарызуюцца словы-сказы? У чым іх адрозненне ад іншых тыпаў сказаў?

### Парадак разбору

| *У ВНУ* | *У школе* |
|---|---|
| 1. Знайсці граматычную аснову сказа (прэдыкатыўнае ядро) і ўстанавіць, што ён просты. | 1. Знайсці граматычную аснову сказа і ўстанавіць, што ён просты. |
| 2. Назваць тып сказа паводле адносін зместу да аб'ектыўнай рэчаіснасці (сцвярджальны, адмоўны — агульнаадмоўны, частковаадмоўны). | 2. — |
| 3. Тып сказа па мэце выказвання і інтанацыйным афармленні (апавядальны, пабуджальны, пытальны — уласна-пытальны, пытальна-рытарычны, пытальна-пабуджальны; клічны — па эмацыянальнай афарбоўцы). | 3. Назваць тып сказа па мэце выказвання (апавядальны, пытальны, пабуджальны), калі сказ клічны — адзначыць гэта. |
| 4. Тып сказа па структуры: | 4. Тып сказа па будове: |
| а) па наяўнасці граматычных саставаў (двухсастаўны, аднасастаўны), калі аднасастаўны, то які[1]; | а) паводле граматычнай асновы (двухсастаўны, аднасастаўны), калі аднасастаўны — якога тыпу (указваецца пасля вывучэння адпаведных тэм); |

[1] Парадак разбору аднасастаўных сказаў даецца ніжэй.

б) па наяўнасці або адсутнасці даданых членаў сказа (развіты, неразвіты);

в) членны, нячленны (слова-сказ), калі нячленны, то які (сцвярджальны, адмоўны, пытальны, эмацыянальна - ацэначны, пабуджальны);

г) поўны або няпоўны (сітуацыйна - кантэкстуальны, эліптычны).

5. Ускладнены або неўскладнены, калі ўскладнены, то чым (аднароднымі, адасобленымі членамі сказа, пабочнымі, устаўнымі словамі або сказамі, звароткам і інш.).

6. Разабраць сказ па членах сказа і вызначыць, чым яны выражаны [1].

7. Растлумачыць расстаноўку знакаў прыпынку.

б) па наяўнасці або адсутнасці даданых членаў сказа (развіты, неразвіты);

в) —

г) поўны або няпоўны, калі няпоўны, то які член сказа апушчаны (вызначаецца пасля вывучэння адпаведных тэм).

5. Адзначыць, калі сказ ускладнены аднароднымі, адасобленымі членамі сказа, пабочнымі словамі, зваротках і інш. (пасля вывучэння адпаведных тэм).

6. Разабраць сказ па членах сказа і сказаць, чым яны выражаны.

7. Растлумачыць расстаноўку знакаў прыпынку.

## Узоры

*I. Густы вільготны вецер гойдаў верхавіны дрэў, абмытых даждждом. (Шам.)*

1. Граматычная аснова — *вецер гойдаў*, сказ просты.

2. Сцвярджальны.

3. Апавядальны.

4. а) двухсастаўны;

б) развіты;

в) членны;

г) поўны.

5. Ускладнены адасобленым азначэннем, выражаным дзеепрыметным

1. Граматычная аснова — *вецер гойдаў*, сказ просты.

2. —

3. Апавядальны.

4. а) двухсастаўны;

б) развіты;

в) —

г) поўны.

5. Ускладнены адасобленым азначэннем (назваць).

---

[1] Разбор па членах сказа даецца асобна.

словазлучэннем, стаіць пасля азначаемага слова.

6. —

7. Адасобленае азначэнне аддзяляецца коскай.

6. —

7. Адасобленае азначэнне аддзяляецца коскай.

*II. «У вас жа, бачу, можна павучыцца».— «Ага!» (К-с)*

1. Граматычная аснова — *можна павучыцца,* сказ просты.
2. Сцвярджальны.
3. Апавядальны.
4. а) аднасастаўны (безасабовы);

   б) развіты;

   в) членны;

   г) поўны.
5. Ускладнены пабочным сказам *бачу* са значэннем спасылкі на крыніцу паведамлення, на прыналежнасць выказанай думкі.
6. —
7. Пабочны сказ выдзяляецца коскамі.

*Ага!*

Слова-сказ, сцвярджальны, нячленны, клічны па інтанацыі; у канцы сказа ставіцца клічнік.

1. Граматычная аснова — *можна павучыцца,* сказ просты.
2. —
3. Апавядальны.
4. а) аднасастаўны (безасабовы);

   б) развіты;

   в) —

   г) поўны.
5. Ускладнены пабочным сказам *бачу*, указвае на крыніцу паведамлення (каму належыць паведамленне).
6. —
7. Пабочны сказ выдзяляецца коскамі.

*Ага!*

Слова-сказ, клічны па інтанацыі; у канцы сказа ставіцца клічнік.

*III. У цёмным небе — карагоды сінябатых зорак. (Багд.)*

1. Граматычная аснова — *карагоды зорак* (у небе зіхацяць); сказ просты.
2. Сцвярджальны.
3. Апавядальны.

1. Граматычная аснова — *карагоды зорак* (у небе зіхацяць).
2. —
3. Апавядальны.

| | |
|---|---|
| 4. а) двухсастаўны; | 4. а) двухсастаўны; |
| б) развіты; | б) развіты; |
| в) членны; | в) — |
| г) няпоўны, эліптычны (з апушчаным дзеясловам-выказнікам са значэннем дзеяння — *зіхацяць*). | г) няпоўны, апушчаны выказнік *(зіхацяць)*. |
| 5. Няўскладнены. | 5. — |
| 6. — | 6. — |
| 7. Працяжнік у няпоўным сказе ставіцца на месцы апушчанага выказніка. | 7. Працяжнік ставіцца на месцы пропуску выказніка. |

**Практыкаванне 24**

Зрабіце разбор простых сказаў. Назавіце, чым яны ўскладнены. Растлумачце знакі прыпынку.

1. Восень была добрая. Дні стаялі цёплыя, ясныя. Дыхалася лёгка на поўныя грудзі. *(Саб.)* 2. Добра было ў раннюю восень у калгасе. З поля прыбралі багаты ўраджай, сеялі жыта. На адным палетку яшчэ ляжалі снапы позняга аўса. *(К. Ч.)* 3. Каму не дараг любы сад у пышнай квецені вясною? *(М. З.)* 4. Над лесасекай, зарослай густымі кустамі арэшніку, плыло павуцінне бабінага лета. Плыло яно ў бок маладога, як бы абпаленага дзівосным агнём, асінніку. Але (так здавалася здалёк, з другога краю лесасекі) павуцінне, нібы баючыся згарэць на гэтых агністых лісцях, не чаплялася за асіны, а, даляцеўшы туды, раптам узнімалася вышэй і ляцела ў ясны, на дзіва глыбокі блакіт асенняга неба і як бы раставала ў гэтай бяздоннай сіняве. *(Шам.)* 5. Старога Вячэру ў лодцы бачыла цяпер толькі пяцігадовая Ганначка. Поўненькая, светленькая, любіміца сям'і, яна круцілася, як сініца, на сярэдняй лаўцы перад сваім дзядулем... *(Б.)* 6. Вясна на дрэвах лісце вешае, а мы — сцягі на кожны дом. *(Астр.)* 7. Квітнела навокал. *(Шам.)* 8. Нават ледзяныя ўзоры на вокнах расцвіталі, здавалася, і іскрыліся сінімі аганькамі. *(Лыньк.)* 9. На двары сінь. Паветра, снег, неба — усё заліта сінню. *(Чарн.)* 10. Вось і рака. Яе нельга пазнаць. *(Вад.)* 11. «А дзедка ўсё госціць у нас!» — «Але, сынку мой». *(Куп.)*

Разбор аднасастаўных сказаў мае на мэце выявіць іх тыпы, значэнні асобных тыпаў, спосабы выражэння ў іх галоўнага члена.

У ВНУ выдзяляюць тыя ж тыпы аднасастаўных сказаў, што і ў школе, аднак у школьных падручніках не разглядаюцца як асобны тып інфінітыўныя сказы (іх адносяць да безасабовых).

Для размежавання разнавіднасцей аднасастаўных сказаў мэтазгодна рабіць супастаўляльны аналіз, напрыклад, пэўна-асабовых і няпэўна-асабовых сказаў як семантычна супрацьлеглых канструкцый, безасабовых і інфінітыўных, двухсастаўных і аднасастаўных сказаў.

Намінатыўныя сказы (як від аднасастаўных) неабходна адрозніваць ад знешне падобных двухсастаўных з іменным выказнікам, ад двухсастаўных няпоўных, а таксама «назоўнага ўяўлення» (*Бязвоблачнае неба.— Неба бязвоблачнае. Навокал цішыня.— Трывожная цішыня. Светлыя воблакі.— Воблакі... Адкуль яны?..*)

## Пытанні

1. Што агульнае паміж пэўна-асабовымі, няпэўна-асабовымі, абагульнена-асабовымі сказамі і што адрознівае іх?

2. Чым адрозніваюцца інфінітыўныя сказы ад іншых тыпаў выказнікавых сказаў?

3. Як адрозніць намінатыўныя сказы ад падобных да іх па структуры іншых сказаў?

## Парадак разбору

| *У ВНУ* | *У школе* |
|---|---|
| 1. Граматычная аснова сказа. | 1. Граматычная аснова сказа. |
| 2. Тып аднасастаўнага сказа паводле галоўнага члена (з галоўным членам выказнікам (бяздзейнікавы); з галоўным членам дзейнікам (безвыказнікавы). | 2. Аднасастаўны сказ у залежнасці ад віду галоўнага члена (з галоўным членам выказнікам, з галоўным членам дзейнікам). |

3. Спосаб выражэння галоўнага члена і асноўнае значэнне.

4. Тып аднасастаўнага сказа па марфалагічным спосабе выражэння галоўнага члена і яго семантыцы (пэўна-асабовы, няпэўна-асабовы, абагульнена-асабовы, безасабовы, інфінітыўны, намінатыўны — быційны, указальны) [1].

3. Чым выражаецца галоўны член сказа.

4. Тып аднасастаўнага сказа (азначальна-асабовы, неазначальна-асабовы, абагульнена-асабовы, безасабовы, назыўны).

## Узоры

*I. Іду — і хочацца сказаць, якая маладосць. (Б.)*

*Іду*

1. Граматычная аснова — *іду*.

2. Сказ аднасастаўны, з галоўным членам выказнікам.

3. Выказнік *іду* выражаны дзеясловам 1-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга часу, форма дзеяслова выразна ўказвае на дзеянне пэўнай, канкрэтнай асобы.

4. Сказ пэўна-асабовы.

*Іду*

1. Граматычная аснова — *іду*.

2. Сказ аднасастаўны, з галоўным членам выказнікам.

3. Выказнік *іду* выражаны дзеясловам 1-й асобы.

4. Сказ азначальна-асабовы.

*Хочацца сказаць*

1. Граматычная аснова — *хочацца сказаць*.

2. Сказ аднасастаўны з галоўным членам выказнікам (бяздзейнікавы).

*Хочацца сказаць*

1. Граматычная аснова — *хочацца сказаць*.

2. Сказ аднасастаўны з галоўным членам выказнікам.

---

[1] Усе астатнія катэгорыі вызначаюцца па агульнай схеме разбору простага двухсастаўнага сказа (гл. с. 70—71).

| | |
|---|---|
| 3. Выказнік *хочацца сказаць* выражаны неазначальнай формай дзеяслова ў спалучэнні з безасабовым дзеясловам са значэннем пажаданасці. Дзеяслоў-выказнік абазначае дзеянне, безадноснае да асобы. | 3. Выказнік *хочацца сказаць* выражаны неазначальнай формай дзеяслова з безасабовым дапаможным дзеясловам. |
| 4. Сказ безасабовы, дзеючую асобу ўстанавіць нельга. | 4. Сказ безасабовы. |

*II. Добрага чалавека не перахваліш. (Лыньк.)*

| | |
|---|---|
| 1. Граматычная аснова — *не перахваліш.* | 1. Граматычная аснова — *не перахваліш.* |
| 2. Сказ аднасастаўны з галоўным членам выказнікам (бяздзейнікавы). | 2. Сказ аднасастаўны з галоўным членам выказнікам. |
| 3. Выказнік *не перахваліш* выражаны дзеясловам 2-й асобы адзіночнага ліку будучага часу. Дзеяслоў-выказнік абазначае дзеянне, якое можа адносіцца да любой асобы, да кожнага. | 3. Выказнік *не перахваліш* выражаны дзеясловам 2-й асобы абвеснага ладу. |
| 4. Сказ абагульнена-асабовы. | 4. Сказ абагульнена-асабовы. |

*III. Думак народных сягоння не змераць. (Гл.)*

| | |
|---|---|
| 1. Граматычная аснова — *не змераць.* | 1. Граматычная аснова — *не змераць.* |
| 2. Сказ аднасастаўны з галоўным членам выказнікам (бяздзейнікавы). | 2. Сказ аднасастаўны з галоўным членам выказнікам. |
| 3. Выказнік *не змераць* выражаны незалежным інфінітывам з часціцай *не*, абазначае дзеянне, якое не павінна здзейсніцца. Дзеючую асобу ўстанавіць нельга. | 3. Выказнік выражаны неазначальнай формай дзеяслова. |
| 4. Сказ інфінітыўны. | 4. Сказ безасабовы. |

Практыкаванне 25

Вызначце тыпы аднасастаўных сказаў (самастойных і ў саставе складаных сказаў). Растлумачце, у чым розніца і падабенства паміж пэўна-асабовымі, няпэўна-асабовымі, абагульнена-асабовымі сказамі, паміж безасабовымі і інфінітыўнымі сказамі.

1. ...Люблю лес. Блукаеш па ім цэлы дзень і нібы чытаеш незвычайную кнігу... І гэта ўсё пачалося ў мяне з маленства. Памятаю, пойдзеш з сябрамі па ягады, а там неўзаметку адзін ад усіх — убок. Колькі ні крычаць — не даклічуцца. *(І. Ш.)* 2. Раніца. Шалёнасць колераў. Ласка сонца. Пераразвоньванне ручаёў. Мяккі туман над дальняй ракою. І ранішняя шматгалосая малітва птушак. А небяспечных звяроў (розных там дыназаўраў) паблізу няма. Ну як тут не заспяваць! *(Сіп.)* 3. Не хваліся, план складаючы, а пахваліся, год канчаючы. *(Прык.)* 4. Канец верасня, а па-ранейшаму цёпла, як летам. Хочацца вось так, дыхаючы на ўсе грудзі, ісці прасёлкавай дарогай, глядзець на лес, на ўзгорыстае поле. *(І. Н.)* 5. Звечарэла. Сонца зайшло, пакінуўшы ярка-халоднае зарава. Адразу пацягнула аднекуль з поля такой свежасцю, што Антось здрыгануўся... *(Хадк.)* 6. Партызану ніколі не забыць вас, шумлівыя палескія лясы! Ды і як вас забыць, калі служылі вы мсціўцам народа старанна і шчыра, як самая лепшая зброя. *(Кр.)* 7. Цягнік крануўся. Антанюк стаяў і глядзеў, як праплываюць вагоны. Вось і яго вагон. *(Шам.)* 8. А як прыемна глядзець на веснавы разліў! Стаіш, бывала, над абрывам, што за хаткай бакеншчыка, і не можаш адвесці вачэй ад воднай прасторы. *(Вад.)* 9. На паплавах звозілі сена. Да стога яго падцягвалі дзвюма валакушамі — таўставатымі жардзінамі, якія былі прымацаваны да гужоў. *(Асіп.)* 10. Гультая не трымай у сакрэце — крытыкуй у газеце. *(Прык.)*

## *ЧЛЕНЫ СКАЗА*

Прызначэнне разбору па членах сказа — выявіць галоўныя і даданыя члены сказа, спосабы іх выражэння.

Пры вызначэнні членаў сказа, акрамя пытання да іх, трэба ўлічваць таксама лексічнае значэнне спалучальных слоў, сэнсавыя адносіны паміж імі.

Разбор па членах сказа праводзіцца ў наступным парадку: спачатку вызначаецца дзейнік і выказнік (граматычная аснова), затым разглядаюцца члены сказа, якія

ўваходзяць у састаў (групу) дзейніка, потым — якія ўваходзяць у састаў выказніка.

У граматыках — ВНУ і школьнай — прынцыпы класіфікацыі членаў сказа адны і тыя ж. Некаторыя разыходжанні заўважаюцца толькі ў класіфікацыі выказнікаў. У ВНУ, акрамя традыцыйна выдзяляемых (просты, састаўны іменны, састаўны дзеяслоўны), разглядаюцца просты іменны, ускладнены, складаны (трохчленны, чатырохчленны).

Разглядаючы тыпы выказніка, неабходна паказаць марфалагічныя варыянты яго выражэння, вызначыць від звязкі.

Пры вызначэнні састаўнога дзеяслоўнага выказніка трэба размяжоўваць суб'ектны і аб'ектны інфінітыў. Суб'ектны інфінітыў у складзе выказніка спалучаецца толькі з мадальнымі дзеясловамі, са значэннем пачатку, канца дзеяння і г. д.; аб'ектны ў састаў выказніка наогул не ўваходзіць (з'яўляецца дапаўненнем: *...прапанавалі збірацца ў дарогу*, але *пачалі збірацца*).

Адасобленыя члены (дзеепрыметныя, дзеепрыслоўныя словазлучэнні) трэба разглядаць як адзін член сказа. Пачленны разбор іх — гэта другі этап разбору, які праводзіцца з мэтай выявіць структурныя кампаненты адасобленай канструкцыі.

## Пытанні

1. Як адрозніць дзейнік ад выказніка, калі яны выражаны назоўнікамі назоўнага склону або інфінітывам?
2. Які выказнік называецца ўскладненым?
3. Як адрозніць прыдатак ад паясняемага слова?
4. Як адрозніць дададзеныя члены сказа, выражаныя формамі назоўніка?

## Парадак разбору

| *У ВНУ* | *У школе* |
|---|---|
| 1. Галоўныя члены двухсастаўнага сказа (або галоўны член аднасастаўнага сказа): | 1. Галоўныя члены (або галоўны член аднасастаўнага сказа): |
| а) дзейнік, спосаб выражэння яго (выражаны | а) дзейнік, якой часцінай мовы (або часцінамі мовы) выражаны; |

адным словам ці словазлучэннем; калі словазлучэннем, то якімі часцінамі мовы і ў якой форме);

б) выказнік, тып паводле структуры: просты дзеяслоўны, просты іменны, просты ўскладнены; састаўны дзеяслоўны, састаўны іменны, складаны (дзеяслоўны, дзеяслоўнаіменны); выражэнне выказніка; тып звязкі ў састаўным іменным выказніку, звязка ў састаўным дзеяслоўным выказніку.

2. Назваць састаў дзейніка і састаў выказніка.

3. Дадзеныя члены сказа:

а) дапаўненне, тып дапаўнення ў залежнасці ад слова, да якога адносіцца: прыдзеяслоўнае (прамое ці ўскоснае — даказаць), прыйменнае, прыадвербіяльнае; на якое пытанне адказвае; чым выражана;

б) азначэнне (дапасаванае, недапасаванае), да якога слова адносіцца, на якое пытанне адказвае; чым выражана;

в) прыдатак, яго значэнне: да якога слова адносіцца, чым выражаны, у чым дапасуецца да азначаемага слова;

г) акалічнасць, разрад акалічнасці па значэнні

б) выказнік, тып выказніка: просты дзеяслоўны ці састаўны (дзеяслоўны або іменны). Чым выражаны просты выказнік (якой формай дзеяслова); састаўны іменны выказнік — якая ўжыта звязка і чым выражаецца іменная частка; з якіх частак складаецца састаўны дзеяслоўны выказнік і чым выражана кожная частка.

2. Назваць састаў дзейніка і састаў выказніка.

3. Дадзеныя члены сказа:

а) дапаўненне, прамое ці ўскоснае; чым выражана;

б) азначэнне, дапасаванае ці недапасаванае; якой часцінай мовы выражана;

в) прыдатак, дапасаваны ці недапасаваны;

г) акалічнасць (месца, часу, прычыны, мэты, спо-

(месца, часу, умовы, прычыны, мэты, уступкі, меры і ступені, спосабу дзеяння); на якое пытанне адказвае, чым выражана.

сабу дзеяння, меры і ступені).

## Узоры

*І. Беларускія бярозы абапал гасцінца калыхалі думкі шумам хлапчуку-ўкраінцу. (Куп.)*

1. *Бярозы* — дзейнік, выражаны назоўнікам назоўнага склону; *калыхалі* — просты дзеяслоўны выказнік; дапасуецца да дзейніка ў ліку.

2. Састаў дзейніка: *беларускія бярозы абапал гасцінца*; састаў выказніка: *калыхалі думкі шумам хлапчуку-ўкраінцу.*

3. *Беларускія* — дапасаванае азначэнне да дзейніка *бярозы*, адказвае на пытанне: я к і я бярозы?, выражана прыметнікам; дапасуецца ў ліку і склоне;

*абапал гасцінца* — недапасаванае азначэнне да дзейніка *бярозы*, адказвае на пытанне: я к і я бярозы?, выражана назоўнікам з прыназоўнікам;

*думкі* — дапаўненне, прыдзеяслоўнае, адказвае на пытанне: калыхалі ш т о?, дапаўненне прамое, выражана формай вінавальнага склону назоўніка;

1. *Бярозы* — дзейнік, выражаны назоўнікам назоўнага склону; *калыхалі* — просты выказнік, выражаны дзеясловам.

2. Састаў (група) дзейніка: *беларускія бярозы абапал гасцінца*; састаў (група) выказніка: *калыхалі думкі шумам хлапчуку-ўкраінцу.*

3. *Беларускія* — азначэнне, дапасаванае, выражана прыметнікам;

*абапал гасцінца* — азначэнне, недапасаванае, выражана назоўнікам з прыназоўнікам;

*думкі* — дапаўненне, прамое, выражана назоўнікам вінавальнага склону;

*шумам* — прыдзеяслоўнае дапаўненне, адказвае на пытанне: калыхалі ч ы м?, дапаўненне, ускоснае; выражана формай творнага склону назоўніка;

*хлапчуку* — дапаўненне, прыдзеяслоўнае, адказвае на пытанне: калыхалі думкі к а м у?, дапаўненне, ускоснае, выражана формай давальнага склону назоўніка;

*ўкраінцу* — прыдатак, указвае на нацыянальнасць; адносіцца да назоўніка-дапаўнення *хлапчуку*, выражаны няўласным назоўнікам, дапасуецца да азначаемага слова ў родзе, ліку і склоне.

*шумам* — дапаўненне, ускоснае, выражана назоўнікам;

*хлапчуку* — дапаўненне, ускоснае, выражана назоўнікам;

*ўкраінцу* — прыдатак, дапасаваны, выражаны назоўнікам.



*II. Дружбу нашу, здабытую ў бітвах грымотных, зробім вечнай, магутнай. (Кір.)*

1. *Зробім вечнай, магутнай* — аднародныя выказнікі, састаўныя іменныя, іменная частка (выказальнае слова) выражана прыметнікам; звязка знамянальная, выражана дзеясловам, абазначае канкрэтнае дзеянне.

2. Усе даданыя члены ўваходзяць у састаў выказніка.

3. *Дружбу* — дапаўненне, прыдзеяслоўнае, залежыць ад пераходнага дзеяслова-звязкі *зробім*, адказвае на пытанне: зробім вечнай, магутнай ш т о ?, дапаўненне, прамое, выражана формай вінавальнага склону назоўніка;

*нашу* — дапасаванае азначэнне да назоўніка-дапаўнення *дружбу*, адказвае на пытанне: дружбу ч ы ю?, выражана займеннікам; дапасуецца да азначаемага слова ў родзе, ліку і склоне;

*здабытую ў бітвах грымотных* — развітае (адасобленае) азначэнне да назоўніка *дружбу*, адказвае на пытанне: дружбу нашу я к у ю?, выражана дзеепрыметным словазлучэннем.

1. *Зробім вечнай, магутнай* — аднародныя выказнікі, састаўныя іменныя, дзеяслоў-звязка — *зробім*, іменная частка выражана прыметнікам.

2. Усе дадатныя члены ўваходзяць у састаў выказніка.

3. *Дружбу* — дапаўненне, прамое, выражана назоўнікам вінавальнага склону;

*нашу* — дапасаванае азначэнне, выражана займеннікам;

*здабытую ў бітвах грымотных* — развітае азначэнне, выражана дзеепрыметным словазлучэннем.




**Практыкаванне 26**

Зрабіце разбор па членах сказа.

1. Вялікае шчасце для чалавека выхаваць у сабе з дзіцячых гадоў і захаваць назаўсёды ў сваім сэрцы памяць і любоў да родных мясцін! Такі чалавек ніколі не здрадзіць Радзіме, не перастане шанаваць сваіх, блізкіх яго сэрцу людзей, паважаць іншыя народы. *(Пальч.)* 2. Дзень быў лагодны, ціхі. Сонца ўжо даўно мінула поўдзень. Прыпарвала. На далёкім захадзе, з-за зубчастых пералескаў выплывалі, як мядзяныя горы, клубястыя хмары, пафарбаваныя сонцам у чырванаваты колер. Як прыгожа і велічна выступалі яны над краем зямлі, уздымаючыся ўсё вышэй і вышэй... Лабановіч не мог адвесці вачэй ад купчастых грамадзін-хмар і ўвесь аддаўся чарам зямлі і неба. *(К-с)* 3. Жывучы на беразе Заходняй Дзвіны, Міша стаў выдатным плыўцом. *(Крап.)* 4. Вечар перад святочным днём заўсёды здаецца прыгажэйшым за звычайныя вечары. У ім адчуваецца нешта ўрачыстае. *(Чарн.)* 5. Люблю лугі квяцістыя, за полем шумны гай, палеткі каласістыя, цябе, мой родны край. *(Р.)* 6. Мір! Што ёсць лепшае і прыгажэйшае на свеце? Мір — гэта і праца, і шчасце, і радасць. *(М. Г.)* 7. Дождж мёдам

сад апырскаў, нанаіў карэнні сокам... *(Я. П.)* 8. Вечна я ўдзячны жытняму хлебу, чыстай вадзе з невялічкай крыніцы, лесу зялёнаму, сіняму небу, светлай рачулцы, што ў полі бруіцца... *(Бр.)*

### Узоры поўнага вуснага разбору простага сказа [1]

*I. Ціхая чэрвеньская раніца. (Хомч.)*

Граматычная аснова — *раніца.* Сказ просты, сцвярджальны, апавядальны, аднасастаўны, з галоўным членам дзейнікам, назыўны, развіты, членны, поўны, няўскладнены.

*Раніца* — дзейнік, выражаны назоўнікам.

Усе даданыя члены сказа ўваходзяць у састаў дзейніка.

*Чэрвеньская* — дапасаванае азначэнне, адказвае на пытанне: я к а я раніца?, выражана прыметнікам, дапасуецца да назоўніка ў родзе, ліку, склоне.

*Ціхая* — дапасаванае азначэнне, адказвае на пытанне: я к а я чэрвеньская раніца?, выражана прыметнікам, дапасуецца да назоўніка ў родзе, ліку, склоне. Азначэнні *чэрвеньская* і *ціхая* неаднародныя.

Граматычная аснова — *раніца.* Сказ просты, апавядальны, аднасастаўны, з галоўным членам дзейнікам, назыўны, развіты, поўны.

*Раніца* — дзейнік, выражаны назоўнікам.

Усе даданыя члены сказа ўваходзяць у састаў дзейніка.

*Чэрвеньская* — дапасаванае азначэнне, выражана прыметнікам, дапасуецца да назоўніка ў родзе, ліку, склоне.

*Ціхая* — дапасаванае азначэнне, выражана прыметнікам, дапасуецца да назоўніка ў родзе, ліку, склоне. Азначэнні *чэрвеньская* і *ціхая* неаднародныя.

*II. Люблю свой сад пад белым цветам. (Ц.)*

Граматычная аснова — *люблю.* Сказ просты, сцвярджальны, апавя-

Граматычная аснова — *люблю.* Сказ просты, апавядальны, аднасastaў-

[1] Разбор даецца на аснове схемы разбору простага сказа, а таксама разбору па членах сказа.

дальны, аднасастаўны, з галоўным членам выказнікам, пэўна-асабовы, развіты, членны, поўны, няўскладнены.

*Люблю* — выказнік, просты, дзеяслоўны.

Усе даданыя члены сказа ўваходзяць у састаў выказніка.

*Сад* — дапаўненне, прыдзеяслоўнае, адказвае на пытанне: люблю што?, дапаўненне, прамое, выражана назоўнікам вінавальнага склону; сінтаксічная сувязь з паясняемым словам — беспрыназоўнікавае кіраванне.

*Свой* — дапасаванае азначэнне, адказвае на пытанне: чый сад?, выражана займеннікам, дапасуецца да азначаемага слова ў родзе, ліку і склоне.

*Пад белым цветам* — азначэнне, недапасаванае, адказвае на пытанне: які сад?, выражана словазлучэннем (назоўніка з прыназоўнікам з прыметнікам); сувязь з азначаемым словам — слабае кіраванне.

ны, з галоўным членам выказнікам, азначальна-асабовы, развіты, поўны.

*Люблю* — выказнік, просты, дзеяслоўны.

Усе даданыя члены сказа ўваходзяць у састаў выказніка.

*Сад* — дапаўненне, прамое, выражана назоўнікам вінавальнага склону; сувязь з азначаемым словам — кіраванне.

*Свой* — дапасаванае азначэнне, выражана займеннікам, дапасуецца да назоўніка ў родзе, ліку і склоне.

*Пад белым цветам* — недапасаванае азначэнне, выражана сінтаксічна цэласным словазлучэннем; сувязь з азначаемым словам — кіраванне.

*III. На вішні белымі валокнамі ляціць, клубіцца дым густы. (Вял.)*

Граматычная аснова — *дым ляціць, клубіцца.* Сказ просты, сцвярджальны, апавядальны, двухсастаўны, развіты, членны, поўны, ускладнены адна-

Граматычная аснова — *дым ляціць, клубіцца.* Сказ просты, апавядальны, двухсастаўны, развіты, ускладнены аднароднымі членамі; аднарод-

роднымі членамі; сувязь паміж аднароднымі членамі злучальная (аднародныя члены звязаны пры дапамозе інтанацыі).

*Дым* — дзейнік, выражаны назоўнікам; *ляціць, клубіцца* — выказнікі, простыя, дзеяслоўныя, дапасуюцца да дзейніка ў ліку.

Састаў дзейніка: *дым густы*, састаў выказніка: *ляціць, клубіцца белымі валокнамі.*

*Густы* — дапасаванае азначэнне, адказвае на пытанне: я к і дым?, выражана прыметнікам; дапасуецца да назоўніка ў родзе, ліку і склоне.

*Валокнамі* — акалічнасць спосабу дзеяння, адказвае на пытанне: ляціць, клубіцца я к?, выражана назоўнікам, сувязь з дзеясловам — слабае кіраванне [1].

*Белымі* — дапасаванае азначэнне, адказвае на пытанне: я к і м і валокнамі?, выражана прыметнікам, дапасуецца да назоўніка ў ліку і склоне.

*На вішні* — акалічнасць месца, адказвае на пытанне: ляціць, клубіцца к у д ы?, выражана назоўнікам з прыназоўнікам; сувязь з паясняемым словам — слабае кіраванне, прыназоўнікавае.

ныя выказнікі спалучаюцца з дапамогай інтанацыі.

*Дым* — дзейнік, выражаны назоўнікам; *ляціць, клубіцца* — выказнікі, простыя, дзеяслоўныя, дапасуюцца да дзейніка ў ліку.

Састаў дзейніка: *дым густы*, састаў выказніка: *ляціць, клубіцца белымі валокнамі.*

*Густы* — дапасаванае азначэнне, выражана прыметнікам; дапасуецца да назоўніка ў родзе, ліку і склоне.

*Валокнамі* — акалічнасць спосабу дзеяння, выражана назоўнікам; сувязь з азначаемым словам — кіраванне.

*Белымі* — азначэнне, дапасаванае, выражана прыметнікам.

*На вішні* — акалічнасць месца, выражана назоўнікам з прыназоўнікам; сувязь з азначаемым словам — кіраванне.

[1] Такое слабае кіраванне можна разглядаць як залежна-склонавае прымыканне.

| | |
|---|---|
| Паміж аднароднымі членамі сказа ставіцца коска. | Паміж аднароднымі членамі сказа ставіцца коска. |

**Практыкаванне 27**

Зрабіце поўны разбор простых сказаў.

1. Чэрвень пышна красаваў на палях. Зеляніна ажно шумела ў росце і на палетках, і на ўзмежках, і на паплавах, і на імшарынах. *(Хадк.)* 2. Нідзе вочы так не адпачываюць, як у лесе, нідзе не бачаць такога хараства, прыгажосці, здольнай зачараваць паэтаў, мастакоў, кампазітараў, натхніць іх на стварэнне выдатных твораў. Фантастычнае багацце фарбаў, чароўнасць мелодый лясных спевакоў могуць задаволіць самыя вытанчаныя густы ўсіх... *(Мяж.)* 3. Кожнае лета да нас, у Беларусь, едуць з Поўначы, Урала, Сібіры, нават з поўдня краіны тысячы людзей. Іх вабяць партызанскія сцежкі, подзвіг Беларусі-партызанкі, казачная прыгажосць нашых лясоў і азёр. На Браслаўшчыне, Мядзельшчыне, Лепельшчыне, на Палессі — усюды можна сустрэць жаданых гасцей. *(Мяж.)* 4. Многія пакаленні будуць дзівіцца і захапляцца подзвігамі нашага народа. *(Я. М.)* 5. Сосны, падобныя адна на адну, як сёстры, стваралі ўзбоч дарогі суцэльныя сцены, велічна ўздымалі ў белае неба свае заснежаныя густыя шапкі. *(Шам.)* 6. Лес наступаў і расступаўся, лужком зялёным разрываўся. *(К-с)* 7. Бягуць у розных кірунках чыгуначныя і шасейныя дарогі, злучаючы прыгожыя старажытныя і маладыя гарады. *(Хадк.)* 8. Над стрэхамі хат вывіваюцца лёгкія празрыстыя дымкі. За імі на небе такое ж самае лёгкае ружовае воблачка. *(Скр.)* 9. Нідзе не відно ні канца, ні краю. Абапал лес і лес. *(Саб.)*

## СКЛАДАНЫ СКАЗ

Мэта разбору — вызначыць структурныя часткі складанага сказа, сэнсавыя адносіны паміж імі, тып складанага сказа.

У складаным сказе некалькі граматычных асноў, якія нагадваюць сабой простыя сказы.

У граматыках — ВНУ і школьных — выдзелены складаназлучаныя, складаназалежныя, бяззлучнікавыя і

камбінаваныя складаныя сказы (складаныя сказы з рознымі відамі сувязі).

Пры разборы складанага сказа трэба прытрымлівацца наступнага парадку:

1. Вызначыць колькасць прэдыкатыўных частак[1], абазначыць парадкавымі лічбамі кожную частку складанага сказа.

2. Назваць сродкі сувязі частак (сказаў): злучнікі, злучальныя словы, інтанацыя, вызначыць тып складанага сказа: злучнікавы — складаназлучаны, складаназалежны, камбінаваны (з рознымі відамі сувязі); бяззлучнікавы.

3. Зрабідь схему сказа.

4. Растлумачыць знакі прыпынку.

5. Зрабіць сінтаксічны разбор кожнай часткі.

## Пытанні

1. Што ляжыць у аснове падзелу складаных сказаў на тыпы (віды)?

2. Якія складаныя сказы з'яўляюцца сказамі прамежкавага (пераходнага) тыпу?

## *СКЛАДАНАЗЛУЧАНЫ СКАЗ*

Разбор складаназлучанага сказа мае на мэце вызначыць сувязь і сэнсавыя адносіны паміж часткамі (сказамі), граматычныя сродкі выражэння гэтых адносін.

У школьным падручніку даецца толькі агульнае паняцце аб граматычным значэнні сказаў (сэнсавых адносінах паміж часткамі). Не разглядаюцца граматычныя сродкі выражэння іх (формы выказніка, парадак размяшчэння частак, інтанацыя і інш.); не разглядаюцца сказы з прычынна-выніковымі, далучальнымі адносінамі паміж часткамі.

## Пытанні

1. Якія існуюць разнавіднасці складаназлучаных сказаў паводле выражэння сэнсавых адносін паміж часткамі?

---

[1] Для гэтага знайсці ў кожнай частцы граматычную аснову (дзейнік і выказнік у двухсастаўным сказе, галоўны член у аднасастаўным сказе).

2. Як адрозніць складаназлучаныя сказы са злучнікам *аж* ад падобных да іх складаназалежных з даданай часткай спосабу дзеяння?

## Парадак разбору

| *У ВНУ* | *У школе* |
|---|---|
| 1. Вызначыць часткі (прэдыкатыўныя адзінкі), якія ўваходзяць у складаназлучаны сказ (назваць іх). | 1. Назваць простыя сказы, якія ўваходзяць у састаў складаназлучанага сказа. |
| 2. Сродкі сувязі прэдыкатыўных частак: злучальныя злучнікі (спалучальныя, супраціўныя, размеркавальныя) і інтанацыя. | 2. Якімі злучнікамі звязваюцца простыя сказы (спалучальнымі, супраціўнымі, размеркавальнымі). |
| 3. Сэнсавыя адносіны паміж прэдыкатыўнымі часткамі: спалучальныя (з часавай і прычыннавыніковай залежнасцю), супраціўныя (з супастаўленнем і супрацьпастаўленнем), пералічальна-размеркавальныя (у якіх выражаюцца з'явы аднолькава магчымыя або немагчымыя, адбываюцца папераменна ці ўзаемна выключаюцца), далучальныя (з дапаўняльным значэннем). | 3. Што выражаецца ў сказах (адначасовасць, паслядоўнасць, проціпастаўленне, чаргаванне дзеянняў). |
| 4. Граматычныя сродкі выражэння гэтых адносін (злучнікі, трывальна-часавыя формы дзеясловаў, лексіка-граматычнае значэнне супастаўляльных слоў, парадак размяшчэння частак у іх, аб'яднанне састаўных частак | 4. — |

рознай структуры, інтанацыйнае афармленне).

5. Растлумачыць знакі прыпынку.

6. Зрабіць сінтаксічны разбор простых сказаў (прэдыкатыўных адзінак)[1].

5. Растлумачыць знакі прыпынку.

6. Зрабіць сінтаксічны разбор кожнага сказа.

## Узоры

*I. [1] У кузні пры майстэрні гулка стукаў аўтаматычны молат [2] і гудзеў горан. (Шам.)*

1. Сказ складаны, злучнікавы, складаназлучаны, складаецца з дзвюх частак (прэдыкатыўных адзінак).

2. Часткі звязаны пры дапамозе спалучальнага злучніка *і* і інтанацыі.

3. Паміж часткамі спалучальныя адносіны са значэннем адначасовасці.

4. Значэнне адначасовасці выражаецца спалучальным злучнікам *і*, трывальна-часавымі формамі дзеясловаў-выказнікаў (у форме прошлага часу), наяўнасцю агульнага слова *(у кузні)*, інтанацыяй.

5. Часткі складаназлучанага сказа коскай не раздзяляюцца, паколькі ёсць агульны для іх даданы член сказа.

1. Сказ складаны, злучнікавы, складаназлучаны, складаецца з двух простых сказаў. Зачытаць.

2. Простыя сказы звязаны пры дапамозе спалучальнага злучніка *і*.

3. У сказах гаворыцца аб з'явах, якія адбываюцца адначасова.

4. —

5. Перад злучнікам *і* коска не ставіцца, паколькі ёсць агульны даданы член *(у кузні)*, які аднолькава адносіцца і да першага і да другога простых сказаў.

---

[1] Гл. сінтаксічны разбор простага сказа.

## Схемы [1]

| 1 | і | 2 |        [ 1 ] і [ 2 ]

*II. [1] Усюды ляжаў снег, [2] але ў паветры патыхала чымся новым і [3] чулася скорая вясна. (К-с)*

1. Сказ складаны, злучнікавы, складаназлучаны, ускладненай будовы, складаецца з трох частак (зачытаць).

2. Часткі звязаны пры дапамозе злучальных злучнікаў *але* (супраціўны), *і* (спалучальны).

3. Адносіны паміж часткамі разнатыпныя: супраціўныя, ускладненыя дадатковым узмацняльным адценнем, і спалучальныя са значэннем адначасовасці.

4. Значэнне супрацьпастаўлення выражаецца супраціўным злучнікам *але*, лексічным зместам састаўных частак, аб'яднаннем дзвюх частак рознай структуры. Значэнне адначасовасці выражаецца спалучальным злучнікам *і*, трывальна-часавымі суадносінамі дзеясловаў-выказнікаў (прошлага часу), наяўнасцю агульнага слова, пералічальнай інтанацыяй.

5. Першая і другая часткі складаназлучанага сказа раздзяляюцца кос-

1. Сказ складаны, злучнікавы, складаназлучаны, складаецца з трох простых сказаў (зачытаць).

2. Простыя сказы звязаны пры дапамозе супраціўнага злучніка *але* і спалучальнага злучніка *і*.

3. У сказах адна з'ява проціпастаўляецца другой (1—2,3), а таксама паведамляецца аб з'явах, якія адбываюцца адначасова (2, 3).

4. —

5. Паміж першым і другім простымі сказамі ставіцца коска, паміж

[1] Схемы даюцца графічныя (злева) і лінейныя (справа), паколькі ў школьнай практыцы ўжываюцца часцей апошнія.

кай; паміж другой і трэцяй коска не ставіцца, паколькі ёсць агульны для іх член сказа.

другім і трэцім коска не ставіцца, паколькі ёсць агульны дадаты член (*у паветры*), які аднолькава адносіцца да першага і другога сказаў.

**Схемы**



*III. [1] Прайшлі дажджы — і [2] ўсё буяе. (І. Н.)*

1. Сказ складаны, злучнікавы, складаназлучаны, складаецца з дзвюх (прэдыкатыўных) частак (зачытаць).

2. Часткі звязаны пры дапамозе спалучальнага злучніка *і* і інтанацыі.

3. Паміж часткамі спалучальныя адносіны з прычынна-выніковай залежнасцю.

4. Прычынна - выніковая залежнасць выражаецца злучнікам *і*, трывальна-часавымі формамі дзеясловаў - выказнікаў (закончанага і незакончанага трывання), парадкам размяшчэння частак, інтанацыйным афармленнем.

5. Паміж часткамі складаназлучанага сказа ставіцца працяжнік.

1. Сказ складаны, злучнікавы, складаназлучаны, складаецца з двух простых сказаў (зачытаць).

2. Простыя сказы звязаны пры дапамозе спалучальнага злучніка *і*.

3. У сказе паведамляецца аб з'явах, якія адбываюцца паслядоўна.

4. —

5. Перад злучнікам *і* ставіцца працяжнік (у другім сказе паказваецца вынік дзеяння).

**Схемы**



### Практыкаванне 28

Зрабіце разбор складаназлучаных сказаў. Растлумачце знакі прыпынку.

1. Ноч выдалася цёплая, але лес, відаць, не спаў. То пісне нейкая птушка, то прарэзліва крыкне сава, то хрусне сухая галінка пад нагамі, то пачуецца ледзь чутны шолах. *(Я. М.)* 2. Згодна ў полі ўздоўж дарогі каляіны ўюцца, ды ніколі між сабою яны не сальюцца. *(К-с)* 3. Пад сонцам праплыла хмурынка, і па полі прабегла пасмачка ценю. *(Рыл.)* 4. Вясна была яшчэ ўпачатку, але снягі ўжо раставалі, і дружна ў полі балбаталі раўкі, рачулкі, і ў грамадку яны ваду сваю злівалі, ад сну гаі, лясы будзілі і людзям душу весялілі. *(К-с)* 5. Няспынна, магутна ідзе наперад жыццё, і няспынна, чароўна мяняецца воблік роднага краю. *(Кір.)* 6. Многае можа забыцца з настаўніцкай працы, а першы ўрок — ніколі. *(Пальч.)* 7. Вакол было бязлюдна, ціха, толькі побач з намі шумелі крыгі, і гэты мяккі шум разносіўся над усёй ракой. *(Хадк.)* 8. Над полем не то пыл курэў, не то трапяткая імгла ўзнялася аж да самага лесу. *(Лыньк.)* 9. Калісьці бура ў Карпатах застала Леніна ўначы, і ён да прыдарожнай хаты зайшоў пагрэцца, адпачыць. *(М. Т.)* 10. Аруць разлогі трактары, і ўсё айчыннай маркі. *(Луж.)* 11. Дарога была пустэльнай і ціхай, затое лес поўніўся птушыным рознагалоссем. *(Хадк.)* 12. Гуляюць дзеці каля возера, а неба з сонцам — у вадзе. *(Панч.)* 13. Настала ноч — і ўсюды ціха. *(К-с)*

## *СКЛАДАНАЗАЛЕЖНЫ СКАЗ*

Пры разборы складаназалежных сказаў трэба вызначыць, да чаго ў галоўнай частцы адносіцца даданая, пры дапамозе якіх злучнікаў або злучальных слоў звязваюцца даданая і галоўная часткі, выявіць у галоўнай частцы адносныя словы, а таксама ўстанавіць сэнсавыя адносіны паміж часткамі складанага сказа.

Прынцыпы класіфікацыі складаназалежных сказаў у граматыках — ВНУ і школьных — адны і тыя ж. Некаторыя разыходжанні назіраюцца толькі ў класіфікацыі даданых акалічнасных частак. У школьных падручніках не выдзяляюцца ў асобныя тыпы даданыя часткі выніку, супастаўляльныя, далучальныя (іх адпаведна разглядаюць

як дадзеныя прычыны, параўнальныя, як пабочныя сказы).

Разглядаючы складаназалежныя сказы, неабходна, акрамя асноўнага значэння, выдзяляць таксама адценні яго.

У складаназалежных сказах з некалькімі даданымі трэба асабліва засяродзіць увагу на падпарадкаванні даданых частак, звязаных парнымі злучнікамі *каб — то, як — дык* і інш.

### Пытанні

1. Чым адрозніваюцца злучнікі ад злучальных слоў?
2. Як адрозніць даданыя дзейнікавыя часткі ад дапаўняльных?
3. Чым адрозніваюцца даданыя параўнальныя часткі ад параўнальных зваротаў?
4. Чым адрозніваецца комплекснае падпарадкаванне ад сузалежнага і паслядоўнага?
5. На якія віды падзяляюцца складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі?

### Парадак разбору

*У ВНУ*

1. Назваць галоўную і даданую часткі, месца даданай часткі ў адносінах да галоўнай.
2. Да чаго адносіцца даданая частка (да слова, словазлучэння або да ўсёй галоўнай часткі); калі ёсць указальнае слова, то адзначыць.
3. Сродкі сувязі даданай часткі з галоўнай (злучнік, злучальнае слова).
4. Сэнсавыя адносіны паміж галоўнай і даданай часткамі, сродкі выражэння іх (злучнікі, злу-

*У школе*

1. Назваць галоўны і даданы сказы (зачытаць).
2. Да чаго адносіцца даданы сказ (да слова або да ўсяго галоўнага сказа).
3. Пры дапамозе чаго звязваецца даданы сказ з галоўным (злучніка, злучальнага слова).
4. На якое пытанне адказвае даданы сказ.

чальныя словы, парадак размяшчэння састаўных частак, указальныя словы, суадносныя формы і значэнні выказнікаў састаўных частак); на якое пытанне адказвае дадачая частка.

5. Тып дадатай часткі.

6. Знакі прыпынку.

7. Зрабіць сінтаксічны разбор галоўнай і дадатай частак.

5. Від (тып) дададзенага сказа (указваецца пасля вывучэння адпаведных дадзеных сказаў).

6. Растлумачыць знакі прыпынку.

7. Зрабіць сінтаксічны разбор галоўнага і дадатага сказаў.

## Узоры

*I.* [1] *Да тых мясцін,* [2] *дзе жыў калісь Купала,* [1] *не зарастуць травою дзікай сцежкі. (Шушк.)*

і. Сказ складаны, злучнікавы, складаназалежны, складаецца з галоўнай і дадатай часткі (зачытаць); дадатая частка стаіць у сярэдзіне галоўнай.

2. Дадатая частка адносіцца да назоўніка *мясцін*, паясняе яго, у галоўнай частцы пры назоўніку ёсць указальнае слова *тых*, якое з'яўляецца азначэннем.

3. Дадатая частка звязваецца з галоўнай пры дапамозе злучальнага слова *дзе* (у сказе з'яўляецца акалічнасцю).

4. Сэнсавыя адносіны паміж галоўнай і дадатай часткамі атрыбутыўныя з

1. Сказ складаны, злучнікавы, складаназалежны, складаецца з галоўнага і дадатага сказа (зачытаць); дадаты стаіць у сярэдзіне галоўнага.

2. Дадаты сказ адносіцца да назоўніка *мясцін,* пры якім ёсць указальнае слова *тых.*

3. Дадаты сказ звязваецца з галоўным пры дапамозе злучальнага слова *дзе.*

4. Дадаты сказ адказвае на пытанне: мясцін я к і х?

адценнем месца; сродкі выражэння іх: злучальнае слова, наяўнасць указальнага слова, парадак размяшчэння састаўных частак (даданая частка стаіць непасрэдна пасля назоўніка); даданая частка адказвае на пытанне: мясцін я к і х?

5. Складаназалежны сказ адначленнай канструкцыі з даданай азначальнай часткай.

6. Даданая частка ад галоўнай аддзяляецца коскай.

5. Складаназалежны сказ з даданым азначальным.

6. Даданы сказ ад галоўнага аддзяляецца коскай.

Схемы




*II. [1] Змоўклі ўсе вакол абшары, [2] бо замыслілі штось хмары. (К-с)*

1. Сказ складаны, злучнікавы, складаназалежны, складаецца з галоўнай і даданай часткі (зачытаць), даданая частка стаіць пасля галоўнай.

2. Даданая частка адносіцца да ўсёй галоўнай, паясняе яе.

3. Даданая частка звязваецца з галоўнай пры дапамозе злучніка *бо.*

4. Сэнсавыя адносіны паміж галоўнай і даданай часткамі прычынныя; сродкі выражэння іх: падпарадкавальны злучнік,

1. Сказ складаны, злучнікавы, складаназалежны, складаецца з галоўнага і даданага сказа (зачытаць), даданы сказ стаіць пасля галоўнага.

2. Даданы сказ адносіцца да ўсяго галоўнага.

3. Даданы сказ звязваецца з галоўным пры дапамозе злучніка *бо.*

4. Даданы сказ адказвае на пытанне: змоўклі ўсе вакол абшары ч а м у?, п а я к о й п р ы ч ы н е?

парадак размяшчэння састаўных частак (даданая частка звычайна стаіць пасля галоўнай), аднолькавыя трывальна-часавыя формы дзеясловаў-выказнікаў; даданая частка адказвае на пытанне: змоўклі ўсе вакол абшары ч а м у?, п а  я к о й  п р ы ч ы н е?

5. Складаназалежны сказ двухчленнай канструкцыі з даданай часткай прычыны.

6. Даданая частка ад галоўнай аддзяляецца коскай.

5. Складаназалежны сказ з даданым прычыны.

6. Даданы сказ ад галоўнага аддзяляецца коскай.

**Схемы**







*III. [1] Чым бліжэй мы падплывалі, [2] тым выразней вырысоўваўся лагодны ўзгорак палявога берагу, кусты... (Б.)*

1. Сказ складаны, злучнікавы, складаназалежны, складаецца з галоўнай і даданай часткі (зачытаць), даданая частка стаіць перад галоўнай.

2. Даданая частка адносіцца да ўсёй галоўнай, паясняе яе.

3. Даданая частка звязваецца з галоўнай пры дапамозе падвойнага злучніка *чым — тым.*

1. Сказ складаны, злучнікавы, складаназалежны, складаецца з галоўнага і даданага сказа (зачытаць), даданы сказ стаіць перад галоўным.

2. Даданы сказ адносіцца да ўсяго галоўнага.

3. Даданы сказ звязваецца з галоўным пры дапамозе парнага злучніка *чым — тым.*

| | |
|---|---|
| 4. Сэнсавыя адносіны паміж галоўнай і даданай часткамі пераўнальна-супастаўляльныя; сродкі выражэння іх: падвойны злучнік, парадак размяшчэння частак (даданая частка заўсёды стаіць перад галоўнай), наяўнасць формы вышэйшай ступені прыслоўя ў ролі выказніка; пытанне да даданай часткі паставіць нельга. | 4. Да даданага сказа пытанне паставіць нельга, сказы супастаўляюцца па змесце. |
| 5. Складаназалежны сказ двухчленнай канструкцыі з даданай супастаўляльнай часткай. | 5. Складаназалежны сказ з даданым параўнальным сказам. |
| 6. Даданая частка ад галоўнай аддзяляецца коскай. | 6. Даданы сказ аддзяляецца ад галоўнага коскай. |

### Схемы







#### Практыкаванне 29

Падкрэсліце ў галоўных частках словы, да якіх адносяцца даданыя часткі. Вызначце тыпы даданых частак і растлумачце знакі прыпынку, сінтаксічную ролю злучальных слоў.

1. Мы ганарымся тым, што мужныя сыны і дочкі беларускага народа заўсёды непахісна неслі непераможны сцяг вялікага Леніна. *(Бр.)* 2. Здавалася, што з вечнай ночы выплыў першы дзень на зямлі, белы, малады і марозліва-пахучы. *(Бр.)* 3. Усё, чым наша зямля багата, належыць майму дарагому народу. *(Панч.)* 4. На тое і шчупак у моры, каб карась не драмаў. *(К-с)* 5. Пачынаў Алёша часцей за ўсё з песень, бо любіў іх, сумныя, жаллівыя. *(Мел.)* 6. Пад Брэстам, ля самай граніцы, дзе першы прымалі мы бой, струменіць жывая крыніца пад

ціхай зялёнай вярбой. *(Пр.)* 7. Белы снег Радзіме лёг на плечы, нібы акрыў яе ў пуховы шаль. *(Зв.)* 8. Хоць дзень ужо змяніўся надвячоркам, але было досыць горача. *(К-с)* 9. Радзіма вам дала такія крылы, каб вас ніколі буры не змаглі. *(М. Т.)* 10. Дзе ўлада народа, там шчасце і свабода. *(Прык.)* 11. Кожны, хто глядзеў з кабіны самалёта на родную зямлю, адчуваў біццё свайго сэрца. *(Сам.)* 12. Пачынала світаць, так што Івану трэба было вяртацца. *(Грах.)* 13. Рэчка разлілася так шырока, як не разлівалася ўжо многа год... *(Шам.)* 14. Чым халадней, тым гучней гудуць паравозы, углядаючыся сваімі пукатымі бліскучымі вачыма ў далёкія агеньчыкі семафораў. *(Лыньк.)* 15. Шум стаіць над лясістай дубровай, быццам рада аб нечым ідзе. *(Куп.)* 16. Там, дзе была топкая дрыгва, кладзецца жыта, ячмень, пшаніца... *(В. В.)*

## Парадак разбору складаназалежных сказаў з некалькімі даданымі часткамі

| *У ВНУ* | *У школе* |
|---|---|
| 1. Вызначыць колькасць частак (прэдыкатыўных адзінак), назваць галоўную і даданыя. | 1. Назваць галоўны і даданыя сказы. |
| 2. Сродкі сувязі паміж часткамі складаназалежнага сказа (злучнік, злучальнае слова). | 2. Якімі злучнікамі ці злучальнымі словамі звязваюцца сказы. |
| 3. Тып сказа ў залежнасці ад будовы і ўзаемаадносін частак: складаназалежны з паслядоўным падпарадкаваннем, сузалежным або паралельным (аднародным і неаднародным), змешаным, комплексным падпарадкаваннем. | 3. Вызначыць від падпарадкавання (паслядоўнае, сузалежнае, змешанае). |
| 4. Сэнсавыя адносіны паміж часткамі і іх адценні. На якое пытанне адказваюць даданыя часткі, тып даданых частак. | 4. Вызначыць від даданых сказаў. |

5. Знакі прыпынку.

6. Зрабіць сінтаксічны разбор сказаў.

5. Растлумачыць знакі прыпынку.

6. Зрабіць сінтаксічны разбор сказаў.

## Узоры

*I.* [1] *Я кожны дзень хаджу на спатканне з табою, мой родны горад, хаджу і слухаю,* [2] *як шапоча лісце ў Купалаўскім скверы,* [3] *як шумяць над Свіслаччу вербы,* [4] *як весела смяюцца і спяваюць закаханыя пары. (Грах.)*

1. Сказ складаны, злучнікавы, складаназалежны з некалькімі дададзенымі, складаецца з чатырох частак — прэдыкатыўных адзінак (назваць галоўную (1) і даданыя (2, 3, 4).

2. Даданыя часткі звязваюцца з галоўнай пры дапамозе злучальнага слова *як* (у сказах выконвае функцыю акалічнасці).

3. Даданыя часткі адносяцца да галоўнай, паясняюць дзеяслоў-выказнік *слухаю*; па характары ўзаемаадносін частак — сказ з сузалежным падпарадкаваннем з аднароднымі даданымі часткамі.

4. Даданыя часткі дапаўняльныя, адказваюць на пытанне ш т о?

5. Паміж часткамі складанага сказа ставіцца коска, у галоўнай часткі выдзяляецца коскамі зваротак.

1. Сказ складаны, злучнікавы, складаназалежны, складаецца з чатырох простых сказаў (зачытаць галоўны (1) і даданыя (2, 3, 4).

2. Даданыя сказы звязваюцца з галоўным пры дапамозе злучальнага слова *як*.

3. Даданыя сказы залежаць ад галоўнага, паясняюць дзеяслоў-выказнік *слухаю*, падпарадкаванне сузалежнае з аднароднымі даданымі сказамі.

4. Даданыя сказы дапаўняльныя, адказваюць на пытанне ш т о?

5. Паміж галоўным і даданымі сказамі ставіцца коска, у галоўным сказе выдзяляецца коскамі зваротак.

## Схемы







*II.* [1] *Я хацеў бы,* [2] *каб песню маю,* [3] *што заўсёды стаяла ў страю непахісных адважных байцоў, слаўных сейбітаў, будаўнікоў,* [2] *не забылі ніколі сябры... (М. Т.)*

1. Сказ складаны, злучнікавы, складаназалежны з некалькімі дададымі, складаецца з трох частак — прэдыкатыўных адзінак (назваць галоўную (1) і дададыя (2, 3).

2. Першая дадаая частка (2) звязваецца з галоўнай (1) пры дапамозе злучніка *каб*, другая дадаая (3) з першай дадаай (2) — пры дапамозе злучальнага слова *што* (у сказе яно выконвае функцыю дзейніка).

3. Першая дадаая частка (2) адносіцца да галоўнай (1), паясняе дзеяслоў-выказнік *хацеў бы*, другая дадаая (3) адносіцца да першай (2), паясняе назоўнік *песню*, падпарадкаванне паслядоўнае. 1-я дадаая 1-й ступені, 2-я дадаая — 2-й ступені.

4. Сэнсавыя адносіны паміж галоўнай (1) і першай дадаай (2) часткамі аб'ектныя з дадатковым адценнем пажадання, паміж першай (2) і другой

1. Сказ складаны, злучнікавы, складаназалежны з некалькімі дададымі, складаецца з трох простых сказаў (зачытаць галоўны (1) і дададыя (2, 3).

2. Першы дадаы (2) звязваецца з галоўным (1) пры дапамозе злучніка *каб*, другі дадаы (3) з першым дадаым (2) — пры дапамозе злучальнага слова *што*.

3. Першы дадаы сказ (2) залежыць ад галоўнага (1), паясняе дзеяслоўвыказнік *хацеў бы*, другі дадаы (3) залежыць ад першага дадаага (2), паясняе назоўнік *песню*, падпарадкаванне паслядоўнае. 1-ы дадаы — 1-й ступені, 2-і дадаы — 2-й ступені.

4. Першы (2) дадаы сказ дапаўняльны, адказвае на пытанне ш т о?, другі (3) — азначальны, адказвае на пытанне я к у ю?

(3) даданымі — атрыбутыўныя з аб'ектным адценнем: першая (2) даданая частка дапаўняльная, адказвае на пытанне ш т о?, другая (3) — азначальная, адказвае на пытанне я к у ю?

5. Часткі складаназалежнага сказа аддзяляюцца коскамі.

5. Паміж галоўным і даданымі сказамі ставіцца коска.

### Схемы




*III. [1] Мы прыйшлі ў мястэчка ноччу і, [2] каб не пераходзіць чыгункі, [3] дзе лёгка было нарвацца на нямецкі патруль, [1] спыніліся ў Міколкавага дзеда, [4] двор якога стаяў наводшыбе. (І. Н.)*

1. Сказ складаны, злучнікавы, складаназалежны з некалькімі даданымі, складаецца з чатырох частак (назваць галоўную (1) і даданыя (2, 3, 4).

2. Першая (2) даданая частка з галоўнай (1) звязваецца пры дапамозе злучніка *каб*, трэцяя (4) даданая — пры дапамозе злучальнага слова *якога* (у сказе выступае ў ролі азначэння); другая (3) даданая з першай (2) даданай звязваецца пры да-

1. Сказ складаны, злучнікавы, складаназалежны з некалькімі даданымі, складаецца з чатырох сказаў (назваць галоўны (1) і даданыя (2, 3, 4).

2. Першы даданы сказ (2) з галоўным (1) звязваецца пры дапамозе злучніка *каб*, трэці (4) — пры дапамозе злучальнага слова *якога*; другі (3) даданы сказ звязваецца з першым (2) даданым пры дапамозе злучальнага слова *дзе*.

памозе злучальнага слова *дзе* (у сказе выступае ў ролі акалічнасці).

3. Першая (2) і трэцяя (4) даданыя часткі адносяцца да галоўнай (1), першая даданая (2) паясняе ўсю галоўную, трэцяя (4) — назоўнік *дзеда*; другая (3) даданая адносіцца да першай (2) даданай, паясняе назоўнік *чыгункі*; паводле ўзаемаадносін частак — сказ складаназалежны са змешаным падпарадкаваннем.

4. Сэнсавыя адносіны паміж галоўнай (1) і першай даданай (2) часткамі мэтавыя, паміж галоўнай (1) і трэцяй (4) даданай — атрыбутыўныя з якасным адценнем, паміж першай (2) і другой (3) даданымі — атрыбутыўныя з адценнем месца. Першая (2) даданая частка мэты, адказвае на пытанне з якой мэтай?, другая (3) і трэцяя (4) — азначальныя, адказваюць на пытанні якой?, якога?

5. Часткі складанага сказа раздзяляюцца коскамі.

3. Першы (2) і трэці (4) даданыя сказы залежаць ад галоўнага, першы (2) паясняе ўвесь галоўны сказ, трэці (4) — назоўнік *дзеда*; другі (3) даданы залежыць ад першага (2) даданага, паясняе назоўнік *чыгункі*; падпарадкаванне змешанае.

4. Першы (2) даданы сказ мэты, адказвае на пытанне з якой мэтай?, другі (3) і трэці (4) — даданыя азначальныя, адказваюць на пытанні якой?, якога?

5. Паміж галоўным і даданым сказамі ставіцца коска.

## Схемы




*IV.* [1] *Васіль уявіў,* [2] *што* [3] *каб гэтак напісалі пра яго самога,* [2] *дык ён, мусіць, не перанёс бы такой ганьбы. (Кул.)*

1. Сказ складаны, злучнікавы, складаназалежны, складаецца з трох частак — прэдыкатыўных адзінак (назваць галоўную (1), даданыя (2, 3).

2. Часткі звязаны пры дапамозе злучнікаў *што*, *каб — дык*.

3. Галоўная частка падпарадкоўвае даданую, на месцы якой знаходзіцца таксама складаназалежны сказ (які адносіцца да галоўнай толькі як адзіны комплекс); даданая канструкцыя паясняе ў галоўнай дзеяслоў *уявіў*; паводле ўзаемаадносін частак сказ складаназалежны з комплексным падпарадкаваннем. [1]

4. Сэнсавыя адносіны паміж часткамі аб'ектныя,

1. Сказ складаны, злучнікавы, складаназалежны, складаецца з трох сказаў (назваць галоўны (1) і даданыя (2, 3).

2. Першы даданы (2) звязваецца з галоўным пры дапамозе злучніка *што*, другі даданы (3) з першым (2) — пры дапамозе злучніка *каб — дык*.

3. Першы даданы сказ (2) залежыць ад галоўнага (1), паясняе дзеяслоў *уявіў*; другі (3) залежыць да першага даданага (2), падпарадкаванне паслядоўнае; першы даданы (2) — 1-й ступені, другі даданы (3) — 2-й ступені.

4. Першы даданы (2) дапаўняльны, адказвае на

[1] У школьным падручніку такое падпарадкаванне не разглядаецца. Гл.: *Клюсаў Г. Н., Юрэвіч А. Л.* Сучасная беларуская пунктуацыя.— 2-е выд.— Мн., 1972.— С. 209—214.

даданая канструкцыя адказвае на пытанне ш т о? Сказ складаназалежны з даданай дапаўняльнай часткай комплексна-блочнай канструкцыі.

5. Галоўная і даданая часткі раздзяляюцца коскай, паміж сумежнымі злучнікамі *што каб* коска не ставіцца, паколькі далей ёсць другая частка падпарадкавальнага злучніка — *дык* (пропуск даданай часткі, звязанай пры дапамозе злучніка *каб — дык*, парушае структуру сказа).

пытанне ш т о?, другі (3) — умовы, адказвае на пытанне п р ы я к о й у м о в е?

5. Галоўны (1) і даданыя сказы (2) раздзяляюцца коскай, паміж злучнікамі *што каб* коска не ставіцца, паколькі далей ідзе другая частка парнага злучніка *дык (каб — дык)*.

## Схемы







### Практыкаванне 30

Растлумачце будову складаных сказаў, зрабіце схемы іх. Пастаўце знакі прыпынку.

1. Люблю прыпыніцца на плошчы Перамогі дзе ля падножжа велічнага абеліска палыхае вечны агонь — агонь нашай нязгаснай любві і ўдзячнасці тым хто загінуў за тваё вызваленне ад фашысцкага рабства. *(Гіл.)* 2. І так ярка прыпомнілася яму [Сцёпку] свая вёска што каб меў кryллі то ўзняўся б і паляцеў бы. *(К-с)* 3. І за радасць што з намі ад самага мала на вялікіх жыццёвых шляхах сябравала і за тое што ўмее любіць без дакораў свайго краю прастор яго сонца і зоры і за песню якую калісь ля калыскі ты спявала для нас марай ззяючы ў хаце каб шчасліва жылі мы паклон табе нізкі наша родная маці.

*(Кір.)* 4. Не дзіва што тут каля крынічкі кіпела жыццё бо кожнаму хацелася стаць бліжэй да вады, каб палюбавацца на сваё ўласнае хараство ў яе люстры, як гэта любілі рабіць прыгожыя краскі. *(К-с)* 5. Вецер зайшоў з вострава. Сыры і густы ён падзьмуў па палудні з-за ракі на Выганчык гонячы мокрыя калючыя наабіваныя зялёныя іголкі што адмерзлі за зіму ў маразы і тонкую як папера жоўтую сасновую кару з верхавін якая блішчала на зямлі мокнучы на снезе. *(Пташн.)* 6. Пасёлак Шушанскі. Хоць нам вядома што мы спазніліся прыйсці сюды і Леніна ўжо не застанем дома ён у дарозе дальняй як заўжды мы накіроўваемся да сядзібы якая тоне ў зяляніне дрэў каб паглядзець на двор на тыя шыбы ў якія некалі і ён глядзеў. *(М. Т.)* 7. Ёсць такі час калі ўсё выспявае і нішто не трывожыць тады велічнага спакою які ахоўвае расліны што безліччу каласоў насяляюць зямлю. *(Бр.)*

### *БЯЗЗЛУЧНІКАВЫ СКЛАДАНЫ СКАЗ*

Мэта разбору — вызначыць структурныя часткі бяззлучнікавага сказа, сродкі сувязі і сэнсавыя адносіны паміж часткамі.

Пры разборы бяззлучнікавых сказаў варта ўказваць на суадноснасць іх са складаназлучанымі і складаназалежнымі сказамі,[1] што дапамагае вызначыць сэнсавыя адносіны паміж часткамі сказа.

#### Пытанні

1. Чым адрозніваюцца бяззлучнікавыя сказы ад іншых відаў складаных сказаў?

2. На якія групы падзяляюцца бяззлучнікавыя сказы паводле сэнсавых адносін паміж часткамі?

#### Парадак разбору

| *У ВНУ* | *У школе* |
|---|---|
| 1. Назваць часткі (прэдыкатыўныя адзінкі). Зачытаць. | 1. Назваць простыя сказы, якія ўваходзяць у састаў складанага бяззлучнікавага сказа. |

[1] Асобныя складаныя бяззлучнікавыя сказы суадносяцца і са складаназлучанымі сказамі і са складаназалежнымі.

| | |
|---|---|
| 2. Тып бяззлучнікавага сказа ў залежнасці ад структуры і значэння састаўных частак (з аднатыпнымі ці разнатыпнымі часткамі). | 2. — |
| 3. Сінанімічны ці несінанімічны злучнікаваму складанаму (складаназлучанаму або складаназалежнаму) сказу. | 3. — |
| 4. Сэнсавыя адносіны паміж часткамі: а) у сказе з аднатыпнымі часткамі — адносіны адначасовасці або паслядоўнасці, супастаўляльныя, прычынна-выніковыя; б) у сказе з разнатыпнымі часткамі — аб'ектныя, суб'ектныя, прычынна-выніковыя, уступальныя, часу, умовы, далучальныя (са значэннем дадатковага дзеяння, тлумачэння) і г. д. | 4. Што выражаецца ў сказах: пералічэнне дзеянняў або фактаў, прычына, час, умова; другі сказ (ці некалькі сказаў) дапаўняе, раскрывае сэнс першага. |
| 5. Граматычныя сродкі, якія выражаюць пэўныя адносіны (інтанацыя, парадак размяшчэння частак і слоў у іх, відачасавыя формы дзеясловаў-выказнікаў і інш.). | 5. — |
| 6. Растлумачыць знакі прыпынку. | 6. Растлумачыць знакі прыпынку. |
| 7. Зрабіць сінтаксічны разбор кожнага сказа. | 7. Зрабіць сінтаксічны разбор кожнага сказа. |

## Узоры

*I.* [1] *Заднія танкі цесна згрудзіліся ў адну кучу,* [2] *пад'язджалі грузавікі з аўтаматчыкамі,* [3] *паволі пасоўвалася артылерыйская батарэя. (Лыньк.)*

| | |
|---|---|
| 1. Складаны бяззлучнікавы сказ, складаецца з трох частак (назваць). | 1. Складаны бяззлучнікавы сказ, складаецца з трох простых сказаў (зачытаць). |
| 2. Сказ з аднатыпнымі часткамі. | 2. — |
| 3. Бяззлучнікавы сказ сінанімічны складаназлучанаму: *Заднія танкі згрудзіліся ў адну кучу, потым пад'язджалі грузавікі з аўтаматчыкамі, затым пасоўвалася артылерыйская батарэя.* | 3. — |
| 4. Паміж часткамі выражаюцца адносіны паслядоўнасці (дзеянні, аб якіх паведамляецца ў частках, адбываюцца адны за другімі). | 4. У сказах (з дапамогай пералічальнай інтанацыі) пералічваюцца падзеі. |
| 5. Паслядоўнасць дзеянняў перадаецца пералічальнай інтанацыяй, парадкам размяшчэння састаўных частак, трывальна-часавымі формамі дзеясловаў - выказнікаў прошлага часу (закончанага і незакончанага трывання). | 5. — |
| 6. Часткі цесна сэнсава звязаны, раздзяляюцца коскамі. | 6. Паміж простымі сказамі, якія не залежаць адзін ад аднаго, але цесна сэнсава звязаны, ставіцца коска. |

## Схемы




*II.* [1] *Дажджы пройдуць* — [2] *грыбоў вазамі вазі... (Кул.)*

| | |
|---|---|
| 1. Складаны бяззлучнікавы сказ, складаецца з дзвюх частак (зачытаць). | 1. Складаны бяззлучнікавы сказ, складаецца з двух сказаў (зачытаць). |
| 2. Сказ з разнатыпнымі часткамі. | 2. — |
| 3. Бяззлучнікавы сказ сінанімічны складаназалежнаму з даданай часткай умовы: *Калі пройдуць дажджы, то грыбоў вазамі вазі...* | 3. — |
| 4. Сэнсавыя адносіны паміж часткамі ўмоўна-вынiковыя: 1-я абазначае ўмову, 2-я — вынік (можна паставіць пытанне п р ы   я к о й   у м о в е?). | 4. 1-ы сказ абазначае ўмову, пры якой адбываецца дзеянне, выражанае ў 2-м сказе. |
| 5. Умоўна-выніковыя адносіны перадаюцца парадкам састаўных частак (прэдыкатыўная адзінка са значэннем выніку на другім месцы), граматычным значэннем выказнікаў састаўных частак (у 1-й выражаецца дзеясловам абвеснага ладу, у 2-й — загаднага). | 5. — |
| 6. Паміж часткамі складанага бяззлучнікавага сказа з умоўна-выніковымі адносінамі ставіцца працяжнік. | 6. Паміж сказамі ставіцца працяжнік. |

**Схемы**

[ 1 ] — [ 2 ]      [ 1 ] — [ 2 ]

*III. [1] Любіце кнігу: [2] у ёй найбольшы смак жыцця. (Б.)*

| | |
|---|---|
| 1. Складаны бяззлучнікавы сказ, складаецца з дзвюх частак (зачытаць). | 1. Складаны бяззлучнікавы сказ, складаецца з двух сказаў (зачытаць). |

| | |
|---|---|
| 2. Сказ з разнатыпнымі часткамі. | 2. — |
| 3. Бяззлучнікавы сказ сінанімічны складаназалежнаму з даданай часткай прычыны: *Любіце кнігу, бо ў ёй найбольшы смак жыцця.* | 3. — |
| 4. Сэнсавыя адносіны паміж часткамі прычынныя: у 2-й частцы выражаецца прычына таго, пра што гаворыцца ў 1-й (можна паставіць пытанні: чаму?, па якой прычыне?). | 4. 2-і сказ выражае прычыну таго, пра што гаворыцца ў 1-м сказе. |
| 5. Прычынныя адносіны перадаюцца інтанацыяй, парадкам састаўных частак. | 5. — |
| 6. Паміж часткамі бяззлучнікавага сказа з адносінамі прычыны ставіцца двукроп'е. | 6. Паміж сказамі ставіцца двукроп'е. |

### Схемы



#### Практыкаванне 31

Зрабіце разбор бяззлучнікавых складаных сказаў. Растлумачце знакі прыпынку.

1. То не струны звіняць галасістыя — зашумела жытцо каласістае. *(Маш.)* 2. З даўніх часоў кажуць: праца спорыцца пры песні. *(К. Б.)* 3. Патрэскваў касцёр, ляцелі ўгару іскры, гаслі ў паветры і чорнымі кропкамі падалі на зямлю. *(Гур.)* 4. Гаварыла яна гладка і звонка — бацька толькі паглядаў ды задаволена ўсміхаўся. *(Кул.)* 5. Душу поўніла святочная радасць: вось ён, той даўно чаканы дзень. *(Мел.)* 6. Дагарала зара ў небакраі, на зямлю ноч спакойна лягла. *(Зв.)* 7. Лес быў рэдкі, паміж дрэваў за недалёкім узлескам добра віднелася куп'істае

балота. *(Мел.)* 8. Рана ў поле выязджай — лепшы будзе ўраджай. *(Прык.)* 9. З туманам пачынала пахнуць дымам: за лета высахла скошанае балота, гарэў торф. Яго тушылі ўсё лета і не маглі патушыць: тлеў глыбока ў зямлі, не дакапацца, не заліць вадой. *(Пташн.)* 10. Нечакана адбылося незвычайнае: ціхая, нявідная ў жнівеньскім росквіце, рабіна заружавела, зазырчэла яркім кідкім хараством, гарачым полымем агністых гронак. *(Мел.)* 11. Ціха трапечуцца лісці зялёныя, з ветрыкам мову вядуць; вішні, узняўшыся белай каронаю, быццам дзяўчаты, цвітуць. *(К-с)*

### *КАМБІНАВАНЫ СКЛАДАНЫ СКАЗ (З РОЗНЫМІ ВІДАМІ СУВЯЗІ)*

Састаўныя часткі камбінаваных сказаў звязваюцца рознай сінтаксічнай сувяззю: злучэннем і падпарадкаваннем; злучэннем і бяззлучнікавай сувяззю; падпарадкаваннем і бяззлучнікавай сувяззю; злучэннем, падпарадкаваннем і бяззлучнікавай сувяззю.

Пры разборы такіх сказаў неабходна вызначыць асноўныя структурна-сэнсавыя адзінкі (часткі-блокі) [1], сувязь паміж імі. Затым даецца характарыстыка састаўных частак (вызначаюцца віды сувязі паміж прэдыкатыўнымі адзінкамі, від дададзенай часткі (калі яна ёсць), да чаго адносіцца дададзеная частка).

### Пытанне

Якія віды камбінаваных сказаў можна выдзеліць паводле іх структуры?

### Парадак разбору

*У ВНУ*

1. Тып складанага сказа паводле структуры і сродкаў сувязі прэдыкатыўных адзінак.

*У школе*

1. Назваць від сувязі сказаў: злучнікавая (злучальная, падпарадкавальная), бяззлучнікавая.

---

[1] Для гэтага неабходна вызначыць граматычную аснову ў кожнай частцы, выдзеліць прэдыкатыўныя адзінкі, абазначыць іх парадкавымі лічбамі.

2. Вызначыць колькасць прэдыкатыўных адзінак (простых сказаў). Зачытаць.

3. Назваць структурна-сэнсавыя часткі складанага камбінаванага сказа, якія характарызуюцца больш цеснай сэнсавай сувяззю (зачытаць).

4. Від сувязі паміж асноўнымі структурнымі часткамі.

5. Структурная характарыстыка такіх частак.

6. Растлумачыць знакі прыпынку.

7. Зрабіць разбор кожнай часткі складанага сказа.[1]

2. Вызначыць колькасць простых сказаў, якія ўваходзяць у састаў складанага (зачытаць).

3. Вызначыць часткі, з якіх складаецца сказ (просты, складаназлучаны, складаназалежны).

4. —

5. Даць характарыстыку кожнай часткі.

6. Растлумачыць знакі прыпынку.

7. Зрабіць разбор частак складанага сказа.[1]

## Узоры

*I.* I. [1] *Лабановіч пастаяў з хвілінку, праводзячы вачамі поезд, завёзшы яго ў гэты ціхі куток,* [2] *дзе пачнецца новае жыццё;* II. [3] *прамільгнула думка,* [4] *што знікшы на павароце чыгункі поезд паклаў сабою рубеж паміж тым,* [5] *што было раней, і тым,* [6] *што будзе наперадзе. (К-с)*

1. Складаны камбінаваны сказ з бяззлучнікавай і падпарадкавальнай злучнікавай сувяззю.

2. Складаецца з шасці частак (простых сказаў). Зачытаць.

3. Часткі аб'ядноўваюцца ў дзве асноўныя структурныя адзінкі (часткі): 1-я і 2-я — першая адзінка, 3-я, 4-я, 5-я, 6-я —

1. Складаны сказ з рознымі відамі сувязі: бяззлучнікавай і падпарадкавальнай.

2. Складаецца з шасці простых сказаў (зачытаць).

3. Простыя сказы аб'ядноўваюцца ў дзве часткі: 1-ы і 2-і сказы — першая частка, 3-і, 4-ы, 5-ы, 6-ы — другая частка.

---

[1] Кожная частка разбіраецца асобна як просты або складаны сказ па дадзеных вышэй схемах.

другая структурная адзінка.

4. 1-я і 2-я структурныя часткі звязаны бяззлучнікавай сувяззю.

5. Першая частка — складаназалежны сказ, другая — складаназалежны з трыма даданымі са змешаным падпарадкаваннем.

6. Часткі складанага камбінаванага сказа раздзяляюцца коскамі; паміж развітымі структурнымі часткамі (адзінкамі), звязанымі бяззлучнікавай сувяззю, ставіцца кропка з коскай.

4. —

5. Першая частка — складаназалежны сказ, другая — складаназалежны з трыма даданымі са змешаным падпарадкаваннем.

6. Простыя сказы, якія ўваходзяць у састаў складанага, аддзяляюцца коскамі; паміж часткамі (якія маюць свае знакі прыпынку), звязанымі бяззлучнікавай сувяззю, ставіцца кропка з коскай.

**Схемы**







*II. [I.] [1] Трэба было адпачыць, [II.] [2] але Іван адчуваў, [3] што [4] калі ўпадзе ў снег, [3] то, напэўна, болей ужо не ўстане. (В. Б.)*

1. Складаны камбінаваны сказ са злучальнай і падпарадкавальнай злучнікавай сувяззю.

2. Складаецца з чатырох частак (назваць).

3. Часткі аб'ядноўваюцца ў дзве асноўныя структурныя адзінкі (часткі): 1-я частка — першая адзінка, 2-я, 3-я, 4-я — другая адзінка.

1. Складаны сказ з рознымі відамі сувязі: злучальнай і падпарадкавальнай.

2. Складаецца з чатырох простых сказаў (назваць).

3. Простыя сказы аб'ядноўваюцца ў дзве часткі: 1-ы сказ — першая частка, 2-і, 3-і, 4-ы — другая частка.

4. I і II структурныя адзінкі звязаны злучальнай сувяззю (злучнікам *але*).

5. Першая структурная частка (адзінка) — просты сказ, другая — складаназалежны з комплексным падпарадкаваннем.

6. Часткі складанага сказа раздзяляюцца коскамі; паміж сумежнымі злучнікамі *што калі* коска не ставіцца, паколькі далей ёсць другая частка падпарадкавальнага злучніка *то* (пропуск дадзенай часткі, звязанай пры дапамозе злучніка *калі — то*, парушае структуру сказа).

4. —

5. Першая частка — просты сказ, другая — складаназалежны з паслядоўным падпарадкаваннем.

6. Паміж простымі сказамі, якія ўваходзяць у складаны, ставіцца коска; паміж злучнікамі *што калі* коска не ставіцца, паколькі пасля дадзенага сказа ёсць другая частка парнага злучніка *то (калі — то)*.

**Схемы**




*III. [1] Калі апускаецца над ракою глухая палеская ноч, [2] тады памалу заціхае горад Пінск, [3] маўклівымі робяцца вуліцы і завулкі і [4] рэдкія крокі прахожых рэхам аддаюцца ў каменных сценах. (Лыньк.)*

1. Камбінаваны складаны сказ з падпарадкавальнай, бяззлучнікавай і злучальнай сувяззю.

2. Складаецца з чатырох простых частак (назваць).

1. Складаны сказ з рознымі відамі сувязі: падпарадкавальнай, бяззлучнікавай, злучальнай.

2. Складаецца з чатырох простых сказаў (назваць).

3. —
4. —
5. У сказе тры галоўныя часткі, звязаныя бяззлучнікавай (2, 3) і злучнікавай (3, 4) сувяззю, маюць пры сабе адну даданую частку (1), якая звязваецца з галоўнымі пры дапамозе падпарадкавальнага злучніка *калі*.

6. Часткі складанага сказа раздзяляюцца коскамі, аднародныя галоўныя часткі звязаны злучнікам *і*, адносяцца да агульнай даданай часткі, коскай не раздзяляюцца.

3. —
4. —
5. У сказе тры галоўныя і адзін даданы сказ, які адносіцца да ўсіх галоўных і звязаны з імі злучнікам *калі*; галоўныя сказы паміж сабой звязаны бяззлучнікавай (2, 3) і злучнікавай (3, 4) сувяззю.

6. Сказы раздзяляюцца коскамі. Перад злучнікам *і*, які звязвае аднародныя галоўныя сказы, коска не ставіцца.

**Схемы**







**Практыкаванне 32**

Растлумачце будову камбінаваных сказаў, зрабіце схемы. Пастаўце знакі прыпынку.

1. На паляне дзе стаяла невялікая леснічоўка ярка свяціла сонца і чуліся розныя галасы лясных птушак. *(Мік.)* 2. Яшчэ цвілі познія палявыя кветкі, а на месцы тых што адцвілі ў канцы лета даспявала і сеялася на зямлю насенне — чорныя шэрыя і жоўтыя зярняткі якімі так любяць ласавацца дробныя птушкі *(К. Ч.)* 3. Мой таварыш сяржант Ваня Савельеў з якім мы разам дайшлі да Эльбы многа чуў ад мяне пра маё Забалоцце гэты шчыры алтайскі хлопец піянерскае дзяцінства і камсамольская маладосць якога былі бясхмарнымі ў параўнанні з суровым пачаткам майго жыцця слухаў мае расказы аб мінулым як нейкую недарэчную казку. *(Б.)* 4. Па чаргаванні гукаў дзед Талаш устанавіў што гэта

ішоў чалавек але гэта былі не Панасавы крокі ступаў хтось грамозны грузна і цяжка. *(К-с)* 5. На лузе не крычалі ўжо цэлымі зграямі маладыя шпачкі і хоць нідзе не купчасцеў не шарэў вострым верхам ні адзін стог лета канчалася і тут трава змізарнела раптам. *(Сач.)* 6. Калі ў хаце зусім прымоўклі бо кожны перабіраў свае думкі каб выбраць нейкую трапную важную якой можна было б падзяліцца з другімі людзьмі у сенцах рыпнулі дзверы і цераз парог не чакаючы асабістага запрашэння важна пераступіў Канапелька. *(Лыньк.)* 7. Ленінскі праспект. Сама па сабе гэтая назва выклікае ў нашых сэрцах пачуццё глыбокай пашаны і шчырага пакланення але калі яна яшчэ ўвасоблена ў ясна бачныя захапляючыя цудоўныя абрысы то наводзіць на роздум пра веліч спраў нашага народа і пра вытокі гэтых спраў. *(Хадк.)*

## СКАЗ З ПРОСТАЙ МОВАЙ

Пры разборы сказаў з простай мовай неабходна вызначыць структуру сказа, месца простай мовы ў адносінах да слоў аўтара, характар інтанацыі.

У школьным падручніку сінтаксічны разбор сказа з простай мовай не даецца, аднак прапанаваны парадак разбору такіх сказаў адпавядае патрабаванням школьнай праграмы.

### Пытанні

1. Якую ролю адыгрываюць словы аўтара пры простай мове?
2. У чым асаблівасці няўласна-простай мовы?

### Парадак разбору

| *У ВНУ* | *У школе* |
|---|---|
| 1. Тып сказа па структуры. | 1. Указаць, які сказ паводле будовы. |
| 2. Назваць простую мову і словы аўтара. | 2. Назваць простую мову і словы аўтара. |
| 3. Сувязь простай мовы са словамі аўтара. | 3. — |

4. Месца простай мовы ў адносінах да слоў аўтара.

5. Растлумачыць знакі прыпынку.

6. Зрабіць разбор сказаў, якія ўваходзяць у склад простай мовы і аўтарскага сказа (слоў аўтара).[1]

4. Месца простай мовы ў адносінах да слоў аўтара.

5. Растлумачыць знакі прыпынку.

6. Зрабіць разбор простай мовы і слоў аўтара.

## Узоры

*I. «Якая прыгажосць! — сказаў Мацей, і ў вачах на момант успыхнула незразумелая мне туга.— Чуеш, як птушкі спяваюць?» (Лупс.)*

1. Сказ з простай мовай.

2. Простая мова — *Якая прыгажосць; Чуеш, як птушкі спяваюць* — складаецца з двух сказаў: першы — просты, другі — складаназалежны. Словы аўтара — *сказаў Мацей, і ў вачах на момант успыхнула незразумелая мне туга* (сказ складаназлучаны).

3. Аўтарскія словы і простая мова звязаны па сэнсе і інтанацыйна.

4. Словы аўтара стаяць у сярэдзіне простай мовы.

5. Простая мова бярэцца ў двукоссе; словы аўтара раздзяляюць простую мову там, дзе павінен стаяць клічнік, перад словамі аўтара ставіцца клічнік і працяжнік, пасля

1. Сказ з простай мовай.

2. Простая мова — *Якая прыгажосць; Чуеш, як птушкі спяваюць*. Простая мова складаецца з двух сказаў: першы сказ просты, другі — складаназалежны. Словы аўтара — *сказаў Мацей, і ў вачах на момант успыхнула незразумелая мне туга* (сказ складаназлучаны).

3. —

4. Словы аўтара стаяць у сярэдзіне простай мовы.

5. Простая мова бярэцца ў двукоссе; словы аўтара стаяць на мяжы самастойных сказаў, дзе стаяў бы клічнік, перад словамі аўтара ставіцца клічнік і працяжнік (сказ

[1] Сказы разбіраюцца як простыя ці складаныя.

іх — кропка і працяжнік; другая частка простай мовы пачынаецца з вялікай літары; пасля яе ставіцца пытальнік (сказ пытальны па інтанацыі). Коскай раздзяляюцца часткі складаназалежнага сказа. У аўтарскім сказе коскай раздзяляюцца часткі складаназлучанага сказа.

клічны па інтанацыі), пасля іх — кропка і працяжнік; другая частка простай мовы пачынаецца з вялікай літары; пасля яе ставіцца пытальнік (сказ пытальны па інтанацыі). У простай мове коска ставіцца паміж галоўным і даданым сказамі. У словах аўтара коска ставіцца паміж простымі сказамі ў складаназлучаным.

**Схемы** [1]

«П_____! — а____. — П_____?»

«П! — [а]. — П?»

*II. «Мядовы сёння дзень»,— думае Міхалка, пазіраючы на ляток вулля. (Як.)*

1. Сказ з простай мовай.

2. Простая мова — *Мядовы сёння дзень* — просты сказ, словы аўтара — *думае Міхалка, пазіраючы на ляток вулля* — просты сказ, ускладнены дзеепрыслоўным словазлучэннем.

3. Аўтарскія словы і простая мова звязаны па сэнсе і інтанацыйна.

4. Простая мова стаіць перад словамі аўтара.

5. Простая мова бярэцца ў двукоссе, пасля яе ставіцца коска і працяжнік (сказ апавядальны).

1. Сказ з простай мовай.

2. Простая мова — *Мядовы сёння дзень* — просты сказ, словы аўтара — *думае Міхалка, пазіраючы на ляток вулля* — просты сказ.

3. —

4. Простая мова стаіць перад словамі аўтара.

5. Простая мова бярэцца ў двукоссе, пасля яе ставіцца коска і працяжнік (сказ апавядальны).

---

[1] Абедзвюма схемамі можна карыстацца і ў школе і ў ВНУ.

### Схемы

«П__________», — а_ _ _ _ _ _ _ _. «П», — [ а ].

**Практыкаванне 33**

Зрабіце разбор сказаў, растлумачце знакі прыпынку.

1. На брустверы акопа, у траншэях раслі маладыя бярозкі і асіны... Алеся, паказваючы гэта Лідзе, сказала: «Вось яна, сіла жыцця. Пройдзе яшчэ некалькі год, і цяжка будзе пазнаць, што тут жылі людзі, якія аддавалі ўсё дзеля перамогі, дзеля шчасця народнага». *(Шам.)* 2. «Чалавек, які сустракаецца з вучнямі толькі на ўроку, па адзін бок настаўніцкага стала,— не ведае дзіцячае душы, а хто не ведае дзіцяці, той не можа быць выхавацелем»,— пісаў Сухамлінскі. *(Віт.)* 3. «Эх, каб дожджык! — не раз думаў Лагуновіч, з надзеяй пазіраючы ўгору.— Вось было б добра!» *(Мел.)* 4. Дзед расказаў гісторыю пра вепра і закончыў яе так: «Я, таварышы, рашыў падараваць вепра вам, чырвоныя ваякі». *(К-с)* 5. Яны [пагранічнікі] успамінаюць тое, што перажывалі:

— Памятаеш чыгуначны мост цераз Сан? — пытае адзін з іх.

— Каля яго быў самы цяжкі і самы першы бой у маім жыцці. Мы былі там з лейтэнантам Нячаевым. Разам з дзевяноста дзевятай дывізіяй і не думалі адступаць. «Перамышль наш»,— пісалі тады газеты... *(Нях.)* 6. Настаўнік чуў, што яму чагось не стае, чуў, што яму трэба нешта зрабіць, чымся заняцца. Чым? Ён думаў, разважаў... Не! Трэба куды-небудзь пайсці, проста зняцца з месца і ісці. Але куды пайсці? Зайсці да каго? *(К-с)* 7. Калі цягнік адыходзіць ад станцыі, Андрэй заўсёды просам просіць: «Родненькі, галубочак мой, дай жа я правяду крыху». *(Лыньк.)* 8. «Што самае галоўнае было ў маім жыцці?» — пытаецца сам у сябе Васіль Сухамлінскі. І дае вычарпальны адказ: «Любоў да дзяцей». *(Віт.)*

## ПУНКТУАЦЫЙНЫ РАЗБОР

Пунктуацыйны разбор цесна звязаны з аналізам сінтаксічнай структуры сказа, паколькі пастаноўка знакаў прыпынку абумоўлена структурнымі асаблівасцямі сказа, сэнсавымі адносінамі паміж яго часткамі.

Як у школе, так і ў ВНУ ён можа ўключацца ў сінтаксічны разбор, калі пры вызначэнні структуры сказа даецца і тлумачэнне знакаў прыпынку, можа быць і як самастойны від аналізу, калі тлумачацца ўсе знакі прыпынку, якія ёсць у сказе.

Па форме правядзення пунктуацыйны разбор можа быць вусны і пісьмовы. Пры пісьмовым запісваецца толькі (словам ці словазлучэннем) сінтаксічная адзінка, якая пунктуацыйна афармляецца, але не ўказваецца ўмова, паводле якой пастаўлены знак прыпынку. Напрыклад: *А круглаверхія асіны разносяць нейкія навіны і так гутораць* [1], *так смяюцца,* [2] *што аж іх лісцікі трасуцца. (К-с)* 1 — аднародныя члены сказа, 2 — складаназалежны сказ. Пры пісьмовым разборы могуць выкарыстоўвацца таксама схемы: [О, О] (коска пры аднародных членах сказа *гутораць, смяюцца*) і інш.

Больш пашыраны вусны разбор, калі тлумачыцца той ці іншы знак прыпынку, фармулюецца правіла пастаноўкі яго.

Па аб'ёме пунктуацыйны разбор у школе і ВНУ можа быць поўны і частковы. Пры поўным разборы тлумачацца ўсе знакі прыпынку, якія ёсць у сказе. Больш шырока ён практыкуецца ў ВНУ, асабліва пры паўтарэнні матэрыялу. Частковы разбор практыкуецца пры вывучэнні пэўнай тэмы (знакі прыпынку ў складаназалежным сказе, у бяззлучнікавым складаным сказе і г.д.).

Пунктуацыйны разбор можа праводзіцца па тэксце са знакамі прыпынку і без іх.

Поўны пунктуацыйны разбор праводзіцца ў наступным парадку: неабходна назваць сінтаксічную адзінку, у якой тлумачацца знакі прыпынку, граматычныя ўмовы пастаноўкі іх; назваць знак прыпынку, даць характарыстыку яго паводле ўжывання (адзіночны, паўторны, парны), функцыі (выдзяляльны, раздзяляльны), а затым сфармуляваць пунктуацыйнае правіла.

## Пытанні

1. Чым адрозніваюцца выдзяляльныя знакі прыпынку ад раздзяляльных?
2. У чым сутнасць раздзяляльна-выдзяляльных знакаў прыпынку?

## Узоры

*I. Ноч выдалася цёплая, ціхая, але лес, відаць, не спаў. (Я. М.)*

*У ВНУ*

1. Сказ апавядальны, у канцы яго стаіць кропка. Знак адзіночны, раздзяляльны.

2. Па структуры складаназлучаны сказ: складаецца з дзвюх частак (назваць), паміж імі стаіць коска. Знак адзіночны, раздзяляльны.

Правіла. Часткі складаназлучанага сказа раздзяляюцца коскамі.

3. Першая частка ўскладнена аднароднымі членамі (выказнікамі), паміж імі стаіць коска. Знак адзіночны, раздзяляльны.

Правіла. Паміж аднароднымі членамі, аб'яднанымі толькі інтанацыяй пералічэння, ставіцца коска.

4. Другая частка ўскладнена пабочным словам, якое выдзелена коскамі. Знак парны, выдзяляльны.

Правіла. Пабочныя словы ўсіх відаў і разрадаў выдзяляюцца коскамі.

*У школе*

1. Сказ апавядальны, у канцы яго ставіцца кропка.

2. Па будове сказ складаназлучаны, складаецца з двух простых сказаў (назваць), паміж імі стаіць коска.

Правіла. Паміж простымі сказамі ў складаназлучаным ставіцца коска.

3. У першым сказе ёсць аднародныя выказнікі, паміж імі стаіць коска.

Правіла. Аднародныя члены сказа, не звязаныя злучнікам, аддзяляюцца коскамі.

4. У другім сказе ёсць пабочнае слова, якое выдзелена коскамі.

Правіла. Пабочныя словы на пісьме выдзяляюцца коскамі.

*II. [1] Змоўклі птушкі — [2] з той часіны сумна стала навакол. (К-с)*

Па структуры сказ складаны бяззлучнікавы,

Па будове складаны бяззлучнікавы сказ, скла-

| | |
|---|---|
| складаецца з дзвюх частак (назваць), паміж імі стаіць працяжнік. Знак адзіночны, раздзяляльны. | даецца з двух сказаў (назваць), паміж імі стаіць працяжнік. |
| Правіла. Працяжнік ставіцца ў складаных бяззлучнікавых сказах з прычынна-выніковымі адносінамі паміж часткамі (2-я частка заключае вынік, 1-я — прычыну). | Правіла. Працяжнік ставіцца паміж простымі сказамі ў складаным бяззлучнікавым сказе, калі другі сказ выражае вынік таго, пра што гаворыцца ў першым сказе. |

*III. [1] З даўніх часоў кажуць: [2] праца спорыцца пры песні. (К. Б.)*

| | |
|---|---|
| Па структуры сказ складаны бяззлучнікавы, складаецца з дзвюх частак (назваць), паміж імі стаіць двукроп'е. Знак адзіночны, раздзяляльны. | Па будове складаны бяззлучнікавы сказ, складаецца з двух сказаў (назваць), паміж імі стаіць двукроп'е. |
| Правіла. Двукроп'е ставіцца ў складаных бяззлучнікавых сказах, другая частка якіх раскрывае канкрэтны змест таго, пра што гаворыцца ў першай частцы. | Правіла. Двукроп'е паміж простымі сказамі ў складаным бяззлучнікавым сказе ставіцца тады, калі другі сказ раскрывае сэнс першага сказа. |

**Практыкаванне 34**

Пастаўце знакі прыпынку, зрабіце поўны пунктуацыйны разбор сказаў.

Падрыўнікі выйшлі ў дарогу самым раннім досвіткам. Настрой ва ўсіх быў прыўзняты цяпер ад іх саміх залежала ці вярнуцца ў атрад з гонарам ці з сорамам. Шыбаеў у думках паставіў сабе адно ён не вернецца ў атрад пакуль не спусціць пад адхон варожы поезд.

Спачатку яны ішлі няезджанай зарослай травою лясной дарогай. Праз паўгадзіны хуткай хады яна вывела іх на пратораную дарогу і па ёй яны павярнулі проста на ўсход. У лесе панавала прыемная ранішняя свежасць і выразна чуліся настоеныя за ноч пахі хвойнай ігліцы і смалы. Прачнуўшыся з першым святлом на ўсе лады

шчоўкала звінела шчабятала радуючыся сонцу і цяплу лясное птаства.

Скончылася пушча і лес паступова пайшоў драбнейшы. Недзе паблізу дарогу па якой ішлі хлопцы павінна была перасекчы гравійная шаша і яны не жадаючы падыходзіць да яе адкрыта звярнулі ў густы алешнік. Мяркуючы па сонцу было яшчэ не пазней васьмі гадзін раніцы, калі яны падышлі да таго месца паміж Каранёўкай і Рудняй якое ім раіў камандзір. Мясцовасць тут была такая як ён і казаў няроўная уся на ўзгорках. Пахадзіўшы зводдаля ад чыгункі і выбраўшы месца партызаны скрытна падпаўзлі бліжэй да дарогі і заляглі ў густых альховых кустах. Хлопцы адразу ўбачылі двух вартавых аднаго па правы другога па левы бок якія павольна хадзілі па палатну ахоўваючы свае ўчасткі.

Удзень непрыкметна падкласці міну было бадай немагчыма і параіўшыся з сябрамі Шыбаеў наважыўся чакаць ночы а дзень прысвяціць назіранням за дарогай. Ён хацеў ведаць усё і як часта ходзяць цягнікі на захад і ўсход і калі змяняюцца вартавыя.

Ранкам наступнага дня цярплівасць партызан была нарэшце ўзнагароджана. З радасным заміраннем сэрца глядзелі яны як са скрыгатам і трэскам паляцеў з рэек паравоз а за ім наскокваючы адзін на аднаго і куляючыся на адхоне разбіваліся ў трэскі вагоны. Момант і ўсё было скончана.

*(Паводле У. Крайчанкі)*

# ЛІТАРАТУРА


Аналіз слова, словазлучэння, сказа: Вучэбна-метадычны дапаможнік / М. Ц. Кавалёва, К. М. Панюціч, П. У. Сцяцко і інш.; Пад рэд. Ф. М. Янкоўскага.— Мн., 1977.— 20 с.

**Андрэенка У. К., Яўневіч М. С.** Беларуская мова: Падручнік для 5—6 класаў васьмігадовай і сярэдняй школы.— 6-е выд.— Мн., 1983.— 312 с.

**Беларуская** граматыка: У 2 ч. / Пад рэд. М. В. Бірылы, П. П. Шубы.— Мн., 1985—1986.— Ч. 1.— 431 с.; Ч. 2.— 372 с.

**Бурак Л. І.** Сучасная беларуская мова.— 2-е выд.— Мн., 1985.— 319 с.

**Вараповіч З. Б.** Методыка выкладання беларускай мовы / Пад рэд. Л. М. Шакуна.— Мн., 1985.— 151 с.

**Виды** разбора на уроках русского языка: Пособие для учителя / В. В. Бабайцева, В. М. Шаталова, Г. К. Лидман-Орлова и др.— 2-е изд., перераб.— М., 1985.— 160 с.

**Кавалёва М. Ц., Падгайскі Л. П.** Беларуская мова.— Мн., 1982.— 272 с.

**Камароўскі Я. М.** Сучасная беларуская арфаграфія.— Мн., 1985.— 160 с.

**Клюсаў Г. Н., Юрэвіч А. Л.** Сучасная беларуская пунктуацыя.— 2-е выд., выпр. і дап.— Мн., 1972.— 280 с.

**Красней В. П.** Лексіка і фразеалогія беларускай мовы.— Мн., 1982.— 142 с.

**Лепешаў І. Я.** Лексічны аналіз слова // Нар. асвета.— 1980.— № 9.— С. 49—54.

**Ленешаў І. Я., Малажай Г. М., Панюціч К. М.** Практыкум па беларускай мове / Пад рэд. Ф. М. Янкоўскага.— Мн., 1980.— 301 с.

**Ляшчынская В. А.** Марфемны і словаўтваральны аналіз слова на ўроках беларускай мовы // Выкладанне беларускай мовы і літаратуры: Кн. для настаўніка.— Ми., 1983.— С. 46—57.

**Малажай Г. М.** Сучасная беларуская мова: Перыфраза / Пад рэд. Ф. М. Янкоўскага.— Мн., 1980.— 96 с.

**Піскун У. Ц.** Фанетычны разбор на ўроках беларускай мовы // Выкладанне беларускай мовы і літаратуры: Кн. для настаўніка.— Мн., 1983.— С. 20—27.

**Протчанка В. У.** Сінтаксічны аналіз простага сказа // Нар. асвета.— 1981.— № 4.— С. 56—59.

**Протчанка В. У.** Сінтаксічны аналіз складанага сказа // Нар. асвета.— 1982.— № 1.— С. 25—29.

**Садоўскі П. В.** Фанетычны разбор слова // Нар. асвета.— 1984.— № 9.— С. 46—48.

**Сучасная** беларуская літаратурная мова: Лексікалогія. Фанетыка. Арфаграфія.— 2-е выд., дапрац.— Мн., 1984.— 190 с.

**Сучасная** беларуская літаратурная мова: Марфалогія / Пад рэд. Ф. М. Янкоўскага.— 2-е выд., дапрац.— Мн., 1980.— 240 с.

**Сцяцко П. У.** Некаторыя пытанні марфемнай будовы слова // Нар. асвета.— 1981.— № 6.— С. 54—58.

**Сцяцко П. У.** Пытанні словаўтваральнага аналізу слова // Нар. асвета.— 1981.— № 7.— С. 65—67.

**Шакун Л. М.** Словаўтварэнне.— Мн., 1978.— 127 с.

**Яўневіч М. С., Андрэенка У. К.** Беларуская мова: Падручнік для 7—8 класаў васьмігадовай і сярэдняй школы.— 3-е выд.— Мн., 1984.— 287 с.

**Яўневіч М. С., Сцяцко П. У.** Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы.— 2-е выд., выпр. і дап.— Мн., 1980.— 304 с.

## УМОЎНЫЯ СКАРАЧЭННІ

*А. А.* — А. Алешка
*А. В.* — А. Васілевіч
*А. З.* — А. Зарыцкі
*А. К.* — А. Куляшоў
*Ал.* — А. Александровіч
*А. М.* — А. Марціновіч
*Ар.* — Л. Арабей
*А. С.* — А. Савіцкі
*Асіп.* — А. Асіпенка
*Астр.* — А. Астрэйка
*Б.* — Я. Брыль
*Багд.* — М. Багдановіч
*Бач.* — А. Бачыла
*Бр.* — П. Броўка
*Бяд.* — З. Бядуля
*Бял.* — А. Бялевіч
*В. А.* — В. Адамчык
*Вад.* — М. Ваданосаў
*В. Б.* — В. Быкаў
*В. В.* — В. Вольскі
*В. Г.* — В. Гігевіч
*Віт.* — В. Вітка
*В. К.* — В. Карамазаў
*В. П.* — В. Палтаран
*Вял.* — А. Вялюгін
*Гал.* — П. Галавач
*Гіл.* — Н. Гілевіч
*Гл.* — П. Глебка
*Гр.* — І. Грамовіч
*Грах.* — С. Грахоўскі
*Гур.* — І. Гурскі
*Дал.* — Г. Далідовіч
*Дам.* — У. Дамашэвіч
*Ж.* — А. Жук
*Зв.* — А. Звонак
*І. Д.* — І. Дуброўскі
*І. Н.* — І. Навуменка
*І. Ш.* — І. Шуцько
*Каратк.* — У. Караткевіч
*Карп.* — А. Карпюк
*К. Б.* — К. Буйло
*Кір.* — К. Кірэенка
*Корб.* — У. Корбан
*Кр.* — У. Краўчанка
*Крап.* — К. Крапіва
*К-с* — Я. Колас
*Кудр.* — А. Кудравец
*Кузьм.* — У. Кузьмянкоў
*Кул.* — А. Кулакоўскі
*Куп.* — Я. Купала
*К. Ч.* — К. Чорны
*Луж.* — М. Лужанін
*Лупс.* — М. Лупсякоў
*Лыньк.* — М. Лынькоў
*Мал.* — «Маладосць»
*Маш.* — М. Машара
*М. Г.* — М. Гамолка
*Мел.* — І. Мележ
*М. З.* — М. Засім
*Мік.* — Б. Мікуліч
*М. Л.* — М. Лобан
*М. Н.* — М. Нікановіч
*М. Т.* — М. Танк
*Мяж.* — У. Мяжэвіч
*Н.* — І. Новікаў
*Нар. тв.* — Народная творчасць
*Нях.* — Р. Няхай
*Пальч.* — А. Пальчэўскі
*Панч.* — П. Панчанка
*Пар.* — М. Парахневіч
*Пестр.* — П. Пестрак
*П. К.* — П. Кавалёў
*Пр.* — П. Прыходзька
*Прык.* — Прыказка
*Пташн.* — І. Пташнікаў
*Р.* — А. Русак
*Ракіт.* — М. Ракітны
*Р. Б.* — Р. Барадулін
*Рыл.* — А. Рылько
*Саб.* — Р. Сабаленка
*Сам.* — Э. Самуйлёнак
*Сач.* — Б. Сачанка
*Сіп.* — Я. Сіпакоў
*Скр.* — Я. Скрыган
*Стр.* — М. Стральцоў
*Тк.* — М. Ткачоў
*Тр.* — П. Трус
*У. К.* — У. Карпаў
*У. М.* — У. Мехаў
*Хадк.* — Т. Хадкевіч
*Хвед.* — М. Хведаровіч
*Хомч.* — В. Хомчанка
*Ц.* — Цётка
*Чарн.* — А. Чарнышэвіч
*Чыгр.* — І. Чыгрынаў
*Шам.* — І. Шамякін
*Шушк.* — С. Шушкевіч
*Шым.* — В. Шымук
*Я. В.* — Я. Васілёнак
*Як.* — А. Якімовіч
*Я. М.* — Я. Маўр
*Янішч.* — Я. Янішчыц
*Янч.* — М. Янчанка
*Янк.* — Ф. Янкоўскі
*Я. П.* — Я. Пушча

# ЗМЕСТ


Прадмова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Фанетычны разбор . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
Графічны разбор . . . . . . . . . . . . . . . . . 9
Арфаграфічны разбор . . . . . . . . . . . . . . . 11
Лексічны разбор слова . . . . . . . . . . . . . . 14
Разбор фразеалагізмаў . . . . . . . . . . . . . . 18
Марфемны разбор . . . . . . . . . . . . . . . . . 20
Словаўтваральны разбор . . . . . . . . . . . . . 24
Марфалагічны разбор . . . . . . . . . . . . . . . 27

Назоўнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
Прыметнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31
Лічэбнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 34
Займеннік . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36
Дзеяслоў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38
Інфінітыў . . . . . . . . . . . . . . . . . . 42
Дзеепрыметнік . . . . . . . . . . . . . . . . 44
Дзеепрыслоўе . . . . . . . . . . . . . . . . . 46
Прыслоўе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48
Безасабова-прэдыкатыўныя словы . . . . . . . . 50
Прыназоўнік . . . . . . . . . . . . . . . . . 52
Злучнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54
Часціцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56
Мадальныя словы . . . . . . . . . . . . . . . 58
Выклічнікі . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59

Сінтаксічны разбор . . . . . . . . . . . . . . . 61

Словазлучэнне . . . . . . . . . . . . . . . . 61
Просты сказ . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
Аднасастаўны сказ . . . . . . . . . . . . . 74
Члены сказа . . . . . . . . . . . . . . . . 77
Складаны сказ . . . . . . . . . . . . . . . . 87
Складаназлучаны сказ . . . . . . . . . . . . 88
Складаназалежны сказ . . . . . . . . . . . . 93
Бяззлучнікавы складаны сказ . . . . . . . . . 106
Камбінаваны складаны сказ (з рознымі відамі сувязі) . . 111
Сказ з простай мовай . . . . . . . . . . . . . 116

Пунктуацыйны разбор . . . . . . . . . . . . . . . 119
Літаратура . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 124
Умоўныя скарачэнні . . . . . . . . . . . . . . . 126

Учебное издание

Кечик Софья Яковлевна
Роговцов Василий Иванович

ЯЗЫКОВОЙ РАЗБОР В ВУЗЕ И ШКОЛЕ

Схемы, образцы, задания

*На белорусском языке*

Издательство «Вышэйшая школа»

Вучэбнае выданне

Кечык Соф'я Якаўлеўна
Рагаўцоў Васілій Іванавіч

МОЎНЫ РАЗБОР У ВНУ І ШКОЛЕ

Схемы, узоры, заданні

Заг. рэдакцыі К. М. Смірнова
Рэдактар В. І. Аверкіна
Вокладка М. С. Волкава
Маст. рэдактар У. І. Шолк
Тэхн. рэдактар Г. М. Раманчук
Карэктар Л. А. Шлыковіч

ІБ № 2546

Здадзена ў набор 08.04.87. Падпісана да друку 24.09.87. Фармат 84×108$^{1}/_{32}$. Папера друк. № 1. Гарнітура літаратурная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 6,72. Ум. фарбаадб. 0,93. Ул.-выд. арк. 6,14. Тыраж 6000 экз. Зак. 301. Цана 25 к.

Выдавецтва «Вышэйшая школа» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220048. Мінск, пр. Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА ім. Я. Коласа. 220005. Мінск, вул. Чырвоная, 23.

ЗАЎВАЖАНЫЯ ПАМЫЛКІ

| Старонка | Радок | Надрукавана | Трэба чытаць |
|---|---|---|---|
| 11 | 2 зверху | гук [ч] | гук [ч] |
| 28 | 9 зверху | *пішу — пішам* | *пішу — пішаш* |
| 82 | правы слупок, 7 зверху | дадатныя | дадаиыя |